Прыкладам, які дэманструе прыярытэты ў размеркаванні фінансавых сродкаў кіраўніцтвам БНР, можна разглядаць акт ад 28 лютага 1920 г., падпісаны старшынёй Рады Народных Міністраў Антонам Луцкевічам і паслом БНР ва Украіне А. Цвікевічам. Змест акту — абавязкі па выкрыстанні крэдыту Нямецкага Імперскага Банка ў Берліне на суму 3 млн. нямецкіх марак. З агульнай колькасці грошай, якія бачылася магчымым выдаткаваць, 800 тыс. марак накіроўвалася на ўтрыманне беларускіх місій у краінах Еўропы (у тым ліку ва Украіне, дзе, як вядома, жылі тысячы беларускіх мігрантаў). 200 тыс. марак размяркоўваліся паміж чатырма палітычнымі партыямі. 500 тысяч марак перадавалася Беларускаму выдавецкаму таварыству ў Вільні на друк кніг і гэтыя грошы перадаваліся Вацлаву Іваноўскаму. 1 млн. 150 тыс. павінна было быць атрымана старшынёй Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску Аляксандрам Прушынскім і 100 тыс. марак выдаткоўвалася на дапамогу членам Рады БНР на рукі С. Рак-Міхайлоўскаму[36]. Ускосна грошы, накіраваныя для беларускай місіі Украіны ці Часоваму Беларускаму нацыянальнаму камітэту маглі быць выдаткаваны на патрэбы беларускіх бежанцаў, якія вярталіся дадому. Аднак прамой згадкі ў акце на планаванне такіх выдаткаў няма. Гэта пацвярджае разгорнуты каштарыс запланаваных месячных выдаткаў Міністэрства ўнутраных спраў БНР на чэрвень (ліпень?) 1920 г. Дзесяццю артыкуламі фінансавання з'яўляюцца: „Утрыманне Камісарыяту", „Пенсіі кіраўніцтву агітацыйнага аддзелу", „На выдавецтвы газетаў", „На выданне сельска-гаспадарча-кааператыўнага штомесячніка", „На Агітацыйны аддзел", „На вучыцельскія курсы", „На тэатральныя справы", „Дапамога вучыцельскаму саюзу", „Інстр. па кааперыцыі", „На закупкі кніжак для бібліятэк". З 73 200 марак каштарысу грошы на кааперацыю і вучыцельскія курсы, якія па-свойму маглі быць атрыманы непасрэдна беларусамі, якія вярнуліся ў выніку рээвакуацыі і спрабавалі пачынаць новае жыццё на радзіме, складалі 3000 марак (4%)[37]. Прыкладам такога выкарыстання грошай могуць выступаць абвешчаныя з 20 кастрычніка 1919 г. Бела-

[35] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 77.
[36] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 37, арк. 40-40 адв.
[37] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 40, арк. 9.

рускай школьнай радай Міншчыны чатырохтыднёвыя настаўніцкія курсы беларускай мовы і беларусазнаўства. Курсы для іх слухачоў былі бясплатныя з бясплатным начлегам (хаця з уласнымі пасцельнымі прыналежнасцямі) і „бясплатнай альбо вельмі таннай сталоўняй”[38].

Для высвятлення сапраўдных магчымасцей лідараў БНР у міграцыйнай палітыцы неабходна найперш адзначыць тыя эканамічныя рычагі і рэсурсы, якімі яны валодалі. Абвяшчэнне дзейнасці беларускіх бежанскіх камітэтаў у Мінску і ў рэгіёнах, у тым ліку і за межамі Беларусі, магло мець плён пры наяўнасці матэрыяльнай базы. Ужо ў Мінску, такая база практычна адсутнічала. Аб гэтым прама кажа народны сакратар апекі БНР П. Бадунова ў сваім звароце ад 18 красавіка 1918 г. да кіраўніцтва Мінскай губернскай управы[39]. Гэта пацвярджае адказ на яе ліст ад кіраўніцтва Камісіі па апецы Мінскай губернскай управы, дзе ідзе гаворка толькі пра адзіную адкрытую сталовую для бежанцаў усіх нацыянальнасцей (пра аналагічную беларускую гаворка ўвогуле не ідзе)[40].

Тыя матэрыяльныя сродкі, якімі распараджалася кіраўніцтва БНР, размяркоўвалася ў адпаведнасці з палітычнымі прыярытэтамі. Магчыма, гэтым можна тлумачыць патрэбу прызначэння асобнаўпаўважанага і кантралёра па бежанскіх справах і ўвядзенне такой пасады ў склад Народнага Сакратарыята БНР, на чым настойваў В. Гадлеўскі 12 мая 1918 г. на пасяджэнні бежанскай камісіі БНР[41].

У хуткім часе для таго, каб „паставіць на цвёрдыя ногі бежанскую справу”, як падкрэслівалася ў пастанове Народнага Сакратарыята БНР ад 6 чэрвеня 1918 г., было вырашана правесці бежанскую калегію ў пашыраным складзе з удзелам Івана Серады, Васіля Захаркі і Эдуарда Будзькі. П. Бадунова і кс. В. Гадлеўскі ў ажыццяўленні бежанскай палітыкі ацэньваліся кіраўніцтвам БНР, як „амаль не нічога не зрабіўшыя і адмовіўшыеся ад гэтай справы”[42]. Такая катэгарычная ацэнка патрабуе пацвярджэння. У пэўнай ступені з ёй можна пагадзіцца, калі звярнуцца да зместу справаздачы асобнаўпаўнаважанага і кантралёра П. Барташа, які 8 мая правёў праверку стану складоў Беларускага бежанскага камітэта, дзе заўважыў раскраданне і распродаж маёмасці (адзення, абутку, посуду), якая прызначалася для за-

38 Там жа, арк. 34.
39 ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 24, арк. 14-14 адв.
40 Там жа, арк. 95.
41 Там жа, арк. 60.
42 ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 79, арк. 101-101 адв.

беспячэння бежанцаў. Захоплены падчас гэтага злачынства старшыня аддзела Бежанскай камісіі Рады БНР у Оршы Падбярэзскі не мог растлумачыць таго, што адбывалася, а скупшчыкі-габрэі на вачах П. Барташа гаспадарылі ва ўсім складзе, гандлюючы маёмасцю з нямецкімі салдатамі (толькі дзіцячых паліто было распрадана каля 10 000 штук!)[43]. Такое бязладдзе безумоўна ставіць пад сумненне наяўнасць належнага кантролю з боку кіраўніцтва БНР за працэсам назапашвання і размеркавання той маёмасці, якая так патрэбна была бежанцам і валоданне якой было адным з галоўных матэрыяльных рэсурсаў беларускіх, як і ўсялякіх іншых, бежанскіх арганізацый.

Аднак, нягледзячы на розную ступень актыўнасці, магчымасці рэальнай дапамогі вымушаным мігрантам залежалі ў вялікай ступені ад агульнага становішча ў краіне. Прыкладам гэтаму можа служыць сітуацыя, калі з прычыны пагаршэння такога становішча, нягледзячы на тое, што Бежанскім дэпартаментам былі арганізаваны пункты харчавання ў сямі раёнах, ахапіўшыя агульнай колькасцю 27 населеных пунктаў, у тым ліку беларускія — Гомель, Лунінец і Калінкавічы, пастановай Краёвай нарады ў Кіеве, зацверджанай тым жа Бежанскім дэпартаментам ад 2 ліпеня 1918 г., была спынена выдача грошай на харчаванне і кватэры[44]. Такая залежнасць ад разнастайных уладных структур, ці то ў Мінску, ці то ў Кіеве, ці то ў Вільні, кожны раз уздымала пытанне, у тым ліку на старонках тагачаснай беларускай прэсы, далейшай і яшчэ большай самаарганізацыі бежанцаў-беларусў у накірунку ажыццяўлення рээвакуацыі. „Выйсце — у арганізаванасці і нацыянальна-грамадскай згуртаванасці, — пісалі ў перадавіцы „Беларускага эха” ў канцы лета 1918 г. — Неабходна паўсюль пашырыць, заснаваць, а дзе дасюль не было, хутчэй стварыць беларускія бежанскія арганізацыі на месцах, беларускія таварыствы ўзаемадапамогі, беларускія біржы працы, працоўныя арцелі, беларускі кааператыў, вытворчыя і спажывецкія таварыствы (...) і іншыя прадпрыемствы, дзе даваць работу сваім беларусам (...). У нас, беларусаў, ёсць адная якасць нацыянальная (...) — наша працавітасць і працаздольнасць і тыя перавагі, якія дае нам наша старая заходняя культура. Адзінага, чаго ў нас не дастае — арганізаванасці”[45]. Становішча фактычнага неіснавання бежанскіх беларускіх арганізацый (адзінкавыя беларускія таварыствы не вырашалі праблемы) стала адным з фактараў, які

43 Там жа, арк. 116-116 адв.
44 *На беларускім шляху*, «Беларускі шлях», 1918, № 95, с. 2.
45 Кий, *Неотложное дело*, «Белорусское эхо», 1918, № 7, с. 1-2.

істотна ўскладняў стасункі лідараў БНР з рэгіёнамі Расіі, дзе жылі тысячы бежанцаў-беларусаў.

Як прыклад практычнай дзейнасці ў ажыццяўленні ўласнай міграцыйнай палітыкі можна згадаць інспекцыйныя камандзіроўкі супрацоўнікаў Камісіі па бежанскіх справах Рады БНР, якія накіроўваліся па ўсіх вузлавых, перасадачных гарадах Беларусі, дзе назіралася істотная канцэнтрацыя бежанцаў: Полацк, Маладзечна, Баранавічы, Бабруйск. Мэтай паездак была ацэнка становішча для прыняцця мер па паскарэнні адпраўкі бежанцаў дадому[46]. Для азнаямлення з сапраўдным становішчам для прыняцца адпаведных мер, напрыклад, у Оршу 18 верасня 1918 г. Народным Сакратарыятам БНР накіроўваўся ці не самы аўтарытэтны тагачасны беларускі палітык Іван Луцкевіч[47].

Па-свойму гэты факт сведчыць і пра наяўнасць кадравай праблемы ў ажыццяўленні бежанскай палітыкі. У пэўнай ступені крыніцаю новых кадраў становяцца тыя ж бежанцы-беларусы, якія праяўлялі сацыяльную і палітычную актыўнасць, падмацаваную бежанскім досведам. Менавіта такім жыццёвым вопытам аргументуе сваё імкненне ўключыцца ў адміністратыўную працу ў структурах БНР селянін Жухоўскай воласці Навагрудскага павета У. І. Грэмякоў у сваім прашэнні ад 28 чэрвеня 1918 г. да Народнага Сакратарыята БНР, жадаючы па вяртанні з бежанства заняць пасаду дарадцы пры павятовым нямецкім каменданце ў родным мястэчку Мір. Дзякуючы актыўнасці ў бежанскім грамадскім руху, па словах самога У. Грэмякова, ён „добра вывучыў побыт і н航равы сялян і дакладна пачаў разумець усе іх патрэбы і пажаданні, як у сялянскім асяродку, так і ў культурнаасветніцкім жыцці, дзе за час сваёй службы (...) з’яўляўся (...) іх першым дарадцам і памагатым”[48]. Архіўныя крыніцы Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва ў Вільні (фонд 582) змяшчаюць прашэнні бежанцаў-беларусаў, якія звярталіся да Народнага Сакратарыята БНР у пошуках працы, нагадваючы пра свой вопыт працы ў розных грамадскіх арганізацыя падчас вымушанай міграцыі[49]. У гэтых дакументах звяртае на сабе ўвагу аргументацыя жадання працы, дзе побач з пошукам сродкаў існавання змешчаны словы пра імкненне да „жывой працы, якая патрабавала б сапраўдных стасункаў з народам”, пра жаданне „пайсці ў народ, каб развіваць у ім нацыяналь-

[46] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 79, арк. 138-138 адв.
[47] Там жа, арк. 149.
[48] Там жа, арк. 52.
[49] Там жа, арк. 4, 52, 100, 106.

ныя інтарэсы, любоў да сваёй самабытнасці, бліжэй пазнаёміцца з ім (народам)”, добра авалодаць беларускай мовай, што было зразумелай умоваю для ўладкавання ў структуры БНР[50].

Увесь час сярод задач узаемадзеяння з бежанцамі стаіць задача іх палітычнай асветы і агучваюцца адпаведныя ініцыятывы асветніцтва[51].

Арганізацыя вяртання бежанцаў была звязана ў прыватнасці таксама са стасункамі з упаўнаважанымі БНР, а таксама бежанскімі прадстаўнікамі па розных рэгіёнах былой імперыі. Паколькі пасля абвяшчэння БНР яе кіраўніцтва імкнецца вызначыць сябе чарговым адміністратыўным цэнтрам, да яго звярталіся бежанцы з розных частак Расіі, з аднымі і тымі ж пытаннямі аб дапамозе вяртанню. Адной з распаўсюджаных форм такіх зваротаў быў прыезд у Мінск прадстаўнікоў бежанскіх грамад, якія прывозілі падрыхтаваныя спісы пытанняў і патрабаванняў[52]. Яшчэ большым быў струмень паштовых пасланняў. Змест гэтых зваротаў сведчыў з аднаго боку аб рознай ступені дасведчанасці бежанцаў пра палітычную сітуацыю ў краіне і беларускіх землях у прыватнасці, аб хутка змяняючыхся ўмовах перамяшчэння бежанцаў цераз прапускныя пункты немцаў, а таксама пра тое кола паўнамоцтваў, якое чакалі бачыць у прадстаўнікоў новай абвешчанай беларускай улады[53]. Так, дэлегат ад бежанцаў-беларусаў Стаўрапольскай губерні А. І. Валькові́ч цікавіўся ў старшыні Беларускай рады бежанцаў у Мінску пра становішча з „бежанскім пытаннем” у беларускіх губернях, а таксама прасіў прызначыць для Паўночнага Каўказа ў г. Стаўрапаль упаўнаважанага для дапамогі падрыхтоўкі бежанцаў на радзіму (а такіх у дадзенай губерні налічвалася на той момант каля 40 тыс. чалавек). А. І. Валькові́ч і будзе ім прызначаны пастановаю Народнага Сакратарыята БНР ад 6 жніўня 1918 г., бо адсутнасць упаўнаважанага не толькі істотна замінала вырашэнню ўсіх арганізацыйных пытанняў па знаходжанні і рээвакуацыі беларускіх бежанцаў, але і вяла да пэўнага расколу сярод іх. Апошняе наступства было абумоўлена палітыкай Польскага консульства, якое гатова было ў гэты самы час выдаваць пашпарты і бежанскія пасведчанні, але толькі беларусам каталіцкага веравызнання, да таго ж запісваць у названых дакументах аб тым, што рээвакуяваныя беларусы з’яўляюцца грамадзянамі польскай дзяржавы[54].

[50] Там жа, арк. 100.
[51] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 954, арк. 29-30.
[52] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 24, арк. 119-119 адв.
[53] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 2, арк. 47-47 адв.
[54] *Белорусы на Сев. Кавказе*, «Белорусское эхо», 1918, № 8, с. 5.

Таксама А. І. Валькович прасіў грошы для непасрэднай дапамогі бежанцам у іх вяртанні (Народны Сакратарыят прапанаваў Мітрафану Доўнар-Запольскаму і Паўлу Трэмповічу выдаць А. І. Вальковічу 3000 рублёў) і прапаноўваў узаконіць дзейнасць стаўрапольскай беларускай бежанскай арганізацыі і яе права выдачы пашпартоў бежанцам-беларусам[55]. Беларускі камітэт дапамогі бежанцам-беларусам у Сімферопалі звяртаецца 24 жніўня 1919 г. да Беларускай Рады ў Гродне з паведамленнем аб зваротным руху ў бок Гродзеншчыны 1400 мігрантаў і настойлівай прапановай да ўрада БНР больш актыўна арганізоўваць вяртанне бежанцаў, робячы гэта пры садзейнічанні замежных урадаў[56]. Апошняе было вельмі праблематычным. Народны Сакратарыят яшчэ ў канцы красавіка 1918 г. звяртаўся да Віленскага Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, каб тыя, у сваю чаргу паспрыялі перад нямецкай уладай найхутчэйшаму вяртанню бежанцаў-беларусаў[57]. У адказ на такі зварот кіраўнікі Віленскага Таварыства ў сваім лісце ад 13 мая толькі пацвердзілі вядомыя ўмовы нямецкіх улад, якія не былі супраць вяртання маёмасных катэгорый рэпатрыянтаў і адзначылі сваю суцэльную матэрыяльную бездапаможнасць, заахвоціўшы сваіх мінскіх паплечнікаў прыспешыцца ў падрыхтоўцы спісаў хаця б тых заможных бежанцаў, якіх гатовыя былі прапусціць немцы[58]. Таму ў вырашэнні праблемы ўзгаднення кіраўніцтвам БНР з германскімі ўладамі праезду бежанцаў беларускія палітыкі былі ў ролі тых, хто вымушаны быў радавацца кожнаму кроку ім насустрач. Таму нават агульныя абяцанні начальніка штаба Галоўнакамандуючага (АОК 10) Макса фон Штапфа, якія той даў Я. Варонку 21 чэрвеня 1918 г. аб большай палёгцы ў бліжэйшы час у справе ўрэгулявання вяртання бежанцаў, падаваліся як палітычны поспех[59]. У імкненні да большай каардынацыі зваротнага руху бежанцаў 26 кастрычніка 1918 г. была прынята пастанова Народнага Сакратарыята БНР аб утварэнні Беларускай бежанскай камісіі пры Нямецкім консульстве ў Маскве і камандзіраванні туды Вацлава Вэбера[60]. Адначасова

[55] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. зах. 10, арк. 92; *Ліст Народнага Сакратарыяту БНР старшыні Беларускай Гандлёвай Палаты М. Доўнар-Запольскаму і консулу БНР на Ўкраіне Паўлу Трэмповічу за 08.08.1918*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 232; ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 94, арк. 33.

[56] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 46, арк. 1.

[57] *Ліст Народнага Сакратара БНР Віленскаму Таварыству Дапамогі Пацярпелым ад вайны за 12.04.1918*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 93.

[58] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 20, арк. 16-16 адв.

[59] *Хроніка для газет. Менск*, 21.06.1918, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 184.

[60] *Ліст Народнага Сакратарыяту БНР Бежанскай Камісіі пры Радзе БНР за 29.10.1918*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 288.

2 лістапада 1918 г. ад Надзвычайнай дэлегацыі Рады БНР была накіравана прапанова міністру ўнутраных спраў Украіны Фёдару Лізагубу дапамагчы беларускім бежанскім камітэтам на Украіне[61]. Пошук дапамогі вёўся беларускімі палітыкамі паўсюль, але плён гэтых пошукаў быў невялікі. Архіўныя дакументы хаця і сведчаць пра выдачу пасведчанняў ад імя Народнага Сакратарыята БНР бежанцам з беларускіх губерняў, аднак для таго, каб трапіць бежанцам на родныя землі, адных дакументаў было недастаткова[62]. А на комплекс іншых мерапрыемстваў па падтрымцы вымушаных мігрантаў ва ўрадах БНР не хапала ані сродкаў, ані палітычных магчымасцей.

Часам грашовыя сродкі выдавалі бежанскім хадакам, але менш чым прасілася. П. Карэнецкі, прыехаўшы ад імя 40 тысяч калужскіх бежанцаў-беларусаў, замест трох тысяч рублёў атрымаў толькі тысячу[63]. Крыніцы фінансавых сродкаў БНР былі розныя: ахвяраванні, гандлёвыя дамовы, арэнда, банкаўскія пазыкі[64]. Пэўныя фінансавыя сродкі кіраўнікі БНР атрымлівалі ад Мінскай гарадской думы[65]. Пра нязначнасць матэрыяльных сродкаў, іх недахоп і заклікі да ашчаднасці выкарыстання грошай існуе шмат згадак у розных дакументах БНР. Напрыклад, паводле пратакола № 106 ад 7 снежня 1918 г. Рады Народных Міністраў БНР у касе Рады заставалася чатыры з паловай тысячы марак[66]. Аднак, яшчэ на 1 ліпеня гэтага года згодна з данымі справаздачы касы Народнага Сакратарыята на прыбытак было залічана 132 899 рублёў 51 капейка. Артыкулы на выдаткі па вырашэнні бежанскіх праблем у справаздачы размеркавання гэтых сродкаў за перыяд з 30 сакавіка да 1 ліпеня 1918 г. адсутнічаюць[67]. Безумоўна, ускосна выдаткі шэрагу іншых артыкулаў можна залічыць на карысць вымушаных мігрантаў (асвета, перыядычны друк, камандзіровачныя расходы), але прамых накірункаў грошай на фінансавую падтрымку бежанскіх арганізацый у справаздачы за тры месяцы мы

[61] *Ліст Надзвычайнай Дэлегацыі Рады БНР (Кіеў) міністру ўнутранніх спраў Украіны Ф. Лізагбу*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 289.

[62] *Пасведчанні ў тым, што ён грамадзянін-беларус.. і мае патрэбу выехаць...*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 101, 106, 185, 186, 187, 236.

[63] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 24, арк. 125-125 адв.

[64] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 97, арк. 3.

[65] *Пасведчанне Канцэлярыі Народнага Сакратарыята скарбніку Народнага Сакратарыяту Васілю Захарку за 19.04.1918 на атрыманне грошаў Беларускага Бежанскага Камітэту ад нямецкіх уладаў і асігнаваныя Гарадской Думай грошы з касы Гарадской управы*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 107.

[66] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 1, арк. 1.

[67] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 97, арк. 3-4.

ў фінансавых дакументах Народнага Камісарыята БНР не бачым. Напэўна гэта не азначае, што такіх выдаткаў не было ўвогуле. Са справаздачы аб выдатках грашовых сум Дзяржаўнага Скарбу БНР, якія знаходзіліся ў распараджэнні народнага міністра Аркадзя Смоліча за 16 снежня 1918 г. можна заўважыць, што з агульнай сумы ў 282 607 нямецкіх марак, 71 174 польскіх марак, 2959 рублёў царскіх, 20 000 рублёў думскіх і 19 000 рублёў керанскіх субсідыя Цэнтральнай беларускай радзе Віленшчыны і Гродзеншчыны склала 18 000 нямецкіх марак, урадаваму віленскаму камісару на ўтрыманне беларускіх прытулкаў — 5000 нямецкіх марак[68]. Акрамя таго 50 000 рублёў было запланавана на функцыянаванне Мінскага настаўніцкага інстытута пасля яго вяртання з Яраслаўля, 1000 руб. — Калужскаму аддзелу беларускай грамады, 100 руб. — Козічу на арганізацыю дзейнасці бежанскай камісіі, 1000 руб. — на харчаванне дзяцей працоўнай калоніі, 1000 руб. — на харчаванне дзяцей мінскага прытулку[69]. Гэтыя ж лічбы знаходзяць пацвярджэнне і ў „Ведамасці крэдытаў асігнаваных па пастановах Народнага Сакратарыята за час з 23 траўня 1918 року па 23 ліпеня" і ў „Спісе авансаў з 30 сакавіка па 23 ліпеня 1918 года"[70]. Асобна згадваецца факт аплаты па рашэнні Народнага Сакратарыята БНР за 7 чэрвеня 1918 г. працы па бежанскіх справах У. І. Грэмякову ў суме 75 рублёў[71]. Ускосна выдаткамі на бежанскую справу, а менавіта асвету мігрантаў з беларускіх губерняў, можна разглядаць фінансавую падтрымку кіеўскай газеты „Белорусское эхо", якая актыўна друкавала матэрыялы і звесткі пра беларускіх бежанцаў. У ліпені 1918 г. ёй была пералічана 5000 рублёў ад Народнага Сакратарыята[72]. Вядома, што ў жніўні 1918 г. грошы — 500 руб. (уздагон папярэдніх пяцісот рублёў з агульнай запланаванай на гэты артыкул выдаткаў у памеры 2900 рублёў) пералічваліся на ўтрыманне Беларускай бежанскай камісіі ў Оршы[73]. Аднак, каб зразумець надзвычай невялікі памер гэтых пералічаных выдаткаў, згадаем, што месячны каштарыс толькі аднаго беларускага дзіцячага прытулку ў Мінску на 40 чалавек 18 чэрвеня 1918 г. складаў 2675 рублёў[74].

[68] Там жа, арк. 25, 27, 31.
[69] Там жа, арк. 16-17 адв.
[70] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 98, арк. 184-184 адв, 186.
[71] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 94, арк. 10.
[72] Там жа, арк. 28.
[73] Там жа, арк. 31.
[74] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 93, арк. 10-11.

Кажучы пра фінансавую дапамогу з боку БНР бежанцам-беларусам, на наш погляд, трэба ўключаць сюды і фінансаванне Беларускай вучыцельскай рады Гродзеншчыны, бо большасць яе сябраў былі тымі, хто вярнуўся ў ходзе рээвакуацыі і настаўніцкай працай, ва ўмовах суцэльнага разбурэння і новай улады спрабаваў зарабляць сабе на жыццё. Паводле каштарыса за студзень-люты-сакавік 1920 г. заробак дваццаці настаўнікаў, іх кватэрныя, пенсіі вучашчымся і дапамога новаадчыненым школам склала 93 700 марак[75]. Адзначым, што сярод артыкулаў каштарыса асобна пазначаны аванс Настаўніцкаму саюзу, асігнаваны Міністрам унутраных спраў Кузьмой Цярэшчанкам на першым з’ездзе настаўнікаў Гродзеншчыны ў памеры 10 000 марак[76].

Падтрымка беларускага школьніцтва з’яўлялася адным з прыярытэтных кірункаў палітыкі БНР. Ва ўмовах відавочнага росту нацыянальнай самасвядомасці бежанцаў-беларусаў, які быў абумоўлены рознымі фактарамі, імкненне жыхароў беларускіх паветаў да адкрыцця ў вёсках і мястэчках беларускіх школ і пачатку навучальнага працэсу выглядае лагічным крокам. І такое імкненне мае адлюстраванне ў чарадзе прашэнняў жніўня-кастрычніка 1919 г., па большасці да Гродзенскага павятовага школьнага інспектара, радзей — у Цэнтральную настаўніцкую раду Гродзеншчыны ад імя беларускіх сялян вёсак Якубовічы Берштанскай воласці, Верцялішкі Гродзенскага павета, мястэчка Крынкі Гродзенскага павета, в. Бубны Скідзельскай воласці, в. Стрэльчыцы Скідзельскай воласці, в. Лаша Лашанскай воласці, в. Грабавец Малешаўскай воласці Бельскага павета, вв. Грыневічы, Дзямідаўцы, Міхайлы, Боркі, Каменка, Малая Лапеніца Ваўкавыскага павета, в. Белякоўшчына Скідзельскай воласці, в. Гольні Мала-Бераставіцкай воласці, в. Магіляны Індурскай воласці, в. Канюхі Індурскай воласці, вв. Жыдамля і Завадзічы Жыдамлянскай воласці Гродзенскага павета, вв. Вароны, Каленікі, Леановічы, Трумны (?) Масалянскай воласці, в. Курпікі Жыдамлянскай воласці, м. Вялікая Бераставіца, в. Краснае Сяло Роскай воласці Ваўкавыскага павета, в. Каленікі Лашанскай воласці[77]. Таму, безумоўна, фінансавыя выдаткі, накіраваныя на развіццё беларускага школьніцтва, можна разглядаць як падтрымку тых, хто вярнуўся з бежанства, на падтрымку іх, цяпер больш заўважнай, нацыянальнай свядомасці.

[75] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 884, арк. 23.
[76] Там жа, арк. 23.
[77] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 46, арк. 34, 35-35 адв, 36, 38, 39, 40, 41, 42, 43, 44, 45-45 адв, 46, 47, 48, 50-50 адв., 52-52 адв., 53-53 адв.

Калі казаць пра кірункі выкарыстання фінансавых сродкаў у падтрымцы бежанцаў-беларусаў, неабходна мець на ўвазе, што падчас прысутнасці ўрада БНР у Гродне пытанне дапамогі бежанцам, якія вярталіся з расійскіх губерняў, стала адным з напрамкаў практычных штодзённых турбот. Вынікам паслядоўнага ўздыму „беларускага пытання” лідарамі БНР можна лічыць фінансавую падтрымку з боку Міністэрства беларускіх спраў Літоўскага ўрада Камітэта па бежанскіх справах, які вясной 1919 г. знаходзіўся ў Гродне (вул. Сафійская, 3), і прымаў штодня ад 350 да 400 наведвальнікаў з ліку прыбылых у выніку рээвакуацыі бежанцаў. Калі ўлічыць, што на аднаго чалавека ў дзень, які звяртаўся за дапамогаю, разлік харчавання складаў 3 маркі 50 пфенігаў (на якія прапаноўваліся гарбата, кава без цукру, абед з адной стравы і 1 фунт хлеба), то для задавольвання 400 чалавек штодзень патрабавалася 1400 марак. Таму грошы, якія атрымлівалі аднаразова беларускія актывісты ў Гродне ў памерах 3000 і 2000 марак, былі мізэрнымі і рабілі магчымасці дапамогі бежанцам мінімальнымі. Але і такое фінансаванне было не рэгулярным, а надзеі на зацвярджэнне каштарысаў штомесячных выдаткаў Літоўскім урадам былі не гарантавыныя[78]. Больш верагоднымі былі паступленні ад ахвяраванняў і продажу білетаў на вечарыны і розныя іншыя атракцыі для насельніцтва. Грошы былі патрэбны для арганізацыі самых простых прытулкаў для рэпатрыянтаў, якія вярталіся не маючы амаль нічога, „часта зусім галодныя”, для падтрымкі тым, хто „вярнуўся і варочаецца яшчэ з Расіі”, доля іх, па словах Я. Натусевіча ў кастрычніку 1919 г., „незайздросная: б’юцца як рыба аб лёд, а карысці няма, бо няма чым часта абрабіць палі і няма чым засеяць. Калі хто і мае пару тысячаў, дык за іх не абгаспадарыцца, бо адзін конь каштуе каля 5000 руб. А пазыкі няма дзе дастаць”[79]. Каб неяк змякчыць становішча і зменшыць сацыяльную напружанасць у краі, куды вярталіся рэпатрыянты, урадавым распараджэннем будаўнічы лес прадаваўся на 70% ніжэй рынкавых коштаў, а таксама прапаноўвалася беспрацэнтная пазыка на год[80]. Аднак такая дапамога ратавала не ўсіх, і роля грамадскай ініцыятывы апекавання пацярпелымі ад вайны заставалася надзвычай актуальнай. Трэба адзначыць, што бежанскія актывісты Беларускага камітэта ў Гродне не былі адзінымі, хто спрабаваў уладкоўваць былых бежанцаў. Побач з імі дапамагалі сваім мігрантам нямецкія, польскія і габрэйскія бежанскія камітэты[81].

[78] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 884, арк. 23.
[79] ЛЦДА, ф. 582, воп. 2, адз. зах. 46, арк. 98.
[80] *Kreisamt Grodno*, „Homan”, 1918, № 78, с. 3.
[81] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. зах. 22, арк. 69-70 адв.

Падтрымка насельніцтва, якое вярнулася ў выніку рээвакуацыі, працягвалася і ў пачатку 20-х гг. Памеры яе былі нязначныя і засноўваліся ў немалой ступені на фінансавых магчымасцях ахвяраванняў. Сумы ад 50 да 5000 польскіх марак збіраліся ад прыватных асоб і адзінкавых арганізацый. Напрыклад, для беларускага дзіцячага прытулку ў Вільне, па звестках тагачаснага кіраўніка Віленскага камітэты дапамогі пацярпелым ад вайны С. Рак-Міхайлоўскага, у верасні 1922 г. для 96 дзяцей было сабрана 28 300 польскіх марак[82]. У кастрычніку таго ж года сума такога ж збору склала 421 531 польскую марку, 6 марак нямецкіх і 80 марак паштовымі значкамі[83]. Інфармацыйнымі пляцоўкамі акцый па зборы ахвяраванняў выступалі беларускія газеты[84]. Крыніцамі збору хаця б невялікіх сродкаў выступалі таксама дабрачынныя пастаноўкі на вечарынах, якія ладзіліся намаганнямі прытулкавых дзяцей і настаўнікаў[85].

Кіраўнікі БНР неаднаразова ў сваёй ацэнцы становішча Беларусі і беларускага народа апелявалі да велізарных людскіх і матэрыяльных страт, выкліканых сярод іншага і масавым, гвалтоўным бежанствам[86]. І хаця кіраўніцтва БНР звязвала з вяртаннем бежанцаў вырашэнне сваіх розных, у тым ліку дыпламатычных праблем (напр., для вырашэння беларуска-літоўскіх стасункаў у дачыненні да тэрыторый Гродзеншчыны і Віленшчыны — К. Дуж-Душэўскі ў сваёй прамове 10 кастрычніка 1920 г. падкрэсліваў немагчымасць правядзення плебісцытаў наконт вызначэння лёсу беларускіх зямель без удзелу ў такім галасаванні мас бежанцаў-беларусаў), адлегласць паміж дэклараваннем важнасці бежанскага пытання і яго справамі па яго практычным вырашэнні была істотная[87].

Трохі пазней, у 1920-1921 гг., кіраўнікі першай абвешчанай беларускай дзяржавы будуць весці працу па магчымым вяртанні асобных груп бежанцаў-беларусаў з Сербіі і Балгарыі, інтэрніраваных белару-

[82] С. Рак-Міхайлоўскі, *Беларускі дзіцячы прытулак у Вільне*, «Беларускі звон», 1922, № 25, с. 4.

[83] *Справаздача аб зборы*, «Беларускі звон», 1922, № 29, с. 4.

[84] *Збор на сірот*, «Беларускі звон», 1922, № 26, с. 4.

[85] *Вучнёўскі вечар*, «Беларускія ведамасці», 1921, № 14, с. 4; *Падзяка*, «Беларускія ведамасці», 1921, № 15, с. 4.

[86] *Мемарыял Народнага Сакратарыяту БНР Імперскаму Канцлеру Нямеччыны за 05.04.1919; Дэкларацыя Рады Міністраў БНР за 22.11.1918*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 1, с. 84, 301; *Мемарандум Ураду БНР да Высокай Канферэнцыі Вялікіх Дзяржаў у Вашынгтоне*, [у:] *АБНР*, т. I, кн. 2, с. 1245-1246 (1245-1249).

[87] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, г. Масква (далей: ДАРФ), ф. 5782, воп. 1, адз. зах. 1, арк. 107; ЛЦДА, ф. 582, воп. 1, адз. зах. 11, арк. 7.

саў у нямецкіх лагерах. Напрыклад, у лагеры Ліхтэнгорст (Германія) сход 300 рэпатрыянтаў-беларусаў на чале са старшынёй сходу, урачом І. Цвікевічам 18 кастрычніка 1920 г. выказалі пісьмовае жаданне вярнуцца ў Беларусь, натхнёныя інфармацыяй з боку беларускай місіі ў Берліне[88]. Аднак тагачаснае эміграцыйнае становішча ўрада ўсё менш і менш спрыяла яго ўплыву на міжнародную сітуацыю[89]. А на ўсходнім кірунку, дзе была патрэбна арганізацыя вяртання людзей на землі Гродзеншчыны і Віленшчыны, уся рээвакуацыя ажыццяўлялася структурамі, якія падпарадкоўваліся новай савецкай уладзе.

Па сутнасці магчымасці ўздзеяння, хаця б намінальныя, на вымушаных мігрантаў з беларускіх губерняў у прадстаўнікоў БНР маглі быць толькі на акупаваных немцамі, а пазней, з вясны 1919 г. палякамі, тэрыторыях гэтых губерняў, калі ўжо бежанцы туды траплялі. І было гэта толькі ў 1918-1919 гг., пакуль стан урада БНР не ператварыўся ў эміграцыйны. Але і ў той час адсутнасць эканамічных і палітычных рычагоў рабіла іх уздзеянне на бежанцаў-беларусаў мінімальным.

Для разумення прычын невырашэння з боку БНР „бежанскага пытання" ў хоць якой істотнай ступені трэба мець на ўвазе тое, што „па сутнасці, — па словах А. Ціхамірава, — БНР з'яўлялася арганізацыяй, якая прэтэндавала на ўладу ў Беларусі, аднак рэальнай улады не мела". „Не дадавалі, — заўважае А. Ціхамірaў, — аўтарытэту органам БНР і супярэчнасці паміж беларускімі лідарамі, якія часам мелі не прынцыповы, а выключна асабісты характар"[90]. Тым больш, што адзінства сярод беларускіх палітыкаў у час ужо актыўнага, кантраляванага немцамі вяртання бежанцаў было, на вялікі жаль, няшмат: на момант заняцця польскімі войскамі Мінска беларуская палітычная думка была падзелена, паводле Паўла Алексюка, на тры кірункі: паланафільскую групу з выразнай заходняй афарбоўкай, групу А. Луцкевіча ды групу сацыял-рэвалюцыянераў, а „беларускі ўрад, — па словах А. Луцкевіча, — памяшчаўся ў вагонах скорых паяздоў Еўропы", шукаючы падтрымкі на міжнародных канферэнцыях і перамовах[91]. Ацэньваючы гэтыя намаганні беларускіх палітыкаў Арсень Ліс

[88] ДАРФ, ф. 5782, воп. 1, адз. зах. 5, арк. 9-12 адв; адз. зах. 20, арк. 15-19.

[89] ДАРФ, ф. 5782, воп. 1, адз. зах. 5, арк. 9-12 адв.

[90] А. Тихомиров, *Проблемы белорусско-германских отношений в 1914-1922 гг.*, «Белорусский журнал международного права и международных отношений», 2002, № 4, с. 42.

[91] А. М. Чарнякевіч, *Чужы сярод сваіх: Павел Аляксюк і беларускія „паланафілы"*, Мінск 2017, с. 105, 122.

згадвае, што „ўсе гэтыя звароты да сусветнай грамадскасці, захады, дыпламатычны крокі паслядоўны незалежнік Цвікевіч з горкай іроніяй, з сумам назаве марнымі лемантацыямі” і падсумоўвае: „Еўропа не пачула Беларусь. Заходнееўрапейскія палітыкі ў сваіх планах паклаліся на дзяржаўна адроджаную Польшчу”[92].

Ацэньваючы і ўсведамляючы ўвесь спектр умоў і фактараў, у якіх існавалі кіраўніцтва і структуры БНР, неабходна падкрэсліць, што як кіраўніцтва БНР, так яе радавыя актывісты, нягледзячы і нават насуперак расколам у „рэчышчы міжасабовых дачыненняў і персанальных амбіцый”, а таксама практычна суцэльнаму палітычнаму ігнараванню самавызначэння Беларусі з боку вядучых краін, маючых свае інтарэсы ў беларускіх землях, рабілі тое магчымае, што дазвалялі іх рэальныя сродкі і паўнамоцтвы, каб дапамагчы вымушаным мігрантам на розных этапах рээвакуацыі ў падрыхтоўцы да яе падчас пераезду і пасля вяртання на радзіму.

У якасці канкрэтных дзеянняў кіраўніцтва БНР у вырашэнні „бежанскага пытання” трэба адзначыць стварэнне і дзейнасць бежанскіх камісій у Беларусі і ў замежных прадстаўніцтвах БНР; планаванне фінансавых сродкаў на ажыццяўленне рээвакуацыі як маёмасці, так і бежанцаў; далучэнне да арганізацыі вяртання бежанцаў актыўных супрацоўнікаў з ліку бежанцаў-беларусаў, уключаючы іх у штат супрацоўнікаў адміністратыўнага апарату; арганізацыя інспекцыйных камандзіровак супрацоўнікаў Камісіі па бежанскіх справах Рады БНР, якія накіроўваліся па ўсіх вузлавых, перасадачных гарадах Беларусі, дзе назіралася істотная канцэнтрацыя бежанцаў; падрыхтоўка бежанскіх пасведчанняў, якія рабіліся на трох мовах — беларускай, рускай і ўкраінскай з пячаткаю на нямецкай мове, фотакарткай самога бежанца; падтрымка беларускага школьніцтва, у склад якога ўключаліся і дзеці бежанцаў; падтрымка насельніцтва, якое вярнулася ў выніку рээвакуацыі.

Агульнае разуменне з’явы масавага бежанства, стратэгічныя накірункі дзейнасці і практычныя мерапрыемствы, якія мелі і здолелі ажыццявіць беларускія незалежніцкія палітыкі, дазваляюць сцвярджаць аб тым, што ўсе захады і намаганні, якія рабіліся пад эгідаю БНР у 1918-1920 гг. у вырашэнні „бежанскага пытання”, могуць разглядацца як асобны накірунак уласнай дзяржаўнай міграцыйнай палітыкі.

[92] А. Ліс, *Аляксандр Цвікевіч: выдатны публіцыст і гісторык*, Мінск 2014, с. 32.

Summary

The implementation of the BNR's policies on migration (1918-1921)

The article draws attention to one of the problems in the history of forced migration from the Belarusian and Polish provinces of the Russian Empire, caused by the events of the First World War — the problem regarding migration policies of the leaders of the Belarusian People's Republic. Based on historical research and new archival material in the National Archives of the Republic of Belarus, the State Archives of the Russian Federation and the Lithuanian Central State Archives, the author analyses the efforts of the BNR politicians in organizing the re-evacuation of Belarusian refugees. For the first time, attention is paid to the specificity of financing this direction in the BNR's policy. On the basis of available source materials and historiography, the author draws conclusions about the degree of the effectiveness of the BNR's refugee policy and its importance in the overall development of the republic.

Keywords: refugees, the First World War, the Belarusian People's Republic — BNR, re-evacuation

Streszczenie

Możliwości BRL w realizacji polityki migracyjnej (1918-1921)

Artykuł zwraca uwagę na taki aspekt historii uchodźstwa z Białorusi, tzw. „bieżeństwa," jak polityka migracyjna Białoruskiej Republiki Ludowej. Na podstawie źródeł archiwalnych i literatury historycznej autor dochodzi do wniosku, że kierownictwo BRL podejmowało konkretne działania mające na celu rozwiązanie problemu „bieżeńców". Były to: powołanie i działalność komisji „bieżeńskich" na Białorusi i w przedstawicielstwach zagranicznych BRL; planowanie środków finansowych na reewakuację zarówno majątku, jak i uchodźców; angażowanie do organizacji powrotu „bieżeńców" aktywnych osób spośród samych uchodźców poprzez włączenie ich do aparatu administracyjnego; wysyłanie inspekcji, składających się z pracowników Komisji ds. uchodźców Rady BRL w celu skontrolowania węzłów kolejowych i miast, w których gromadzili się uchodźcy; przygotowanie dokumentów dla uchodźców w trzech językach — białoruskim, rosyjskim i ukraińskim z pieczęcią w języku niemieckim i zdjęciem uchodźcy; wspieranie szkolnictwa białoruskiego, obejmującego również dzieci uchodźców; wspieranie ludności powracającej z uchodźstwa w ramach reewakuacji. Dlatego ogólne zrozumienie zjawiska masowego uchodźstwa, strategiczne kierunki działalności i praktyczne działania, które mieli i zdołali zrealizować białoruscy politycy niepodległościowi, pozwalają stwierdzić, że wszystkie zabiegi i starania czynione pod egidą BRL w latach 1918-1920 w celu rozwiązania problemu „bieżeńców" miały znamiona państwowej polityki migracyjnej.

Słowa kluczowe: uchodźcy, I wojna światowa, Białoruska Republika Ludowa – BRL, reewakuacja

Wital Karnialuk — pracownik naukowy Grodzieńskiego Państwowego Uniwersytetu im. Janka Kupały, docent, doktorant Instytutu Historii Narodowej Akademii Nauk Białorusi. Zainteresowania badawcze: historyczna demografia Białorusi w I wojnie światowej, krajoznawstwo szkolne i pedagogika historyczna, rozwój turystyki na Białorusi. Autor książek „Экалагічныя экскурсіі па лесапарку Румлёва (2002, 2006), „Найноўшая гісторыя Беларусі 1917-1945 гг: факты, пытанні, заданні" (2009), „Крынкі ў 1795-1918 гг. Нарысы гісторыі мястэчка" (2009), „Гродназнаўства" (2009, 2010, 2012) oraz szeregu artykułów naukowych.

Сяргей Токць
(Гродна)

Беларуска-літоўская партызанка ў Гродзенскім павеце Беластоцкага ваяводства ў 1922-1923 гг.

На пачатку 1920-х гадоў значную частку тэрыторыі Заходняй Беларусі ахапіў партызанскі рух, скіраваны супраць польскай дзяржавы. У вялікай ступені гэты рух быў інспіраваны падтрымкай з-за мяжы — з боку СССР і Літвы. Але існавалі і важкія ўнутраныя прычыны — вострая незадаволенасць беларускага насельніцтва нацыянальнай палітыкай польскіх улад і сваім матэрыяльным становішчам. Гэтая старонка гісторыі пакуль яшчэ недастаткова даследавана ў беларускай гістарыяграфіі, што ў асаблівай ступені датычыцца партызанскага руху, які падтрымліваўся літоўскай дзяржавай і быў ідэалагічна і арганізацыйна звязаны з Беларускай партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў) і беларускім эміграцыйным урадам у Коўне. У адрозненне ад прасавецкай партызанкі, пралітоўскі рух арыентаваўся на ідэю ўтварэння незалежнай беларускай дзяржавы.

Найбольшую цікавасць да гэтага пытання выявілі беларускія гісторыкі з Беласточчыны, паколькі адным з цэнтраў партызанскага руху стаў абшар Белавежскай пушчы ў Бельскім павеце Беластоцкага ваяводства. Палітычны кантэкст дзейнасці беларуска-літоўскіх партызанаў разгледжаны ў працах Яўгена Мірановіча[1], які прыйшоў да высновы, што патэнцыяльныя паўстанцы не надта добра арыентаваліся, у якім палітычным кантэксце адбывалася іх канспіратыўная дзейнасць, а беларуская дзяржаўная ідэя ў партызанскай прапагандзе была ледзь прыкметная[2]. У артыкуле Ежы Каліны „Bractwo Włościan Białorusinów (1921-1922)"[3] даследаваны партызанскі рух на тэрыторыі Белавежскай пушчы, шмат увагі прысвечана постацям яго ідэйных

[1] E. Mironowicz, *Antypolska konspiracja białoruska w latach 1919-1925,* [w:] *Europa nieprowincjonalna. Przemiany na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczypospolitej (Białoruś, Litwa, Łotwa, Ukraina, wschodnie pogranicze III Rzeczypospolitej Polskiej)*, red. K. Jasiewicz, Warszawa 1999, s. 877-884; ён жа, *Пра дзеячаў і герояў*, „Ніва", 2003, № 11, с. 4; ён жа, *Партызаны ці тэрарысты?*, „Ніва", 2000, № 20, с. 4.

[2] Я. Мірановіч, *Навейшая гісторыя Беларусі*, Беласток 1999, с. 85.

[3] J. Kalina, *Związek Włościan Białorusinów,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 1994, nr 1, s. 29-38.

натхняльнікаў і арганізатараў: Веры Маслоўскай-Матэйчук і Германа Шыманюка (Скамароха). Асобам мясцовых лідараў і палявых камандзіраў беларуска-літоўскай партызанкі прысвечана даследаванне гродзенскага гісторыка Андрэя Чарнякевіча[4]. На думку Чарнякевіча, беларуская антыпольская канспірацыя і партызанскі рух сталі праявай крайняй радыкалізацыі мясцовага грамадства, праявай посттраўматычнай свядомасці сялянскіх мас, народжанай вайной[5].

З польскіх даследчыкаў беларуска-літоўскую партызанку і дзейнасць польскіх улад і органаў бяспекі па яе ліквідацыі даследаваў беластоцкі гісторык Войцех Сляшыньскі[6]. Аўтар прыйшоў да высновы, што сістэматычная праца мясцовай польскай адміністрацыі і службаў бяспекі па супрацьдзеянні ўзброеным дыверсіям прынесла чаканы эфект і з часам станавілася ўсё больш дасканалай. Але фактычнай прычынай спынення дыверсійнай дзейнасці да 1925 г. стала адмова Літвы, а галоўнае — СССР, гэтую дзейнасць падтрымліваць[7].

Пытанні арганізацыі беларуска-літоўскай партызанкі, узаемаадносіны беларускіх дзеячаў і літоўскіх улад грунтоўна разгледжаны ў адным з раздзелаў манаграфіі Тамаша Блашчака „Białorusini w Republice Litewskiej 1918-1940"[8]. Блашчак прыйшоў да высновы, што літоўскі бок, як „спонсар" і арганізатар меў поўны кантроль над дзейнасцю беларускіх партызанаў, у тым ліку і кантроль над зместам іх агітацыйных выданняў. Калі ж палітычная патрэба ў падтрымцы беларускага партызанскага руху знікла, літоўскія ўлады прыступілі да ліквідацыі яго структур і сталі пазбывацца саміх яго ўдзельнікаў.

4 І. Коўкель, А. Чарнякевіч, *Партызанскі рух на Гродзеншчыне 1921-1925,* [у:] *Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: матэрыялы рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 750-годдзю г. Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І. І. Стаброўскага*, Слонім 2002, с. 254-259; А. Чернякевич, *Белорусское партизанское движение в Польше и его вожди*, [у:] *От «германской» к Гражданской: становление корпуса народных вожаков русской смуты*, Москва 2014, с. 393-406. Выказваю таксама Андрэю Чарнякевічу шчырую падзяку за неацэнную дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага артыкула і ўнікальныя архіўныя дакументы.

5 А. Чернякевич, *Белорусское партизанское движение в Польше*, с. 404.

6 W. Śleszyński*, Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej*, Warszawa 2007; ён жа, *Białoruska działalność dywersyjna w pierwszej połowie lat dwudziestych i formowanie się Białoruskiej Włościańsko-Robotniczej Hromady*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2008, nr 29, s. 183-191; ён жа, *Walka instytucji państwowych z białoruską działalnością dywersyjną 1920-1925*, Białystok 2005.

7 W. Śleszyński, *Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego*, s. 311-312.

8 T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918-1940*, Białystok 2017, ss. 368.

Галоўным недахопам існуючай на сённяшні дзень гістарыяграфіі беларуска-літоўскай партызанкі, на маю думку, з'яўляецца ананімнасць шараговых партызанаў. Яны звычайна выступаюць у большасці даследаванняў як безаблічная шэрая маса, якая кіруецца ці крыўдай на ўціск з боку ўлад, ці матэрыяльным інтарэсам і прагай нажывы. Толькі асобы некалькіх лідараў партызанскага руху, такіх як Герман Шыманюк-Скамарох і Вячаслаў Разумовіч-Хмара, атрымалі дастаткова поўнае асвятленне ў працах гісторыкаў, і то ў значнай ступені дзякуючы сваім каларытным асабовасцям і авантурысцкім схільнасцям. Таксама Андрэй Чарнякевіч у сваім даследаванні разгледзеў постаці лакальных лідараў і камандзіраў партызанкі. Таму адной з галоўных задач дадзенай працы нам бачылася стварэнне абагульненага сацыяльнага партрэта звычайнага беларускага партызана і рэканструкцыя яго самасвядомасці.

На ўзнікненне беларуска-літоўскай партызанкі вызначальны ўплыў аказаў востры тэрытарыяльны канфлікт паміж новапаўсталымі польскай і літоўскай дзяржавамі. У верасні 1920 г. у Літве быў створаны галоўны штаб параміліцтарнай арганізацыі Стралецкага фронту „шаўлісаў" (стральцоў), якому падпарадкоўваліся 5 палявых штабоў[9]. Тады ж паўстала ідэя стварэння і беларускіх стралецкіх аддзелаў пад літоўскім камандаваннем. Але па прычыне страты Літвой Віленшчыны яе рэалізацыя была адкладзена. Тым не менш працягвалася супрацоўніцтва літоўскіх улад з беларускімі нацыянальнымі дзеячамі ў справе выдання, перамяшчэння праз літоўска-польскую мяжу і распаўсюджання на тэрыторыі польскай дзяржавы агітацыйнай літаратуры на беларускай мове.

На пачатку 1922 г. палявыя штабы „стральцоў" былі рэарганізаваны. Кожны цяпер адказваў за канкрэтны адрэзак дэмілітарызаванай дэмаркацыйнай лініі на польска-літоўскай мяжы (асобы рэжым гэтай лініі, названай лініяй маршала Фоша, быў уведзены ў ліпені 1919 г., сюды быў забаронены доступ вайсковых фармаванняў Польшчы і Літвы; дзейнічаў гэты рэжым да студзеня 1923 г.), а таксама за сцісла акрэсленую тэрыторыю пад „польскай акупацыяй". Напрыклад, партызаны III групы павінны былі дзейнічаць на тэрыторыі браслаўскай, дунілавіцкай, дзісненскай, ашмянскай, свянцянскай, вілейскай і валожынскай акруг. Да абшару групы IV са штабам у Мерачы належалі наступныя акругі на тэрыторыі польскай дзяржавы: баранавіцкая, беластоцкая, бельская, ваўкавыская, гродзенская, кобрынская, лідская, нясвіжская, навагрудская, пружанская, сакольская, слонімская. Пар-

[9] Тамсама, s. 231.

тызаны групы VI (штаб у Кашэдарах) былі адказныя за дзейнасць на тэрыторыі віленскай акругі. Для камандавання групаў III і IV былі скіраваны беларусы: палкоўнік Мікалай Бігард і капітан Вячаслаў Разумовіч (псеўд. Хмара), а Рыгора Казячага прызначылі часовым камандзірам VI групы (у красавіку 1922 г. ён быў пераведзены на пасаду начальніка штаба гэтай групы).

Вячаслаў Разумовіч-Хмара ў розных крыніцах часта фігураваў як „атаман беларускіх партызанаў", альбо начальнік Галоўнага Штаба беларускіх партызанаў, хоць, як сцвярджае Тамаш Блашчак, у літоўскіх дакументах яму не ўдалося адшукаць слядоў існавання такіх арганізацый, а ўсе партызанскія фармаванні функцыянавалі ў рамках Літоўскага стралецкага звязу[10]. Але IV група ў Мерачы сапраўды адыграла галоўную ролю ў арганізацыі падпольных узброеных фармаванняў на тэрыторыі польскай дзяржавы.

Тайная інструкцыя ад 11 снежня 1921 г. акрэслівала задачы беларуска-літоўскіх партызанаў: збор інфармацыі пра польскія войскі, падрыхтоўка і выкананне дыверсійных акцый, падрыхтоўка ўзброенага выступлення беларусаў у тылах польскай арміі на выпадак вайны паміж Польшчай і Літвой. У інструкцыі гаварылася, што ўхіленне беларускага насельніцтва ад партызанскай барацьбы прывядзе да яго поўнага фізічнага знішчэння праз польскую ўладу з дапамогай тыфу, уціску, кантрыбуцый, высмейвання народных звычаяў і традыцый. Таму беларусы, а асабліва на Гродзеншчыне, павінны, паводле аўтараў інструкцыі, абудзіцца і крывёй адплаціць палякам за стагадовы ўціск[11].

Прапаганда партызанскай барацьбы супраць польскай дзяржавы хутка прынесла свае вынікі. Як адзначалася ў матэрыялах пазнейшага польскага следства, яшчэ перад Калядамі 1922 г. група моладзі з вёскі Бершты на поўначы Гродзенскага павета падалася ў Мерач, каб уступіць у партызанскі аддзел[12]. Паводле інфармацыі камандзіраў асобных аддзелаў на канец снежня 1922 г. у шэрагах 4 групы налічвалася 6747 партызан, з якіх прыкладна 2/3 належалі да аддзела Германа Шыманюка (Скамароха) у Бельскім павеце. Тамаш Блашчак лічыць, што гэтыя лічбы вельмі моцна разыходзіліся з рэчаіснасцю, у асаблівасці ж датычна Бельскага павета, дзе фактычна партызанскі рух быў разгромлены ў маі 1922 г.[13] Для масавага ж антыпольскага паўстання беларускага насельніцтва гэты рух у цэлым быў занадта слабы.

[10] Тамсама, s. 233.
[11] Тамсама, s. 234.
[12] Lietuvos centrinis valstybės archyvas (далей: LCVA), f. 127, ap. 1, b. 84, l. 1.
[13] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej*, s. 238.

Польскія спецслужбы, натуральна, уважліва сачылі за працэсам арганізацыі канспіратыўнай сеткі і партызанскіх аддзелаў, і ім удалося на Беласточчыне ўкараніць у шэрагі партызанаў свайго агента Эдварда Лянкевіча, ураджэнца Саколкі, што дазволіла паліцыі на пачатку сакавіка 1922 г. распачаць арышты найбольш актыўных удзельнікаў падполля. Сярод іншых была тады арыштавана і вядомая на Беласточчыне беларуская дзяячка і сябра партыі эсэраў Вера Маслоўская, якая прыняла 25-28 верасня 1921 г. удзел у працы Усебеларускай канферэнцыі ў чэшскай Празе. Канферэнцыя атрымала таксама фінансавую падтрымку ад літоўскага ўрада[14], а дэлегаты канферэнцыі назвалі Літву „гістарычным сябрам” беларускага народа.

Паведамленні паліцэйскіх камендантаў Гродзенскага павета за першы квартал 1922 г. таксама выразна сведчылі пра нарастанне антыўрадавых настрояў сярод беларускага насельніцтва і актывізацыю антыпольскай канспірацыі. Камендант пастарунка паліцыі ў Вялікай Бераставіцы Станіслаў Булат паведамляў у Гродна, што сяляне, у якіх паліцыянты знаходзяць зброю, прызнаюць на допытах: „My priatajem gwintowki na „Klik”(так запісаў па-беларуску камендант — С. Т.). To jest domyślnik naturalnie na hasło do powstania przeciw polskim władzom”[15]. Таксама гэты камендант запісаў, што „po wsiach każdy przeciętny chłop patrzy złowrogo, trudno u mieszkańców tutejszych co kupić, bo ten chłop tak gada, że polskaja właść to tolko bierot, a dawać niczego nie dajet”[16].

Камендант Каменскай гміны адзначаў у сваёй справаздачы: „Ludność białoruska jest natchniona duchem Litwy iż da im wybawienie i swobodę, gdyż polski rząd ściska różnemi podatkami i daninami”[17]. У справаздачы каменданта Крынкаўскай гміны ўпрост гучаць трывожныя ноткі: „bezpieczeństwo urzędników oraz inteligentniejszej ludności polskiej jest częściowo zagrożone pogróżkami białorusinów, którzy rozsiewają takowe pomiędzy ludnością i grożą wyrżnięciem urzędników”[18]. Гэты камендант нават напісаў у Гродна пра планаваны беларусамі напад на Крынкі, аб чым паліцыю папярэдзіў 22 сакавіка мясцовы канфідэнт Адольф Сідаровіч. У меркаваны дзень нападу, як напісаў камендант: „widziana была duża liczba chłopów białoruskich, chodzących z piłami i siekierami pod pozorem szukania roboty. Wieczorem zapadła w mieście zupełna cisza, która bywa najczęściej przed burzą”[19].

[14] Тамсама, s. 190.
[15] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей: ДАГВ), ф. 17, воп. 1, спр. 12, арк. 21 адв.
[16] Тамсама.
[17] Тамсама, арк. 19 адв. — 20.
[18] Тамсама, арк. 29.
[19] Тамсама, арк. 27.

Камендант пастарунка ў Берштах пісаў у Гродна: „we wsi Berszty ustalono drogą obserwacji tajnej istnienie Komitetu białoruskiego. Siedzibą tego komitetu jest dom we wsi Berszty Pawlukiewicza Władysława, a także tej że wsi Kostiewicza Kuźmy. Jak wynika z obserwacji nad ruchem podejrzanych jednostek wymieniony komitet nawiązuje ścisły kontakt z m[iasteczkami] Porzecze, Ostryna, Nowy-Dwór, Skidel. Cała organizacja jest pod pokrywką tut[ejszego] kółka rolniczego utworzonego dn[ia] 8 sierpnia 1921 r. Głównymi działaczami są następujące osoby: Pawlukiewicz Władysław — pseudonim „Suslik", Kostiewicz Kuźma — pseudonim „Benedyś", Włodzimierz Ilkiewicz — pseudonim „Wołk", Kozun Jan, Rul Michał, pseud. „Wojtow" — nazwiska reszty członków organizacji nie wykryto, obserwacje nad wymienionymi trwają w dalszym ciągu"[20]. Названыя камендантам псеўданімы хутчэй за ўсё былі звычайнымі вясковымі мянушкамі, а пералічаныя сяляне так папраўдзе не ўдзельнічалі актыўна ў мясцовым палітычным жыцці.

Гродзенскі павятовы камендант паліцыі падсумаваў справаздачы з пастарункаў: „Stosunek do ludności białoruskiej naprężony z powodu szerzącej się pośród tej ludności agitacji wywrotowej, prowadzonej przez osobników z obozów lewicowych, na czele których stoją Baranow, Jakowiuk i inni, wspierani przez Rząd Łastowskiego w Kownie"[21]. Інфарматар польскай паліцыі Ян Шурпа са Скідзельшчыны паведамляў, што сярод мясцовых жыхароў „wszędzie chodziły pogłoski, że w prędkim czasie musi być wojna, że powstanie republika białoruska"[22].

У красавіку 1922 г. партызаны, якія сарганізаваліся ў Белавежскай пушчы, правялі некалькі дыверсійных акцый. Напэўна гэтыя акцыі былі прыспешаны арыштамі беларускіх лідараў на Беласточчыне. Самай гучнай дыверсіяй стаў напад на паліцэйскі пастарунак у мястэчку Кляшчэлі Бельскага павета. Спачатку палявы камандзір Ян Грыцук (Чорт) выслаў ліст да каменданта паліцыі ў Кляшчэлях, які быў напісаны па-расійску, але з пячаткай на беларускай мове: „Брацтва сялян-беларусаў". Ад імя атамана Скамароха Чорт запатрабаваў, каб паліцыянты перасталі біць і абражаць на допытах сялян-беларусаў, а інакш пагражаў павесіць іх на тэлеграфным слупе. А ў ноч з 28 на 29 красавіка 1922 г. група партызанаў напала на пастарунак у Кляшчэлях, застрэліўшы двух паліцыянтаў.

[20] Тамсама, арк. 26.
[21] Тамсама, арк. 2.
[22] Archiwum Państwowe w Białymstoku (dalej: APwB), Prokurator Sądu Okręgowego w Białymstoku (dalej: PSOwB), sygn. 86, k. 32.

У выніку масавай аблавы, сумесна арганізаванай 6 мая 1923 г. паліцыяй і войскам, быў акружаны лагер партызанаў у Белавежскай пушчы. Удалося арыштаваць, паводле дадзеных Тамаша Блашчака, 19 чалавек[23] (Ежы Каліна прыводзіць лічбу 6 асоб, арыштаваных пасля кароткай збройнай сутычкі[24]). Паліцыя знайшла звесткі пра членаў арганізацыі, мапы нямецкага генеральнага штаба, лісты і адозвы да насельніцтва, а таксама ўльтыматум, адрасаваны Юзафу Пілсудскаму, у якім атаман Скамарох дамагаўся для беларусаў у Польшчы права на самавызначэнне, спынення рэпрэсій, разбурэння праваслаўных цэркваў і пераследу святароў, а таксама вываду з беларускіх зямель войска і паліцыі. 24 мая 1922 г. на моцы пастановы палявога суда былі расстраляны 4 удзельнікаў нападу на Кляшчэлі. Частка партызанаў разам з Германам Шыманюком здолела ўцячы, а потым перабрацца праз мяжу ў Літву. Пасля гэтых падзей партызаны спынілі дыверсійныя акцыі ў раёне Белавежскай пушчы. Можна сцвярджаць, што арганізаваны партызанскі рух там перастаў існаваць.

Затое абвастрылася сітуацыя ў Гродзенскім павеце, асабліва ж у паўночнай яго частцы, памежнай з Літвой і пакрытай лясамі. Напрыклад, справаздача пастарунка паліцыі аб становішчы ў Берштаўскай гміне за II квартал 1922 г. выглядала вельмі трывожнай: „Ludność białoruska-litewska tut[ejszego] rejonu zaagitowana przez agentów litewskich wielką ilością stale rozrzucanych odezw w języku przeważnie białoruskim jest b[ardzo] wrogo usposobiona. Według wiadomości konfidencjonalnych wymieniona ludność przygotowuje się do zbrojnego powstania — co potwierdza się, iż młodzież w znacznej części zbiega do m. Merecza, w którem to wstępują do formacji białoruskich, zaś niektórzy otrzymawszy broń i zapisawszy się do organizacji wojskowej powracają z bronią do domów. Wobec powyższego jest przypuszczenie, że młodzi ludzie, którzy jeszcze pozostali się na miejscu — należą do organizacji wojskowych i bezwzględnie wszyscy posiadają broń. Stwierdzone zostało, że z Merecza często wysyłają Litwini uzbrojone świetnie bandy białoruskie celem rozrzucania literatury agitacyjnej oraz dla dokonania zamachów”[25].

У ліпені 1922 г. з’явілася нелегальнае прапагандысцкае выданне — газета „Беларускі партызан”, рэдакцыя якой нібы змяшчалася ў Белавежскай пушчы. Рэдактарам першага і чацвёртага нумароў быў пазначаны Герман Шыманюк-Скамарох, а другога-трэцяга — Г. Плюшча. Насамрэч гэтая газета выдавалася ў Коўне, а яе рэдагаваннем,

[23] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej*, s. 240.

[24] J. Kalina, *Związek Włościan Białorusinów*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 1994, nr 1, s. 35.

[25] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 3, арк. 35.

як лічыць Тамаш Блашчак, займаўся Рыгор Казячы[26]. Экземпляры „Беларускага партызана" раскідваліся па ўсёй тэрыторыі Гродзенскага павета. Пацвярджэнне гэтаму можна знайсці ў дзённіку маладога беларускага актывіста Пятра Сяўрука з мястэчка Скідзель, які ў часе бежанства адвучыўся 5 гадоў у гімназіі ў расійскім горадзе Ліпецку, а пасля вяртання дадому ў 1921 г. пачаў выпісваць беларускія газеты і кнігі, для чаго завязаў кантакт з беларускімі выдавецтвамі ў Вільні. Гэта адразу выклікала зацікаўленасць да яго асобы з боку мясцовай паліцыі. 9 кастрычніка 1923 г. Пётр Сяўрук напісаў у сваім дзённіку, які вёў на расійскай мове: „Пришли шесть полициантов и сыщик, сделали ревизию. Из всего найденного подозрительным был «Беларускі Партызан, жнівень № 1, 1922 год», прокламация, разбросанная щедро по всей нашей территории, так что её находил почти каждый. Мне тоже случилось найти несколько экземпляров, из которых сохранил ради любопытства найденные при обыске"[27].

„Беларускі партызан" наўпрост заклікаў да ўзброенай барацьбы з польскім урадам і змяшчаў інфармацыю (моцна перабольшаную) аб дзейнасці партызан, у тым ліку пра іх дыверсійныя акцыі. Увогуле антыпольская агітацыя на тэрыторыі Гродзенскага павета праводзілася вельмі актыўна і з выкарыстаннем розных падыходаў. Напрыклад, у кастрычніку 1922 г. у гміну Скідзель прыехаў вядомы на Гродзеншчыне беларускі дзеяч Сяргей Баранаў, які неўзабаве быў абраны паслом у Сейм. Найбольш актыўныя прадстаўнікі мясцовай моладзі атрымалі ад яго спецыяльныя запрашэнні на сустрэчу, напісаныя на беларускай мове. Сярод удзельнікаў аказаўся таксама канфідэнт паліцыі, які сцвярджаў у сваёй справаздачы, нібыта Баранаў агітаваў моладзь уступаць у беларускія вайсковыя фармаванні[28].

Да барацьбы з партызанамі ў памежных гмінах Гродзенскага павета былі прыцягнуты рэгулярныя войскі. У Берштаўскай гміне размясцілі жаўнераў 76-га пяхотнага палка. У першым нумары „Беларускага партызана" паведамлялася, што партызаны забілі 19 ліпеня ў баі каля вёскі Зубрава Берштаўскай гміны 18 жаўнераў гэтага палка[29]. Дадзеная інфармацыя была сродкам прапагандысцкай барацьбы і не адпавядала рэчаіснасці. Яна не знаходзіць пацвярджэння ў польскіх крыніцах. Але перастрэлкі паміж партызанамі, з аднаго боку, і войскам, паліцыяй і ляснай вартай, з другога, здараліся ў гэтай мясцовасці сапраўды часта. У справаздачы мясцовай паліцыі захаваўся

[26] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej*, s. 235.
[27] Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, адз. зах. КП-89095.
[28] APwB, PSOwB, sygn. 86, k. 137.

факт, што ў маі 1921 г. паліцыянт Берштаўскага пастарунка Эдвард Лукашэвіч смяротна параніў „пры спробе ўцёкаў” жыхара вёскі Сухары Яна Курылу, які абвінавачваўся ў забойстве польскага жаўнера. Пра гэта сведчыць копія ліста камендanta пастарунка да падпракурора гродзенскага акруговага суда: „Na zasadzie art. 253 U.P.K. przesyłam do rozporządzenia protokólarne dochodzenie w sprawie postrzelenia przez St[arszego] Post[erunkowego] Łukaszewicza Edwarda z tut[ejszego] Post[erunku] pod czas usiłowania ucieczki mieszkańca kol[onii] Suchary Kuryły Jana oskarżonego o zabójstwo żołnierza WP i zbiegłego z więzienia grodzieńskiego w dn. 25.V.1921 r., któren to wskutek otrzymanej rany zmarł”[30]. Але забойства Янам Курылам жаўнера адбылося, напэўна, яшчэ ў 1921 г., і пра акалічнасці гэтага здарэння нам нічога невядома.

Жаўнеры 76 палка пяхоты працяглы час былі размешчаны ў Берштаўскай гміне. Напэўна, што час ад часу іх выводзілі ў месцы сталага кватаравання, але потым зноў вярталі ў збунтаваную мясцовасць. Напрыклад, акруговае ўпраўленне дзяржаўных лясоў у Вільні 30 кастрычніка 1922 г. звярнулася да каменданта паліцыі Гродзенскага павета: „Nadleśnictwo Bersztowskie pismem z dnia 23.X r.b. [...] zawiadomiło tut[ejszy] Zarząd, iż po usunięciu się wojska bandyci-partyzanci z powrotem zaczęli grasować na terenach nadleśnictwa i że w przeciągu ostatnich kilka dni zaszły trzy potyczki administracji leśnej z bandytami. Wobec powyższego lasy i zwierzostan są w niebezpieczeństwie ponieważ defraudanci i kłusownicy pod pretekstem partyzantów mogą poczynić wielkie szkody, zaś straż leśna jest bezsilna w walce z partyzantami-bandytami”[31]. Павятовы камендант паліцыі загадаў 11 лістапада берштаўскаму пастарунку ўзмацніць начное патруляванне мясцовасці і наладзіць цеслую супрацу з лясной вартай.

Вайскоўцы зноў вярнуліся ў Бершты, пра што сведчыць рапарт каменданта пастарунка паліцыі Аляксандра Сламчынскага ад 23 снежня 1922 г., што жаўнеры залезлі праз акно ў рэстаўрацыю нейкага Яна Пэлнага і скралі 40 бутэлек гарэлкі і 50 пачак папяросаў: „Ponieważ ludność świadoma faktów kradzieży, popełnionej już drugi raz przez żołnierzy, z niechęcią patrzą na znajdujący się tu oddział i władze policyjne, co ujemnie może wpłynąć na pracę posterunku, który winien dla intensywnej pracy zdobyć zaufanie u tutejszej ludności, wypadek taki wprost oburza i zniechęca takowych do organów wykonawczych władz, jak również wypadki pijaństwa przez podoficerów i żołnierzy wprost do utraty

[29] „Беларускі партызан”, 1922, № 1, с. 7.
[30] ДАГВ, ф. 38, воп. 1, спр. 2, арк. 7.
[31] Тамсама, арк. 494.

przytomności i wyzywania się publicznie słowami nieprzyzwoitymi, przez co ludność nie ma poszanowania do władz"[32].

Нягледзячы на падобныя інцыдэнты, можна меркаваць, што прысутнасць войскаў прадухіліла найбольш радыкальны варыянт развіцця падзей у памежных гмінах Гродзенскага павета і спыніла разліў крыві. Асноўныя дыверсійныя акцыі партызаны з Мерачы правялі летам 1922 г. Так, 23 чэрвеня 1922 г. аддзел партызанаў напаў на маёнтак Глыбокае Аляксандра Мікульскага суседняй з Берштамі Навадворскай гміны Лідскага павета. У нападзе, паводле сведак, удзельнічалі 20-30 партызанаў[33]. Былі спалены дамы і гаспадарчыя пабудовы. На шчасце, абышлося без людскіх ахвяр, а самога ўласніка ў тым часе не было дома. Партызаны пры гэтым не дазвалялі парабкам тушыць пажар, заявіўшы, што будуць нішчыць „усіх польскіх паноў і ўсё, што польскае". Паліцыя знайшла на месцы спаленага маёнтка пустыя гільзы ад патронаў і неўзарваную гранату, а таксама „paczkę broszur w języku białoruskim i polskim, wśród których było 74 egzemplarzy białoruskiej broszury p[od] t[tytułem] „Pańsko-polskie facecje", 5 egzemplarzy broszury „Sielanskaja dola", jedna książka p[od] t[tytułem] „Wspomnienia polskiej okupacji Grodzieńszczyzny w latach 1919-1921", oraz 5 proklamacji białoruskich"[34]. Паліцыя прыйшла да высновы, што „wszystkie artykuły umieszczone w broszurach zawierają treść agitacyjną i wrogą względem Polski, wzywanie do powstania zbrojnego, którego ostatecznym celem ma być niepodległa republika białoruska, zaś proklamacje podpisane przez Sztab partyzantów białoruskich wzywają białorusinów, by palili i mordowali panów polskich i w ten sposób oczyścili Białoruś od polaków"[35]. З паказанняў галоўнага сведкі на пазнейшым працэсе супраць партызанаў Канстанціна Шыгаловіча вынікала, што загад аб нападзе на маёнтак Глыбокае аддаў асабіста Вячаслаў Разумовіч-Хмара. У чэрвені 1922 г. адбыўся рабунковы напад на вёску Падбелае Парэцкай гміны і забойства там інжынера Пруданскага[36]. Гэты напад паліцыя таксама звязвала з дзейнасцю партызанаў і падазравала Яна Русілку з Берштаў, а таксама партызанаў, якія паходзілі з Сухароў і Скідзеля ў Гродзенскім павеце[37].

У ліпені 1922 г. у вёску Бершты, якая лічылася цэнтрам партызанскага руху, былі скіраваны следчыя Шумскі і Жужалоўскі з Гродна.

[32] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 14, арк. 10.
[33] LCVA, f. 127, a. 1, b. 84, l. 125.
[34] Тамсама, l. 125 адв.
[35] Тамсама.
[36] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 3, арк. 21.
[37] ДАГВ, ф. 38, воп. 1, спр. 7, арк. 99.

У выніку іх працы паліцыя арыштавала мясцовых сялян Сцяпана і Уладзіміра Язэпчыкаў, Міхала Варонку, Антона Ханевіча, Бенядыкта Васілевіча, Баляслава Лебядзевіча, якіх падазравалі ў сувязях з партызанамі. Пракурор пры акруговым судзе ў Гродне пісаў 17 ліпеня 1922 г. пракурору пры апеляцыйным судзе ў Вільні: „wnioskować należy, że ruch partyzantów białoruskich zorganizowany jest przez eimsariuszy z Litwy Kowieńskiej, z Merecza, wspólnie z miejscową ludnością białoruską objął już kilka miejscowości w powiecie Grodzieńskim, a w szczególności gminy Berszty, Porzecze, Jeziory i Krynki, oraz że ruch ten szerzy się stale nie tylko w powiecie Grodzieńskim, lecz i w sąsiednich powiatach. [...] Z dochodzenia policyjnego wynika, iż przed Wielkanocą r.b. ze wspomnianej wsi Berszty zbiegło do Litwy Kowieńskiej kilkadziesiąt osób; osoby te podtrzymują stały kontakt z miejscową ludnością i, uzbrojeni w karabiny i granaty ręczne, przychodzą do Berszt, przynoszą ze sobą odezwy (odpis takiej odezwy w języku białoruskim dołączony jest do dochodzenia), podburzając ludność białoruską do walki z Polską drogą organizacji zbrojnego powstania, i urządzając we wsi zebrania z udziałem miejscowej ludności”[38].

З арыштаваных жыхароў вёскі Бершты Сцяпан і Уладзімір Язэпчыкі нібы мелі сціслы кантакт з партызанамі, якім пастаўлялі харчаванне і раздавалі ў вёсцы партызанскія ўлёткі. Антон Ханевіч чытаў і тлумачыў улёткі непісьменным аднавяскоўцам, а ў яго хаце, а таксама ў хатах Баляслава Лебядзевіча і Міхаіла Варонкі адбываліся сходы ўзброеных партызан. Бенядыкт Васілевіч пагражаў солтысу вёскі, што яго сын партызан Рыгор Васілевіч, калі вернецца ў Бершты, заб’е солтыса за тое, што апошні выдае партызанаў паліцыі.

Усе арыштаваныя абвінавачванні адкідвалі. Сцяпан Язэпчык паведаміў паліцыі, што ён стары чалавек і палітыкай не цікавіцца, пра партызанаў нічога не ведае, а чуў толькі, што апошнім часам з Берштаў збегла на Літву моладзь у веку 16-18 гадоў. На працягу двух месяцаў усяго ўцяклі 21 чалавек, групкамі па 2-4 асобы. Таксама адмаўляў усе абвінавачанні яго сын Уладзімір, хаця прызнаваў, што ў Літву збег яго брат Мікіфар[39].

Бенядыкт Васілевіч заявіў следчым, што ў вёсцы Бершты няма ніякіх партызанаў і ніхто там палітыкай не цікавіцца, хаця прызнаў, што яго сын Рыгор збег у Літву. Баляслаў Лебядзевіч сцвярджаў, што ніколі ў яго партызаны не начавалі, ён сам палітыкай не займаецца, „jest

[38] LCVA, f. 127, a. 1, b. 84, l. 7.
[39] Тамсама, l. 7 v.

polakiem i żadnej Białorusi nie chce"[40]. Аднак усіх падазраваных адправілі ў турму ў Гродне. Забягаючы наперад, варта адзначыць, што ўсе яны былі пазней апраўданы судом, а Баляслаў Лебядзевіч і Міхал Варонка патрапілі ў лік падазроных зусім выпадкова.

На пачатку ліпеня 1922 г. пастарунак вайсковай жандармерыі ў Друскеніках арыштаваў жыхара мястэчка Крынкі Канстанціна Шыгаловіча, які прызнаўся ў прыналежнасці да беларуска-літоўскіх партызанаў. Гэты арышт меў ключавое значэнне для распрацоўкі партызанскага руху праз палітычную паліцыю. Шыгаловіч даў падрабязныя паказанні, назваўшы цэлы шэраг прозвішчаў камандзіраў і шараговых удзельнікаў. Магчыма, што ён і быў засланы паліцыяй у Мерач, на карысць чаго ўказвае і яго крымінальнае мінулае. Прынамсі пры вяртанні меў з сабой ліст з запісанымі прозвішчамі партызанаў, які прыгатаваў адмыслова для польскай паліцыі. Шыгаловіча спачатку перавезлі для допытаў у Вільню, а потым адпусцілі з-пад арышту, пакінуўшы пад наглядам паліцыі[41] (неўзабаве Шыгаловіч трапіў пад арышт ужо па зусім іншай крымінальнай справе).

Канстанцін Шыгаловіч паказаў, што ў лютым 1922 г. ён быў прызваны на вайсковую службу. У тым часе ў Крынках антыдзяржаўную агітацыю праводзіў ураджэнец вёскі Куліkoўцы Аляксандр Станкевіч, „namawiając białoruską młodzież w wieku poborowym do uchylania się od służby w wojsku polskim, a wstępowania do oddziałów partyzanckich białoruskich, znajdujących się na Litwie Kowieńskiej, wychwalając tamtejsze stosunki, oraz zapewniając słuchaczy, że Grodzieńszczyzna wkrótce odpadnie od Polski i albo wejdzie w skład Litwy albo niepodległej Białorusi"[42]. Шыгаловіч разам са Станкевічам і групай моладзі перайшоў польска-літоўскую мяжу (іх правёў узброены карабінам жыхар памежнай вёскі, якога Шыгаловіч таксама выдаў паліцыі) і апынуўся ў Мерачы, дзе Станкевіч прывёў іх у штаб IV групы беларускіх партызанаў. Там „камендант" Разумовіч прапанаваў хлопцам уступіць у шэрагі партызанаў. Толькі адзін Шыгаловіч з гэтай групы, з яго ўласных слоў, нібыта не пагадзіўся, за што быў арыштаваны. Пад прымусам ён усё ж уступіў у шэрагі партызанаў і пэўны час выконваў вартаўнічую службу пры штабе, што дазволіла яму пазнаць шмат асоб, якія там бывалі.

Напрыклад, на пачатку чэрвеня 1922 г. Разумовіч-Хмара, паводле паказанняў Шыгаловіча, выслаў групу партызанаў у колькасці каля 15

40 Тамсама, l. 2.
41 Тамсама, l. 5.
42 Тамсама, l. 114.

асоб з заданнем узарваць чыгуначны мост праз Нёман каля станцыі Масты, але праз 5 дзён гэтая група вярнулася, не выканаўшы задання, бо ім нібыта перашкодзіла нейкая кабета[43]. Праўда, пазней партызанам усё ж удалося ўзарваць мост праз Нёман каля Друскенікаў.

У канцы чэрвеня 1922 г. Разумовіч-Хмара выслаў у Гродна Пятра Пералайку і нейкага „Сароку" (абодва паходзілі з вёскі Верцялішкі) з заданнем узарваць будынак штаба польскіх войскаў, для чаго яны атрымалі піраксілін, 10 гранатаў і рэвальверы. План гэты таксама не быў рэалізаваны. Паводле паказанняў Шыгаловіча, неўзабаве Разумовіч выпрацаваў новы план нападу на Гродна, для чаго ў Мерач былі выкліканы Пётр Адаменя (той самы „Сарока"), Васіль Юрэчка і Мікалай, Павел і Уладзіслаў Апонікі. У штабе Разумовіч выклаў перад Адаменем і Юрэчкай план падрыву Д.О.К. III (Dowództwo Okręgu Korpusu Nr III) і абрабавання Польскай касы пазычковай. Таксама ўзнікла, паводле паказанняў Шыгаловіча, ідэя атруціць польскіх афіцэраў у афіцэрскім казіно, для чаго Разумовіч выдаў групе грошы, атруту і выбухоўку. У Гродне да іх нібыта павінен быў далучыцца брат Васіля Юрэчкі, Пётр. Арыштаваны пазней Пётр Адаменя прызнаў пры допыце толькі заданне ўзарваць тартак у мястэчку Азёрах. Дарэчы, у дакуменце ўзгадваецца, што Адаменя і Канстанцін Шыгаловіч пазнаёміліся яшчэ раней у турме. Тэрарыстычныя планы, калі яны і існавалі, так, на шчасце, і не былі выкананы. Можна меркаваць, што асобы, якім яны былі даручаны, разумелі маштаб наступстваў ад іх рэалізацыі і не гарэлі жаданнем выконваць такія загады.

Паказанні Шыгаловіча выклікалі ланцуг арыштаў удзельнікаў беларускай канспірацыі. Найперш былі арыштаваны Пётр Адаменя, Пётр і Васіль Юрэчкі, Мікалай, Павел і Уладзіслаў Апонікі. Пад час вобыску ў Васіля Юрэчкі былі знойдзены: „8 pocztówek z napisem w języku białoruskim: „Niech żyje białoruska narodowa republika", i z wizerunkami białoruskich województw: Wileńskiego, Brzeskiego, Mińskiego, Trockiego, Połockiego, Witebskiego, Mścisławskiego, Smoleńskiego i Nowogródzkiego, a nadto białoruski kalendarz na r. 1922, w którym podaje się, że część terytorium państwowego Polski winna wejść w skład Białorusi"[44]. Тут варта адзначыць, што Васіль Юрэчка, жыхар Гродна, яшчэ да паўстання беларуска-літоўскай партызанкі быў сябрам Беларускай Моладзевай Грамады ў Гродне і з таго часу мог мець такія паштоўкі і мапы.

Ноччу з 22 на 23 ліпеня 1922 г. у маёнтку Лецішчы Скідзельскай гміны быў пашкоджаны выбухам гранаты лакаматыў вузкакалейкі

43 Тамсама.

44 Тамсама, l. 117.

для перавозкі лесу. Паліцыя абвінавацiла ў гэтай дыверсii Мiхала Хацяна i братоў Яна i Аляксандра Багатырэвiчаў[45]. У турэмнай камеры да Яна Багатырэвiча падсадзiлi „стукача" Зыгмунта Масiеўскага, якi пасведчыў, што „siedząc w jednej celi z Janem Bogatyrewiczem, dowiedział się od niego, że ten ostatni ma zakopane w swym ogrodzie 2 granaty i 2 rewolwery, nadto, że Bogatyrewicz jemu się przyznał, iż rzucał granaty pod jakaś kolejko"[46]. Цiкавым ёсць факт, што браты Багатырэвiчы паходзiлi з дробнай шляхты ваколiцы Сiкорыца. Такiм чынам, да беларускага партызанскага руху далучалiся i асобы з гэтай сацыяльнай групы.

Неўзабаве палiцыя арыштавала каля 70 асоб, падазраваных у прыналежнасцi да партызанкi[47]. Многiя з арыштаваных на першых допытах прызнавалi сваю вiну, некаторыя паказвалi месцы, дзе хавалi зброю, выбухоўку i агiтацыйную лiтаратуру. Але потым усе адмаўлялiся ад сваiх паказанняў, вытлумачваючы iх катаваннямi з боку палiцыi. Большасць арыштаваных паходзiла з розных гмiн Гродзенскага павета. Але сустракалiся i асобы з суседнiх паветаў. У Каняўскай гмiне Лiдскага павета былi арыштаваны Iгнат Бернатовiч i Дамiнiк Вiджбель, якiх палiцыя лiчыла камандзiрамi лакальных партызанскiх груп[48]. 1 верасня 1922 г. быў злоўлены ў Навадворскай гмiне Уладзiмiр Брыкач, збеглы з турмы ў Гродне, якога падазравалi ў нападзе на Глыбокае. Брыкач прызнаўся, што сапраўды быў у Мерачы i адбыў 2-тыднёвыя вучэннi, але пазней адтуль уцёк i хаваўся ў лесе каля сваёй вёскi. Брыкач выдаў палiцыi цэлую групу людзей, а перад сваiм арыштам падкiнуў палiцыянтам спiс партызанаў, прозвiшчы якiх ведаў.

На падставе паказанняў Канстанцiна Шыгаловiча быў арыштаваны жыхар вёскi Новы Востраў Сакольскага павета Юзаф Мiшчук, якi паведамiў палiцыi, што быў завербаваны Аляксандрам Станкевiчам. Разумовiч-Хмара нiбыта даручыў Мiшчуку ўзарваць штаб II дывiзii польскiх войскаў i вайсковыя склады ў Беластоку[49].

У кастрычнiку 1922 г. у прыналежнасцi да партызанкi быў абвiнавачаны i арыштаваны жыхар вёскi Бершты Аляксандр Мiлiнкевiч. Паводле паведамлення Аддзела II Генеральнага Штаба, „na mocy poufnych informacji Milinkiewicz jest organizatorem oddziałów partyzanc-

[45] Тамсама, l. 122 v — 123.
[46] Тамсама, l. 123.
[47] Тамсама, l. 14.
[48] Тамсама, l. 119 адв. — 120.
[49] Тамсама, арк. 69 адв.; „Беларуская доля", 1925, № 31, с. 3.

kich białoruskich i wywiadowcą, często jeździ do sztabu IV grupy partyzantów w Mereczu na Litwie, gdzie cały czas spędza z naczelnikiem tego sztabu Razumowiczem [...] również często przebywa w towarzystwie agentów Razumowicza; partyzanci w Mereczu nazywają Milinkiewicza „swoim człowiekiem", który im dużo pomaga". Мілінкевіч на допыце прызнаў, што бываў у сваім прыватным інтарэсе ў Мерачы і атрымліваў пропуск у штабе партызанаў, а Разумовіч-Хмара прапанаваў яму працаваць на партызан і здабываць інфармацыю пра польскія войскі ў Гродне, але ён адмовіўся[50]. Мілінкевіча неўзабаве выпусцілі з турмы, і ён адразу ўцёк у Літву. З матэрыялаў пазнейшага суда над партызанамі ў Гродне вынікала, што ён спрабаваў уцячы ўжо пад час арышту, але быў затрыманы і пакусаны паліцэйскім сабакам. Неўзабаве Мілінкевіч вярнуўся ў сваю вёску, бо ў 1925 г. ён ужо працаваў памочнікам гміннага пісара ў Берштах, а пасля звальнення з прычыны палітычнай нядобранадзейнасці перабраўся ў Гродна, дзе працаваў у мясцовым аддзяленні апазіцыйнага штотыднёвіка „Gazeta Chłopska", на той час органа сялянскай партыі Stronnictwo Chłopskie. Перад Першай сусветнай вайной Мілінкевіч жыў у Сант-Пецярбургу і працаваў на чыгунцы. Пасля выбуху рэвалюцыі прыехаў разам з жонкай у родную вёску, дзе стаў уплывовай асобай у мясцовым грамадстве.

11 лістапада 1922 г. у гміне Марцінканцы быў затрыманы ад'ютант Разумовіча-Хмары, Уладзімір Бортнікаў[51]. У часе допыту паказаў на многіх партызанаў, праўда, тых, якія ўжо былі затрыманы. Бортнікаў стаў адным з галоўных абвінавачаных на пазнейшым судовым працэсу супраць партызанаў у Гродне.

Таксама быў арыштаваны жыхар гміны Марцінкаўцы яўрэй Арон Кобраўскі, які разносіў партызанскія пракламацыі[52]. Меў ён усяго 16 гадоў. Цікава, што ў доме яго бацькі месціўся гмінны паліцэйскі пастарунак. Дом Кобраўскіх лічыў 9 пакояў і асобную кухню, з якіх 4 пакоі былі прызначаны для паліцыі[53]. Мясцовы камендант пісаў пра Кобраўскага-старэйшага, як пра „osobnika b[ardzo] podejrzanego, któremu udowodniono, że ma kontakt z partyzantami białoruskimi w Mereczu, a jego najstarszy syn pracował czas dłuższy w sztabie IV grupy partyzantów u Chmary"[54].

[50] LCVA, f. 127, a. 1, b. 84, l. 15.
[51] Тамсама, l. 123 v.
[52] Тамсама, l. 124.
[53] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 89, арк. 105.
[54] Тамсама.

Самая брутальная акцыя партызанаў здарылася 25 лістапада 1922 г., калі яны застрэлілі ў вёсцы Шумы Аляксандра Сяргейчыка і Вінцэнта Язэпчыка, якіх падазравалі ў супрацоўніцтве з польскай паліцыяй[55]. У выкананні гэтага забойства быў абвінавачаны жыхар той жа вёскі Леанард Казюкевіч. Камендант паліцыі Гродзенскага павета прапанаваў пасля гэтага здарэння „natychmiast obsadzenie przez Władze Wojskowe pasa neutralnego z Litwą, gdyż straż graniczna nie jest w możności dopilnowania, by bandyci nie przekraczali pasa neutralnego z powodu zbyt odległo stojących jedna od drugiej placówek”[56].

Найбольш аддаленую ад Мерачы партызанскую групу на мяжы Лідскага і Слонімскага павета арганізаваў Ігнат Шэршань з вёскі Руда Ліпічанская Лідскага павета, „rzekomy nauczyciel, były oficer armii rosyjskiej będący w okresie przedwyborczym w kontakcie z eserami białoruskimi w Wilnie i Kownie, następnie z posłem Owsiannikiem”[57]. Да яго далучыўся Ян Місевіч з вёскі Галынка Арлянскай гміны Лідскага павета, які быў у 1922 г. схоплены і расстраляны разам з двума іншымі партызанамі ваенна-палявым судом. Пра акалічнасці гэтай справы нам невядома. У маі 1923 г. слонімская паліцыя затрымала Яна Суботніка, у якога знайшла рэвальвер „Маўзер”. Суботнік пад час допыту выдаў месца схованкі групы Шэршаня, якая ўжо ажыццявіла некалькі дыверсій. Паліцыя на чале з камендантам Слонімскага павета Марыянам Макавецкім акружыла гэтае месца, дзе хаваліся Шэршань разам з яго таварышамі Юліянам Белашам і Базылём Крупіцай. У выніку ўзніклай перастрэлкі ўсе трох былі забіты[58].

На пачатак 1923 г. пракурор акруговага суда ў Гродне пісаў у Вільню, што „ilość osób postawionych w stan oskarżenia obecnie przekracza liczbę 200 i jeśli nadal sprawa ta tak się rosnąć będzie, to przejdzie ponad 300 i więcej. Osadzonych w więzieniu znajduje się około 60-ciu”[59]. Паліцыя прымяняла жорсткія метады допытаў арыштаваных. Пра гэта выступіў з заявай беларускі пасол у Сейме Сымон Рак-Міхайлоўскі, які гаварыў пра жыхара вёскі Бершты 25-гадовага Мікалая Сяргейчыка: „Ужо прайшло 20 месяцаў, як ён сядзіць у горадзенскай турме і судовага разгляду яшчэ не было. Як паведаміла мне ў гмаху акруговага суду ў Горадні 19 студзеня 1924 г. яго цешча Ганна Валентукевічава ў прысутнасьці сьведкаў, пры арыштаваньні М. Сяргейчыка

55 LCVA, f. 127, a. 1, b. 84, l. 26.
56 Тамсама.
57 Тамсама, l. 30 v.
58 Тамсама.
59 Тамсама, l. 65 v.

зьбілі да непрытомнасьці; разкрыжавалі яго на сьцяне, трымалі яго за рукі, а паліцыя і вывядоўцы білі галавой у грудзі; клалі яго на лаву, прывязвалі і білі нагайкамі; лежачаму зьвязвалі ногі, прасоўвалі кій пад перавязкай, уздымалі ўверх і білі жалезнымі прутамі ў падэшвы; нарэшце ставілі яго босага на гарачую бляху. Такія катаваньні стасуюць у Горадні ў паліцыйным урадзе, які месьціцца пры вул. Кірхавай. На працягу 5 месяцаў пасьля арышту не дазвалялі яму бачыцца з роднымі, пакуль не загаіліся яго раны і знакі біцьця і катаваньня”[60]. Беларускі пасольскі клуб яшчэ неаднаразова падаваў інтэрпэляцыі да польскага ўрада і адпаведных міністраў у справах катаванняў арыштаваных сялян.

На думку Тамаша Блашчака, апошнім эпізодам дзейнасці партызанаў быў „працэс 45”, названы першым беларускім палітычным працэсам у ІІ Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў Беластоку ў маі 1923 г. На лаву падсудных трапілі многія арганізатары беларускай канспірацыі, а таксама яе шараговыя ўдзельнікі. Сярод абвінавачаных было сем настаўнікаў, некалькі былых афіцэраў расійскай арміі, інжынер, фельчар, некалькі гандляроў і работнікаў, але найбольш сялян — 22[61]. Да іх былі далучаны беларускія паслы ў польскім Сейме — Сяргей Баран і Сымон Якавюк (апошні, праўда, паспеў збегчы ў Літву), а таксама Вера Маслоўская-Матэйчук. У выніку дваццаць асоб атрымалі розныя турэмныя тэрміны (Маслоўская і Баран атрымалі па 6 год зняволення), а дваццаць пяць (у тым і пасол Якавюк) былі апраўданы.

Тамаш Блашчак лічыць, што „працэс 45” адбываўся ўжо ў момант, калі партызанская арганізацыя была зліквідавана літоўскім бокам, але паслужыў добрай падставай для дыскрэдытацыі ўсяго беларускага руху ў вачах грамадства ІІ Рэчы Паспалітай, паколькі апошні паказаў сваю сілу і магчымасці ўплыву на насельніцтва на парламенцкіх выбарах увосень 1922 г. У гэты ж час пачалі пашырацца кантакты беларускіх партызанскіх камандзіраў з савецкай выведкай у Коўне, а зацікаўленасць да беларускай канспірацыі з боку літоўскіх улад наадварот слабела. Пад час з’езду ў Коўне 26-27 лютага 1923 г. было абвешчана аб стварэнні Беларускага стралецкага звязу, але яго дзейнасць была заблакавана фактычна адразу пасля ўтварэння[62]. У выніку змен

[60] Л. Глагоўская, *З дзейнасці беларускіх парламентарыяў на Гродзеншчыне ў 1922-1930 г.*, [у:] *Культура Гродзенскага рэгіёна: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа*, Гродна 2003, с. 134.

[61] Я. Мірановіч, *Уступ*, [у:] *У новай айчыне. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд*, Беласток 2001, с. 14.

[62] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej*, s. 244.

міжнароднай сітуацыі Літва страціла зацікаўленасць у падтрымцы беларускіх партызанаў. Як адзначыў Яўген Мірановіч, польска-літоўская вайна стала нерэальнай, паколькі Савет Лігі Нацый прызнаў у сакавіку 1923 г. усходнія межы Польшчы[63].

Ліквідацыя дэмаркацыйнай лініі на дзяржаўнай мяжы вельмі моцна ўскладніла перамяшчэнні саміх партызанаў, перанос зброі і агітацыйнай літаратуры. У выніку такога збегу акалічнасцей у красавіку 1923 г. пачалася фактычная ліквідацыя партызанскай арганізацыі. У групе IV у Мерачы на 10 красавіка 1923 г. служылі 7 афіцэраў-інструктараў, 2 ураднікаў і 167 партызанаў. З гэтага ліку 5 афіцэраў і 162 партызаны паходзілі з тэрыторыі, якая належала да польскай дзяржавы. Увесь штаб групы і 71 партызан лічылі сябе беларусамі. Амаль усе яны згадзіліся на далейшую службу ў літоўскай арміі. Але партызаны беларускай нацыянальнасці ўжо не былі патрэбны літоўскаму боку. Вячаслаў Разумовіч-Хмара прапаноўваў літоўскаму камандаванню, каб хаця б частку іх улучыць у склад асобнага беларускага батальёна. Тамаш Блашчак выказвае меркаванне, што частка партызанаў пасля расфармавання іх аддзелаў літоўскім камандаваннем перайшла пад кантроль савецкай выведкі. Беларускі стралецкі звяз спыніў сваю дзейнасць у ліпені 1923 г., хаця няма афіцыйных дакументаў аб яго ліквідацыі[64].

Разумовіч-Хмара дамовіўся з савецкім бокам аб пераходзе часткі партызанаў на тэрыторыю СССР. Гэтая ідэя была рэалізавана ў чэрвені 1923 г. Разумовіч-Хмара з задавальненнем пісаў у сваёй кнізе, што ўратаваў ад рэпрэсій польскіх улад 89 партызанаў, якія здолелі перайсці савецкую мяжу[65]. Пра гэты эпізод з гісторыі беларуска-літоўскай партызанкі сведчыў інцыдэнт, які адбыўся блізу польска-савецкай мяжы 7 чэрвеня 1923 г. У той дзень 15-гадовы Антон Зуеўскі з вёскі Сасёнкі Рубяжэвіцкай гміны заўважыў на ўскрайку лесу некалькі чалавек, узброеных у карабіны і ручныя гранаты. Адзін з іх падышоў да хлопца і спытаў, як прайсці да мяжы, а таксама папрасіў хлеба і масла, даўшы таму 2 долары. Зуеўскі распавёў пра гэта сваім бацькам, якія тут жа завядомілі каменданта памежнай аховы Пржыбыльскага. Той з 5 жаўнерамі спрабаваў затрымаць падазроных, але апошнія зрабілі ў іх бок некалькі стрэлаў і кінулі гранату. Адзін падазроны быў усё ж затрыманы (ім аказаўся жыхар вёскі Бершты Гродзенскага

63 Я. Мірановіч, *Навейшая гісторыя Беларусі*, с. 85.
64 T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej*, s. 245.
65 М. Шчур, *Вялікі няўдачнік. Вячаслаў Разумовіч-Хмара. «Грымасы ўсясьветнай вайны». Трылёгія («Зманлівы сьвет», «Бяз маскі», «Куюцца кайданы», 1930-1937)*, <http://niamiesta.se/archiu/november2009/razumovich/razumovich.html>.

павета Максім Шаставіцкі), другі, цяжка паранены ў сутычцы, хутка памёр, а рэшта здолела ўцячы ў кірунку мяжы. Затрыманы Максім Шаставіцкі прызнаў, што належыць да беларуска-літоўскіх партызанаў і служыў у Мерачы пад началам Разумовіча-Хмары[66]. У Шаставіцкага знайшлі легітымацыю на літоўскай мове. Неўзабаве паблізу мяжы затрымалі яшчэ аднаго партызана — Юліяна Мініна, жыхара Віцебска. З паказанняў Шаставіцкага і Мініна вынікала, што Група IV у Мерачы, якая налічвала каля 150 чалавек, атрымала ў канцы мая 1923 г. загад пераходу асобнымі аддзеламі па 15-20 чалавек праз Польшчу ў СССР. Кожнай такой групе выдавалася сума па 100 долараў[67]. Блізу мяжы яны павінны былі раздзяліцца на яшчэ меншыя групкі па 4-5 чалавек.

Максім Шаставіцкі прызнаў, што ў жніўні 1922 г., загітаваны праз нейкага Васілевіча, ён пайшоў у Мерач, дзе ўступіў у шэрагі партызанаў і атрымаў псеўданім „Рыбакоў”. Партызанаў у Мерачы, па яго словах, было каля 200, падзеленых на 10 узводаў. На чале ўсёй групы да сакавіка 1923 г. знаходзіўся Разумовіч-Хмара, а пасля яго пераводу ў Коўна ў галоўны штаб партызанаў начальнікам стаў нейкі літоўскі афіцэр. Шэфам аперацыйнага аддзела ў Мерачы быў спачатку капітан Дабравольскі, а ад снежня 1922 г. — літоўскі паручнік Здэмцэвіч. Мэтай групы, як павучаў партызанаў Разумовіч-Хмара, было ў момант выбуху польска-літоўскай вайны паўстанне беларусаў і атакі на тылы польскіх войскаў[68].

У маі 1923 г. партызанка была зліквідана, частка шараговых байцоў уключана ў склад літоўскіх памежнікаў, астатнія ў лічбе 150 чалавек з дапамогай Разумовіча-Хмары рушылі ў Савецкі Саюз. З Максімам Шаставіцкім ад пачатку ішлі 16 партызанаў. Імі камандавалі 5 „раяновых”, якія мелі рэвальверы і ручныя гранаты, астатнія зброі не мелі зусім. Праз 5 дзён група Шаставіцкага дайшла да савецкай мяжы, дзе падзялілася на групкі па 3-5 чалавек. У сутычцы з польскімі памежнікамі, калі Шаставіцкага і затрымалі, быў смяротна паранены партызан па прозвішчу Матэйчук. У Шаставіцкага знайшлі фотаздымкі, як яго самога, так і іншых партызанаў, а таксама пасведчанне на імя Максіма Шаставіцкага, што ён служыў у партызанах ад чэрвеня 1922 г. па май 1923 г. і „służbę pełnił sumiennie i gorliwie”[69]. Варта падкрэсліць, што Максім Шаставіцкі не выдаў нікога са сваёй вёскі Бер-

[66] LCVA, f. 127, a. 1, b. 84, l. 33.
[67] Тамсама, l. 33 v.
[68] Тамсама, l. 130 v.
[69] Тамсама, l. 13.

шты, хаця ў партызанах было некалькі дзясяткаў яго аднавяскоўцаў, узгадаўшы толькі некага Васілевіча.

Адным з апошніх быў арыштаваны жыхар вёскі Бершты Міхал Сяргейчык. 6 жніўня 1923 г. ён сам прыйшоў на пастарунак паліцыі ў Берштах. Сяргейчык прызнаўся, што ўступіў у шэрагі партызанаў, але потым папрасіў перавесці яго ў беларускі батальён, дзе і праслужыў пад псеўданімам Пятрэнка да расфармавання батальёна. Меў на руках пасведчанне на прозвішча Пятрэнка і службовы атэстат, выдадзены камандаваннем батальёна, што службу ён выконваў належным чынам[70]. Нікога з аднавяскоўцаў, якіх шмат было ў партызанах, Сяргейчык не выдаў.

Паліцыя працягвала праводзіць аблавы супраць партызанаў і ўвосень 1923 г., але ўжо без асаблівага імпэту. Напрыклад, 20 лістапада павятовы камендант накіраваў 4 следчых з Гродна для правядзення аблавы на партызанаў сумесна з паліцыяй гмін Марцінканцы, Друскенікі і Бершты. Але тыя следчыя на места не выехалі, бо... спазніліся на цягнік[71].

Такім чынам, найбольшую падтрымку з боку вясковага насельніцтва беларуска-літоўскія партызаны атрымалі менавіта ў Берштаўскай гміне Гродзенскага павета. Несумненна, што адным з галоўных чыннікаў было памежнае становішча гэтай вялікай і пакрытай лесам гміны. Наяўнасць дэмілітарызаванай зоны дазваляла мясцовым жыхарам амаль свабодна перасякаць дзяржаўную мяжу, праносіць зброю і агітацыйныя матэрыялы. Але галоўным чыннікам былі тыя змены ў свядомасці насельніцтва, якія адбыліся ў часе Першай сусветнай вайны і расійскай рэвалюцыі. Паводле даных польскай адміністрацыі ў 1915 г. каля 60% насельніцтва Берштаўскай воласці выехала ў бежанства на ўсход, а вяртанне ў родныя вёскі расцягнулася да пачатку 1920-х гадоў. Бежанцы, якія вярталіся дадому з Расіі, прыязджалі ўжо ў новую польскую дзяржаву. Іх чакалі тут разбураныя вайной гаспадаркі і надзвычай цяжкія ўмовы жыцця.

У снежні 1919 г. новая польская ўлада правяла перапіс насельніцтва, які ўлічваў яго нацыянальны і канфесійны склад. У Берштаўскай гміне тады налічвалася 5905 жыхароў[72]. Сярод іх пераважалі беларусы — 67,4% насельніцтва, палякі складалі 22,3%, літоўцы — 8%, яўрэі — 2,3%. Паводле канфесійнай прыналежнасці насельніцтва

[70] Тамсама, l. 130.
[71] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 89, арк. 89.
[72] E. Romer, *Spis ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (grudzień 1919)*, Lwów — Warszawa 1920.

размяркоўвалася наступным чынам: праваслаўныя — 66,7%, каталікі — 31,0%, іудзеі — 2,3%.

Паводле даных усеагульнага перапісу насельніцтва 1921 г. у гміне Берշты налічвалася 6119 жыхароў, сярод іх 3002 мужчыны і 3117 жанчын. Паводле нацыянальнай прыналежнасці беларусаў было 4121 (67,3%), палякаў — 1418 (23,2%), літоўцаў — 472 (7,7%), яўрэяў — 58, расіян — 50 (расіянамі з невядомай прычыны запісаліся жыхары невялікай праваслаўнай вёскі Бабіна). Паводле канфесійнай прыналежнасці склад насельніцтва выглядаў наступным чынам: праваслаўныя — 4244 (69,4%), каталікі — 1767 (28,9%), іудзеі — 108 (1,8%)[73].

Падзеі вайны і рэвалюцыі далі моцны штуршок росту палітычнай і нацыянальнай самасвядомасці беларускіх і літоўскіх сялян у гэтай мясцовасці, як тых, хто апынуўся ў бежанстве, так і тых, хто заставаўся на радзіме. Сын мясцовага палясоўшчыка Аляксандр Сініла 15-16 снежня 1918 г. прыняў удзел у з’ездзе сялян Гродзеншчыны. Сініла быў у бежанстве ў расійскім горадзе Яраслаўлі, дзе працаваў у земстве па справе сельскагаспадарчага перапісу, а пазней вучыўся на курсах землямерных тэхнікаў пры зямельна-тэхнічнай частцы яраслаўскага Савета дэпутатаў. Вярнуўся дахаты, дзе быў прызначаны нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй ляснічым у Берштаўскае лясніцтва і адначасова уступіў, паводле ўласных слоў, у літоўска-беларускую арганізацыю. Пасля ўсталявання польскай улады Сініла таксама атрымаў прапанову стаць ляснічым, але адмовіўся, як сам сцвярджаў, з ідэйных меркаванняў. У кароткім часе існавання ў Берштах савецкага рэўкама ўзначальваў зямельны аддзел і прасіў прызначыць яго ляснічым[74].

У часе нямецкай акупацыі ў Берштах пачала дзейнічаць беларуская школа, у якой настаўнічаў брат Аляксандра Сінілы, Уладзімір. Яшчэ адзін настаўнік з Берштаў Пётр Васілевіч пісаў у красавіку 1919 г. у гродзенскую газету „Беларусь”, што ў яго вёсцы частка жыхароў з энтузіязмам успрыняла школу з беларускай мовай выкладання, а частка жадае навучання па-расійску, як было перад вайной. Пасля ўсталявання ў 1919 г. польскай улады беларуская школа ў Берштах была зачынена.

Уладзімір Сініла скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю і яшчэ да вайны з 1912 г. працаваў настаўнікам Берштаўскага народ-

[73] *Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej, opracowany na podstawie wyników pierwszego powszechnego spisu ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych*, t. V: *Województwo białostockie*, Warszawa 1924, s. 30.

[74] ДАГВ, ф. 689, воп. 1, спр. 70, арк. 24-24 адв.

нага вучылішча. У часе вайны быў на фронце і атрымаў чын штабс-капітана расійскай арміі. Прасіў бальшавіцкі рэўкам у жніўні 1920 г. прызначыць яго настаўнікам, пісаў у прашэнні, што „был учителем в этой же школе по преподаванию белорусского языка в 1919 г., где школа была закрыта польскими властями, а все книги и школьное имущество были реквизированы”[75]. Цікава, што ў той час 11 жыхароў Берштаўскай воласці выказалі жаданне працаваць настаўнікамі беларускіх школ.

15 лістапада 1924 г. камендант паліцыі гміны Бершты Аляксандр Сламчынскі склаў спіс асоб, якія на той час нелегальна знаходзіліся за мяжой. Можна з упэўненасцю сцвердзіць, што большасць у гэтым спісе з 47 чалавек складалі ўдзельнікі беларуска-літоўскай партызанкі. З іх ліку 26 чалавек ужо перабраліся ў СССР, а астатнія заставаліся ў Літве[76]. Гэта былі маладыя хлопцы і мужчыны ва ўзросце ад 16 да 37 гадоў. Сярод іх бачым і трох настаўнікаў.

Клімент Русілка, паводле ўспамінаў доўгажыхароў вёскі Бершты, належаў да мясцовых лідараў партызанскага руху. Ён вучыўся ў беларускай настаўніцкай семінарыі ў Свіслачы, арганізаванай Баляславам Пачопкам у 1916 г., меў пасведчанне Гродзенскай цэнтральнай вучыцельскай рады ад 26 верасня 1919 г., што скончыў 2 класы гэтай семінарыі, падпісанае Лукашам Дзекуцем-Малеем[77]. У спісе паліцэйскага каменданта месцам пражывання Клімента Русілкі на 1924 г. пазначаны горад Барысаў у БССР. Там ён скончыў педагагічны тэхнікум, пасля працаваў загадчыкам аддзелаў народнай адукацыі ў некалькіх раёнах Савецкай Беларусі. Быў рэпрэсаваны ў 1937 г. і расстраляны ў студзені 1938 г.

Аднавясковец Русілкі Пётр Васілевіч меў пасведчанне на званне народнага вучыцеля, выдадзенае яму папячыцелем Петраградскай навучальнай акругі 15 ліпеня 1911 г. У 1919 г. Васілевіч быў слухачом кароткачасовых Беларускіх вучыцельскіх курсаў у Вільні, на якіх „слухаў лекцыі Беларускае мовы, Беларускае літаратуры, гісторыі Беларусі, географіі Беларусі, педагогікі і дыдактыкі, пяяньня, кооперацыі і тэатру”. Атрымаў пасведчанне з запісам: „Можа займаць урад

[75] Тамсама, арк. 137-137 адв.

[76] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 42, арк. 226-229. Паводле ўспамінаў жыхаркі вёскі Бершты Вольгі Восіпаўны Шаставіцкай (1908 г. н.) „спярва іх [партызанаў — С. Т.] Літва брала, моладзеж пайшла на Літву, але Літва не прыняла, усе яны пайшлі ў Мінск, а там іх у турму пасадзілі на 10 лет”. Успаміны запісаны ў ліпені 2001 г. Запісы ўспамінаў знаходзяцца ў асабістым архіве аўтара.

[77] ДАГВ, ф. 689, воп. 1, спр. 70, арк. 117.

вучыцеля ў беларускай школе". Кіраўніком курсаў быў ксёндз Адам Станкевіч, а лектарамі — Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі, Клаўдзі Дуж-Душэўскі[78]. У 1919 г. Пётр Васілевіч друкаваўся ў гродзенскай беларускай газеце „Беларусь". У 1924 г. яму было ўжо 33 гады, і, па звестках польскай паліцыі, ён знаходзіўся ў Маскве.

Яшчэ адным настаўнікам быў Міхал Розмысл з вёскі Сухары, які да вайны вытрымаў экзамен на курс павятовага вучылішча, скончыў гідратэхнічныя курсы і працаваў настаўнікам у прыватнай сялянскай школе ў вёсцы Сухары і настаўнікам падрыхтоўчага аддзялення ў берштаўскім народным вучылішчы[79]. У кароткім перыядзе бальшавіцкай улады ўзначальваў аддзел народнай адукацыі ў Берштаўскім валасным рэўкаме.

З вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што лёс большасці партызанаў, якія перайшлі ў Савецкі Саюз, быў трагічным. Ва ўмовах „вялікага тэрору" ў 1937-1938 гг. яны сталі ідэальнымі кандыдатамі на польскіх і літоўскіх шпіёнаў. І звесткі пра рэпрэсіі даходзілі да іх сваякоў у Берштах, што занатоўвалі ў сваіх справаздачах і мясцовыя каменданты паліцыі.

Беларуска-літоўская партызанка не мела ніякіх шансаў на поспех. Прычына яе паражэння была даволі трапна вызначана аналітыкам польскага генштаба: „Мясцовы аседлы селянін мае ўжо досыць усялякай няпэўнасці, таму перспектыва новай магчымай вайны ці нейкіх завірух на яго зямлі пагражае яму канчатковым зруйнаваннем усяго, што ў яго яшчэ пасля апошніх войнаў засталося, і таго, што ён паспеў адбудаваць(...) Тутэйшыя сяляне падтрымаць планы [паўстанцаў — С. Т.] насуперак сваім жыццёвым інтарэсам не маглі, этнаграфічная ж беларускасць іх аказалася чыннікам роўным нулю з пункту погляду здольнасці іх да задуманай акцыі насуперак іх жыццёвым інтарэсам"[80].

У красавіку-траўні 1925 г. у Гродне адбыўся судовы працэс, на якім 72 асобы былі абвінавачаны ў прыналежнасці да партызанскага руху. Амаль усе абвінавачаныя з'яўляліся сялянамі Гродзенскага павета. Сярод іх, паводле нацыянальнасці, налічвалася 40 беларусаў, 20 літоўцаў, 4 палякі і 1 яўрэй[81]. Яшчэ да суду пяцёра абвінавачаных — Антон Венцусь, Адольф Грык, Клеманс Валянкевіч, Эдвард Гайдзіс,

[78] ДАГВ, ф. 689, воп. 1, спр. 70. арк. 135.
[79] Тамсама, арк. 111.
[80] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей: ДАБВ), ф. 67, воп. 1, спр. 22, арк. 29-30.
[81] „Беларуская доля", 1925, № 29, с. 1-2.

Мікола Рудзяк памерлі ў астрозе, а яшчэ адзін — Аляксандр Басько, звар'яцеў. У лютым 1924 г. Эдвард Гайдзіс, Ігнат Бернатовіч, Ян Валангевіч і Дамінік Віджбель напісалі ў беларускі пасольскі клуб скаргу на катаванне[82]. Цікава, што сведкам на працэсе ў Гродне быў таксама галоўны сведка на беластоцкім працэсе супраць партызанаў Эдвард Лянкевіч, на той час ужо следчы ў гродзенскай паліцыі. Лянкевіч сцвярджаў, што ў партызанскім штабе ў Мерачы працавалі, апроч літоўскіх, і нямецкія афіцэры.

Да розных тэрмінаў зняволення судом былі прыгавораны 30 асоб. Самы суровы прысуд — 12 гадоў катаргі, атрымаў Леанард Казюкевіч, абвінавачаны ў падвойным забойстве ў вёсцы Шумы. Да 6 гадоў катаргі быў прыгавораны памочнік Разумовіча-Хмары, Уладзімір Бортнікаў. Па 4 гады катаргі атрымалі асобы, якіх прызнана камандзірамі мясцовых партызанскіх аддзелаў — Пётр Адаменя, Базыль Юрэчка, Ігнат Бернатовіч, Фларыян Туроніс, Дамінік Віджбель, Ян Суботнік. Астатнія атрымалі ад 3 да 1,5 года папраўчага дому[83].

Мясцовыя ўлады і шавіністычныя польскія асяродкі імкнуліся выкарыстаць судовы працэс у Гродне, так жа як раней працэс у Беластоку, для дыскрэдытацыі ўсяго беларускага руху. Асабліва непрыемным для мясцовых шавіністаў з'яўлялася параўнанне беларускай партызанкі з польскім збройным рухам супраць расійскай улады. Таму ўдзельнікаў партызанкі публіцысты гэтага кірунку паказвалі як безыдэйных, амаральных тыпаў. Прыкладам можа паслужыць рэпартаж з залы суда ў гродзенскай газеце „Nadniemeński Kurjer Polski", аўтар якога так ахарактарызаваў абвінавачаных: „«To» zaś co siedzi na ławie oskarżonych, po odrzuceniu balastu, który w ogóle nie wie za co pokutuje, jest zbiorowiskiem, któremu doprawdy z trudnością przyszło by skonkretyzować hasła, w imię którego zajmuje ławę oskarżonych"[84]. Аўтар сцвярджаў, што можна дашукацца шмат прычын, якія прывялі абвінавачаных да ўступлення ў партызанскую арганізацыю, ад звычайнай глупоты да вельмі брыдкіх рэчаў, а „więc wszystkiego prócz ideowości, która byłaby w tym wypadku istotnym niebezpieczeństwem i jednocześnie wzbudzałaby szacunek". Аўтар таксама выказваў захапленне працай паліцыі, якая выратавала „spokojną ludność kresową" ад тэрору гэтай „банды".

І тут паўстае пытанне: наколькі важную ролю ў развіцці партызанскага руху адыгрывала менавіта беларуская нацыянальная самасвя-

[82] LCVA, ф. 127, a. 1, b. 84, l. 79.
[83] „Беларуская доля", 1925, № 32, с. 2-3.
[84] „Nadniemeński Kurjer Polski", 1925, nr 115, s. 1.

домасць? З аналітычнай запіскі афіцэра польскага генштаба вынікае, што антыўрадавыя агітатары найперш падкрэслівалі сацыяльныя аспекты сялянскіх праблем: „Ведаючы псіхалогію селяніна — беларускія агітатары ўмеюць прамовіць да зацвярдзелага сэрца люду — катаванага пад час звароту да праваслаўя ў 1839 г. і ў часе нацыянальных паўстанняў (меліся на ўвазе паўстанні 1831 г. і 1863 г. — С. Т.). Агітуючы, „добразычліўцы" народу б'юць у слабую струнку селяніна: нядолі сялянскай, вінаватыя ў гэтым „паны", а паколькі з бальшавіцкага раю вярнулася шмат згаладалых, бяздомных і абрабаваных сялян, агітацыя знайшла ў гэтай сферы адпаведную глебу"[85]. Аднак тая ж аналітычная запіска афіцэра генштаба сведчыла і пра дастатковую пашыранасць менавіта беларускай нацыянальнай агітацыі: „Народная школа, духавенства, легальны і нелегальны друк, вусная агітацыя — усё гэта ліхаманкава працавала над укшталтаваннем, навучаннем і прыгатаваннем шырокіх сялянскіх мас да масавай антыпольскай збройнай акцыі. (...) Таксама ў часе выбараў (люты б.г.) моцна пашыраліся звесткі аб збройным аднаўленні Беларусі праз беларускія атрады. Брашуры, адозвы, а таксама антыпольская прэса (амаль яўна) пашыраліся далёка за межы плебісцытавай Віленшчыны, і паўсюдна падмацоўвалі незадаволенасць кіраваннем „польскіх паноў", а таксама агітавалі за далучэнне Беларусі да Літвы"[86]. Праўда, у дадзенай запісцы падкрэслівалася, што праграма прылучэння Беларусі да Літвы знайшла мала прызнання сярод беларускіх мас і нават амаль не парушалася ў непасрэднай агітацыі: „Цвярозы сэнс беспамылкова гаварыў тым масам, што гэтая праграма магла ажыццявіцца толькі шляхам новай, канчаткова руйнуючай край збройнай завірухі — а таму была для іх непрымальнай"[87].

З прычыны недахопу крыніц цяжка дакладна рэканструяваць палітычную і нацыянальную свядомасць удзельнікаў антыпольскай партызанкі. У партызанскім друку пісалася найперш пра здзекі польскай улады над беларускімі сялянамі, а нацыянальна-дзяржаўная ідэя была слаба акрэсленай. Тамаш Блашчак лічыць, што ідэнтычнасць партызанаў надалей была заходнебеларускай, якая стаяла ў апазіцыі да польскасці і польскай дзяржаўнасці[88]. Яўген Мірановіч адзначаў, што „людзі нават не надта цікавіліся тым, пад якімі лозунгамі прапануецца ім змагацца з польскай дзяржавай, а найважнейшым ім было само змаганне"[89].

[85] ДАБВ, ф. 67, воп. 1, спр. 22, арк. 45.
[86] Тамсама, арк. 45-46.
[87] Тамсама, арк. 45.
[88] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej*, s. 239.
[89] Я. Мірановіч, *Уступ*, [у:] *Бежанства 1915 года*, Беласток 2000, с. 11.

І ўсё ж, як нам уяўляецца, не варта перабольшваць абмежаванасць кругагляду тагачасных сялян, якія шмат чаго пабачылі ў жыцці і дакладна не былі ідыётамі. Як сведчаць крыніцы, вяскоўцы абмяркоўвалі паміж сабой партызанскую агітацыю і тую сітуацыю, у якой апынуліся. Многія, асабліва людзі старэйшага ўзросту, былі супраць узброенай барацьбы. Доўгажыхары вёскі Бершты апавядалі гісторыі, як бацькі тапілі ў возеры карабіны сваіх сыноў. Але многія партызаны, як нам уяўляецца, усведамлялі, што змагаюцца менавіта за Беларусь, якая ўяўлялася ім ідылічнай сялянскай краінай без паліцыі, абшарнікаў і падаткаў. У агітацыйных дакументах шмат гаварылася пра незалежную беларускую дзяржаву. Напрыклад, на судовым працэсе ў Горадні была зачытана партызанская ўлётка на беларускай мове, у якой гаварылася: „трэ не дапускаць асаднікаў, што зямля беларускага насялення, што трэ выгнаць войска, і калі будзе свая Беларуская Народная Рэспубліка, дык і ўсё будзе для беларусаў"[90]. Партызанскі рух падтрымалі і некаторыя настаўнікі, якія складалі інтэлектуальную эліту сялянскага грамадства. Частка ж настаўнікаў аддавала перавагу легальнай дзейнасці. Адносна вышэйзгаданых братоў Аляксандра і Васіля Сінілаў, напрыклад, паліцыя не знайшла доказаў датычнасці да партызанкі.

Несумненна таксама, што беларуска-літоўская партызанка мела рысы сялянскіх войнаў, якія ўспыхвалі ў тыя гады ў многіх мясцінах былой Расійскай імперыі, як на поўдні Украіны (Махноўшчына), ці на Тамбоўшчыне. Для гэтага існаваў шэраг аб'ектыўных умоў, з якіх неабходна вылучыць надзвычай цяжкае эканамічнае становішча вёскі, выкліканае таксама бязлітаснай яе эксплуатацыяй з боку дзяржаўнай улады, і дэмаграфічную сітуацыю з высокім працэнтам моладзі ва ўзросце ад 15 да 30 гадоў. А галоўная прычына вынікала з істотных змен у ментальнасці сялян, а найперш той жа моладзі, якія адбыліся на працягу гадоў вайны і рэвалюцыі. Перажытае ў бежанстве і на фронце зрабіла вясковых хлопцаў дзёрзкімі і агрэсіўнымі, хаця гэтыя рысы праяўляліся і ў даваеннай вёсцы ў выніку працэсаў распаду традыцыйных нормаў паводзін. У асяроддзі сялянскай моладзі фармуецца культ героя-канспіратара, культ зброі і змагання. Погляды моладзі аднак не падзяляла большасць старэйшых жыхароў, якія захоўвалі вернасць традыцыйнай сялянскай ментальнасці і стратэгіі выжывання. Паводле гэтай ментальнасці, любы ціск знешняй сілы, тыя ж высокія падаткі, накладаныя польскай дзяржавай, трэба проста

[90] „Беларуская доля", 1925, № 32, с. 2-3.

ператрываць, пераждыць, бо супраціў толькі пагоршыць становішча, прывядзе да яшчэ большай бяды. Лепш пісаць скаргі, ці выкарыстоўваць ціхі супраціў — да апошняга не плаціць падаткі, спрабаваць падмануць чыноўнікаў і г.д.

З пункту гледжання часткі беларускіх актывістаў альтэрнатывай узброенай партызанцы з'яўлялася легальная палітычная і грамадская дзейнасць. Нягледзячы на безліч прыкладаў самаўпраўства мясцовых улад, магчымасці для такой дзейнасці існавалі. Выдатны шанц легальнай нацыянальнай агітацыі надавалі парламенцкія выбары восенню 1922 г., якія сталі першымі ў гісторыі ўсеагульнымі выбарамі для сялян Заходняй Беларусі. Лідары беларускіх арганізацый пастанавілі далучыцца да выбарчага Блока нацыянальных меншасцей. Дастаткова хутка ў сельскай мясцовасці аформіліся структуры, якія пачалі праводзіць агітацыю на карысць кандыдатаў гэтага блока. Напрыклад, у верасні 1922 г. у Гродне быў утвораны Беларускі выбарчы камітэт[91], а неўзабаве паўсталі лакальныя выбарчыя камітэты амаль ва ўсіх гмінах павета[92]. Гэта сведчыла пра дастатковую моц, разгалінаванасць і здольнасць да дзеяння структур беларускага палітычнага руху.

У Гродзенскай выбарчай акрузе беларускімі кандыдатамі па спіску № 16 (Блок нацыянальных меншасцей) сталі Сяргей Баран і ўжо вышэйзгаданы Аляксандр Сініла з Берштаў. У барацьбе за сялянскае насельніцтва беларускія дзеячы канкуравалі з камуністамі і польскімі партыямі левай арыентацыі. Выбарчую кампанію яны пастанавілі праводзіць пад наступнымі лозунгамі: „Хочаш, каб уся тутэйшая зямля дасталася тутэйшаму працоўнаму сялянству? Хочаш школы ў роднай мове? Хочаш, каб уся адміністрацыя была свая, тутэйшая, каб урадоўцамі былі нашы людзі? Хочаш служыць у войску ў сваім родным краю? Хочаш быць гаспадаром на сваёй зямлі, хочаш аўтаноміі нашага краю з сваім Соймам у Вільні?"[93] Прыведзеныя лозунгі выразна сведчылі пра імкненне беларускіх актывістаў выкарыстаць характэрную для сялянскіх лакальных супольнасцей свядомасць *тутэйшасці*, давер да *сваіх*, *нашых*, замілаванне малой айчынай ці *роднай* старонкай. У той жа час многія каталіцкія беларускамоўныя вёскі, дзе былі ў наяўнасці ўсе сацыяльныя праблемы мясцовага ся-

[91] Л. Глагоўская, *З дзейнасці беларускіх парламентарыяў на Гродзеншчыне,* с. 128.

[92] Тамсама, с. 129.

[93] „Беларускі звон", 1922, № 30, с. 2.

лянства, галасавалі, аднак, за польскія выбарчыя спісы, паколькі там беларуская нацыянальная свядомасць адсутнічала, нягледзячы на „простую” мову іх жыхароў.

У выніку выбараў, якія адбыліся 5 (сейм) і 22 (сенат) лістапада 1922 г., у польскі парламент прайшлі 11 беларускіх паслоў. У Гродзенскай акрузе на спісак № 16 прагаласавалі пад час выбараў у сейм 26 732 выбаршчыкі, а пад час сенацкіх выбараў — 10 541 (сенатараў выбірала меншае кола выбаршчыкаў). Вынікі астатніх партый і блокаў на выбарах у Сейм па гэтым павеце выглядалі наступным чынам: спісак № 1 (Polskie Stronnictwo Ludowe „Piast”) — 21 507, № 2 (Polska Partia Socjalistyczna) — 2892, № 3 (PSL „Wyzwolenie” i „Lewica Ludowa”) — 12 566, № 4 (Ogólnożydowski Związek Robotniczy) — 500, № 5 (Związek Proletariatu Wsi i Miast) — 4425, № 7 (Narodowa Partia Robotnicza) — 1125, № 8 (Chrześcijański Związek Jedności Narodowej) — 27 698, № 10 (Unia Narodowo-Państwowa) — 680, № 12 (Polskie Centrum) — 3425, № 20 (Żydowski Demokratyczny Blok Ludowy) — 111, № 23 (Narodowa Partia Pracy — 155, № 18 (Związek Inwalidów Wojskowych) — 271[94].

У партызанскай Берштаўскай гміне таксама дзейнічала аддзяленне Беларускага выбарчага камітэта[95]. У гміне былі створаны тры выбарчыя ўчасткі, прычым у склад усіх участковых камісій увайшлі мясцовыя адукаваныя беларусы, што гарантавала справядлівасць падліку галасоў. Вынікі выбараў па гміне былі наступныя: № 1 (Polskie Stronnictwo Ludowe „Piast”) — 204 галасы, № 2 (Polska Partia Socjalistyczna) — 2, № 3 („Wyzwolenie” i „Lewica Ludowa”) — 119, № 5 (Związek Proletariatu Wsi i Miast) — 35, № 7 (Unia Narodowo-Państwowa) — 3, № 8 (Chrześcijański Związek Jedności Narodowej) — 48, № 10 (Unia Narodowo-Państwowa) — 2, № 12 (Polskie Centrum) — 38, № 16 (Blok Mniejszości Narodowych) — 1064[96].

Такім чынам, за Блок нацыянальных меншасцей у Берштаўскай гміне аддалі свае галасы 70,2% тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі. На другім месцы аказалася PSL „Piast” — 13,5%, на трэцім PSL „Wyzwolenie” i „Lewica Ludowa” — 7,9%. За польскія палітычныя групоўкі левага кірунку PSL „Piast” і PSL „Wyzwolenie” і „Lewica Ludowa” галасавалі пераважна жыхары каталіцкіх беларускамоўных вёсак Новая Руда і Глушнева. Пераможца выбараў па ўсёй краіне і па Гродзенскай

[94] ДАГВ, ф. 59, воп. 1, спр. 6, арк. 27, 33.

[95] Л. Глагоўская, *З дзейнасці беларускіх парламентарыяў на Гродзеншчыне*, с. 129.

[96] ДАГВ, ф. 59, воп. 1, спр. 10, арк. 123, 129, 145.

выбарчай акрузе Chrześcijański Związek Jedności Narodowej атрымаў у Берштаўскай гміне толькі 3,2% галасоў. Камуністычны Związek Proletariatu Wsi i Miast здабыў яшчэ менш — 2,3%. За камуністаў прагаласавала частка выбаршчыкаў вёскі Сухары.

Калі ў маі 1923 г. беларускі пасол у Сейме Сяргей Баран на беластоцкім працэсе быў асуджаны на 6 гадоў турмы, на яго месца ў Сейме збіраўся заступіць Аляксандр Сініла, які быў у выбарчым спісе Блока нацыянальных меншасцей па Гродзенскай выбарчай акрузе ў 1922 г. Аднак улады абвінавацілі яго ў антыдзяржаўнай дзейнасці. Газета „Сын Беларуса" 9 ліпеня 1924 г. напісала: „30 чэрвеня ў Горадні на станцыі быў заарыштаваны праз паліцыю А. Сініла, кандыдат на дэпутата ў Сэйм, які павінен увайсьці ў склад Бел[арускага] Пас[ольскага] Клюбу на месца Сяргея Барана. Прычына арышту невядома. У хаце Сінілы быў праведзены вобшук, але нічога не знайшлі. Праз 5 дзён выпусьцілі пад залог у 200 злотых (...) факт арышту такого спакойнага, здавалася-б чалавека, як Сініла, дае нам шмат да разважаньняў і домыслаў"[97]. Аляксандр Сініла пазбегнуў суда, паколькі паліцыя не змагла знайсці доказаў яго антыдзяржаўнай дзейнасці, аднак дэпутатам Сейма ён таксама стаць не змог.

Пасля арышту Аляксандра Сінілы быў пазбаўлены пасады настаўніка беларускай школы ў вёсцы Матылі Берштаўскай гміны яго родны брат Уладзімір. Газета „Сялянская праўда" пісала ў лістападзе 1924 г., што жыхары вёскі Матылі ў 1921 г. падалі ўладам просьбу на адкрыццё беларускай школы. Прычым яны рашуча адмовіліся ад польскай дзяржаўнай школы. У канцы лютага 1922 г. Аляксандр і Уладзімір Сінілы прапанавалі матыльскім сялянам стварыць прыватную беларускую школу на ўласныя сродкі. Мясцовы актывіст Клімук Грымута прывёз канём з Вільні падручнікі на беларускай мове. Школа дзейнічала да лета 1924 г. і была зачынена пасля адхілення ад пасады настаўніка Уладзіміра Сінілы. Гэта была апошняя прыватная беларуская школка ў Гродзенскім павеце. Паводле інфармацыі паліцыянта Канстанціна Хохі, Уладзімір Сініла 28 красавіка 1926 г. нелегальна перайшоў у Літву[98].

Мясцовыя ўлады працягвалі лічыць партызанскую пагрозу рэальнай і ў 1924 г. 24 чэрвеня 1924 г. павятовы стараста пісаў каменданту паліцыі Гродзенскага павета: „Ruch separatystyczny białoruski, kierowany bezpośrednie z Wilna przez Grodno od połowy kwietnia r.b., to jest od dnia zjazdu działaczy białoruskich w Wilnie, — wzmógł się również

[97] „Сын Беларуса", 1924, № 12, с. 4.
[98] ДАГВ, ф. 38, воп. 1, спр. 19, арк. 223.

i dziś już nabiera wyraźnego charakteru akcji antypaństwowej łącznie z akcją komunistyczną. Głównym zadaniem przywódców ruchu białoruskiego jest opanowanie wsi. (...) Wrogi nastrój ludności białoruskiej w stosunku do państwowości i władz polskich aż nadto stwierdza b[ardzo] ujemny wpływ na nią jednostek — emisariuszy białoruskich"[99]. Пры гэтым стараста наракаў на бяздзейнасць паліцыі, якая нібыта звяртае недастаткова ўвагі на беларускіх актывістаў.

Лідскі павятовы стараста Здановіч таксама пісаў камендanту паліцыі ў Гродне 9 жніўня 1924 г.: „Ekspozytura policji politycznej doniosła, iż w lasach gm. Bersztańskiej pow. Grodzieńskiego, jak również na terenie gminy Koniawskiej pow. Lidzkiego ukazały się bandy partyzantów litewskich, od których można się spodziewać powtórzenia napadów, jakie miały miejsce w 1921 r."[100] Інфарматар паліцыі з гміны Скідзель паведамляў у чэрвені 1924 г.: „Z rozmów z ludźmi daje się zauważyć pewne rozczarowanie z powodu niewystąpienia Litwy, z którego oczekiwano większej awantury wojennej. Zapytywano przy tej okazji, czy się nie liczą ze zniszczeniem materialnym jakie powoduje wojna, odpowiadano, że zniszczenie i tak jest nieuniknione z powodu nadmiernych podatków i w ogóle z powodu panowania polaków"[101].

З рапарту павятовай паліцыі ад 29 жніўня 1923 г. вынікала, нібыта 17 жніўня на тэрыторыі Літвы быў дакананы агляд партызанскіх фармаванняў з удзелам прадстаўніка Беларускага камітэта, які „z szeregów partyzanckich wydzielił wszystkich białorusinów, by dać możność wstąpienia w szeregi tworzącej się armii białoruskiej w Bolszewii. Wymieniony przedstawiciel Białorusi zwracał szczególną uwagę na tych partyzantów-białorusinów, którzy znają teren Wileńszczyzny i Białorusi w ogóle i władają poprawnie językiem polskim. Delegat ów nadmieniał też, że obecna chwila krytyczna dla Polski (strajki i bezład w Polsce), należy wykorzystać i odebrać okupację Litwy i Białorusi"[102].

Улетку 1924 г. паліцыя пастанавіла выявіць настроі беларускага і літоўскага насельніцтва ў прымежных з Літвой мясцовасцях. Кіраўнік экспазітуры палітычнай паліцыі Гродзенскага павета пісаў у сваім рапарце аб сітуацыі на памежжы 29 жніўня 1924 г.: „Donoszę, że Litwa Kowieńska nadal prowadzi w przyspieszonym tempie jednak bardziej konspiracyjnie wyrafinowaną robotę w kierunku organizacji oddziałów partyzantów"[103]. 26 ліпеня некалькі пераапранутых агентаў паліцыі прайш-

[99] ДАГВ, ф. 17, воп. 1, спр. 41, арк. 239.
[100] Тамсама, арк. 536.
[101] Тамсама, арк. 289.
[102] Тамсама, арк. 608.
[103] Тамсама, арк. 608.

ліся па лясных вёсках Берштаўскай гміны, выдаючы сябе за беларуска-літоўскіх дыверсантаў. Зробленае імі апісанне паводзін мясцовых жыхароў падае надзвычай цікавы зрэз нацыянальнай і палітычнай свядомасці насельніцтва. Напрыклад, нейкі парабак гаспадара Ушкевіча абяцаў агентам намаўляць аднавяскоўцаў да ўступлення ў шэрагі партызанаў: „Ma takich kolegów, którzy mają do tego dążenie, uważając Rząd Polski za niesprawiedliwy w stosunku do Białorusinów". Па дарозе з вёскі Гародзішча да вёскі Беньki агенты спаткалі гаспадара Саковіча, які „narzekał na całą Polskę i rządy i obiecywał okazać pomoc w organizacji; prosił by zajść do niego, gdzie będziemy spokojni i nikt nie wyda policji". Каля вёскі Дудкі агенты спаткалі ў лесе Адама Аўтухевіча, „który dąży do tego, by stworzyć Białoruś": „Nadmienia, że skoro tylko w Polsce będzie jaki przewrót, to powstanie oddział partyzantów który pomoże w przewrocie; zna już kilkanaście osób, którzy zdolni do tego". Па дарозе да вёскі Шумы сустрэлі лесніка, які „powiedział, że u niego było już dużo takich ludzi, i on zawsze przychylnie ich przyjjmował, gdyż Polskę gotów zniszczyć"[104]. Праз два тыдні, 9 жніўня псеўдапартызаны зноў паўтарылі свой паход. Ужо знаёмы нам парабак гаспадара Ушкевіча „obiecywał namawiać chłopów ze wsi Berszty do wstąpienia do partyzantki i gdy przyjdę po raz drugi, to już będzie wiadomo ile jest zgodnych ludzi". Гаспадар Саковіч з Бенькаў паведаміў, „że będzie mógł ukryć partyzantów i nie wyda policji". Жыхары вёскі Матылі атрымалі такую характарыстыку: „Ludność wrogo usposobiona. Gospodarz Grymuta zajmuje się agitacją na rzecz Białorusi, otrzymuje rozmaite książki i gazety białoruskie"[105]. Кіраўнік экспазітуры палітычнай паліцыі ў Гродне так падсумаваў вынікі гэтай акцыі: „Z przeprowadzonego w ten sposób wywiadu dało się ustalić, że ogólny nastrój ludności białoruskiej i litwinów jest względem Państwa Polskiego wrogi, a ludność tych wiosek łatwo poddaje się agitacji wywrotowej dążąc do samodzielności. Główną przyczyną tego, jak się dało zauważyć są duże podatki nakładane na ludność tamtejszą, a okolice biedne. Wysłani na wywiad udając białorusinów i litwinów, wszędzie przyjjmowani byli gościnnie, dawano nocleg i jedzenie, a nawet uprzedzano i ukrywano przed policją, która znajdowała się w pobliżu"[106]. Варта аднак падкрэсліць, што мясцовыя ўлады і паліцыя самі былі зацікаўлены ў падтрыманні міфа партызанскай пагрозы, бо тым самым павялічвалі свае ўласнае значэнне ў вачах цэнтральнага ўрада. Таму гэтыя інфармацыі пра партызанскую пагрозу трэба ацэньваць асцярожна і дапускаць яе пэўнае перабольшванне з боку функцыянераў паліцыі.

[104] Тамсама, арк. 611.
[105] Тамсама, арк. 613.

Камендант III кампаніі памежнай паліцыі Случаноўскі падрыхтаваў 9 ліпеня 1925 г. справаздачу адносна палітычна падазроных асоб у Берштаўскай і Марцінканскай гмінах. Ён асабіста аб'ехаў многія вёскі і асады гэтых гмін пад час аблавы, якая праводзілася з 4 па 8 ліпеня, і занатаваў у сваёй справаздачы: „Podczas obławy (...) dowiedziałem się od osób zasługujących na zaufanie, że w niektórych wioskach są ludzie politycznie poszlakowani, którzy podtrzymują bardzo ścisły kontakt z organizacjami Białoruskimi w Sowdepji, ewent[ualnie] z Litwą Kowieńską i prowadzą wśród ludności tutejszej agitację antypaństwową, starają się ją przekonać, że już prędko skończą się rządy Polski i nastąpią lepsze czasy, kiedy będą mogli rządzić sami sobą. Agitują, by dzieci do szkół nie posyłać, a kary nakładane administracyjnie oni pokryją. Specjalnie jest już rozagitowana młodzież wśród tamtejszej ludności białoruskiej, co daje się już zauważyć na zewnątrz"[107]. Мясцовых беларускіх актывістаў камендант ахарактарызаваў так: „Wszyscy wyżej wymienieni utrzymują między sobą najściślejszy kontakt i są na tamtejszych terenach wybitnymi działaczami białoruskimi, a wśród ludności mają bardzo wielkie wpływy. Wszystko koncentruje się u Siniłło, zamieszkałego w Zasadach, dokąd wszyscy bardzo często zjeżdżają się na polityczne pogawędki (...). Aleksander Milinkiewicz, sekretarz gminy, z uwagi na zajmowane stanowisko jest najbardziej niepożądanym elementem".

У тых мясцовасцях, дзе актыўна дзейнічала беларуска-літоўская партызанка, у 1926 г. актыўна развіваецца і грамадоўскі рух. У кастрычніку-лістападзе 1926 г. ва ўсіх праваслаўных вёсках у Берштаўскай гміне былі заснаваны гурткі Беларускай сялянска-работніцкай гарамады, а агульная колькасць іх сяброў дасягнула 309 чалавек[108]. 26 снежня 1926 г. кіраўнікі ўсіх гурткоў гміны сабраліся ў Берштах у хаце настаўніка Мікалая Касцевіча і абралі гмінны камітэт БСРГ. Яго старшынёй стаў былы партызан Максім Шаставіцкі, а сакратаром — Мікалай Касцевіч.

Максіму Шаставіцкаму было на той час 26 гадоў. На судовым працэсе супраць беларуска-літоўскіх партызанаў у Гродне ў красавіку 1925 г. ён атрымаў 2 гады турмы, а ў чэрвені 1926 г. быў вызвалены і вярнуўся ў родную вёску. Як аказалася, турма не змяніла яго палітычных перакананняў, а хутчэй, наадварот. Паводле справаздачы каменданта паліцыі гміны Бершты Аляксандра Сламчынскага ад 29 чэрвеня 1926 г.: „Jak stwierdzono wymieniony w kilka dni po swo-

[106] Тамсама.
[107] ДАГВ, ф. 38, воп. 1, спр. 13, арк. 74.
[108] ДАГВ, ф. 38, воп.1, спр. 19, арк. 250.

im przybyciu otrzymał białoruską gazetę „Narodnaja sprawa”, później zaś zaprenumerował jeszcze czasopismo humorystyczne „Małanka”. Wspomniane czasopisma Szestowicki daje miejscowej ludności do czytania, zachęcając do prenumerowania i to jedynie pism białoruskich. Z zachowania się wymienionego widać, iż chce, czyli zależy mu na zjednaniu miejscowej ludności, by w przyszłości mieć lepsze pole do działania. W swoim czasie w miejscowej szkole były urządzone przez kierownika przedstawienia amatorskie o imprezach polskich więc jak się dowiedziałem wymieniony został niezadowolony, iż młodzież białoruska bierze udział w polskich sztuczkach i zaagitował tąż o niebranie udziału w tych że, natomiast zachęcał jedynie do brania udziału w białoruskich”[109]. У справаздачы ад 1 лістапада 1926 г. камендант паведамляў: „Szestowicki Maksim prowadzi w pierwszym rzędzie agitację za jak najliczniejszym i silniejszym zorganizowaniem tegoż (гуртка БСРГ — С. Т.) namawiając miejscową ludność białoruską do zapisywania się na członków tegoż. Prócz tego agituje za szkolnictwem białoruskim i w ogóle stara się [...] zapewniając, iż niepodległość Białorusi będzie uzyskana”[110]. У гэтай жа справаздачы камендант ахарактарызаваў яшчэ аднаго былога партызана — Епіфана Ушкевіча з вёскі Сухары, які выйшаў з турмы адначасова з Шаставіцкім: „Pozostaje członkiem miejscowej hurtki, agituje miejscową ludność białoruską za szkołami białoruskimi zniechęcając do Państwa Polskiego i Władz. Usposobiony jest bardziej złowrogo niż kiedykolwiek (...) ufając jakoby w lepszą przyszłość, tj. uzyskanie Białorusi”[111].

Максіма Шаставіцкага неўзабаве пасля роспуску Грамады прызвалі ў польскую армію, але ён уцёк са сваёй вайсковай часткі. Быў затрыманы паліцыяй, а 23 лістапада 1928 г. ізноў уцёк з пастарунка паліцыі ў Гродне і здолеў перабрацца праз мяжу ў БССР[112]. Далейшы ягоны лёс нам невядомы.

Падзеі партызанкі 1922-1923 гг. увесь час уплывалі на дзейнасць мясцовых улад і паліцыі ў той жа Берштаўскай гміне. Напрыклад, у справаздачы ад 19 снежня 1927 г. камендант паліцыі Эміль Ліндпэр напісаў: „Od roku 1922 (...) od czasu organizowania się band dywersyjnych litewsko-białoruskich na terenie tut[ejszego] posterunku, chociaż wywrotowe działania ich zostały (...) zlikwidowane, jednak duch antypaństwowy i wrogi pozostał do czasu obecnego i co raz więcej rozszerza się wśród młodzieży — do czasu zlikwidowania band dywersyjnych białoru-

[109] Тамсама, арк. 128.
[110] Тамсама, арк. 215.
[111] Тамсама.
[112] ДАГВ, ф. 38, воп. 1, спр. 24, арк. 303.

sko-litewskich, tj. od 1922 roku do czasu obecnego do Rosji i Litwy zbiegło 67 osób mężczyzn w wieku od lat 20 do 35, którzy w swoim czasie uprawiali tu robotę antypaństwową — obecnie prawie wszyscy z nich zajmują poważniejsze stanowiska w Rosji, jako komuniści i z rodziną pozostałą na terenie posterunku prowadzą często konspiracje — która treścią swoją usposabia ludność wrogo względem państwa"[113].

Своеасаблівым завяршэннем гісторыі беларуска-літоўскай партызанкі на тэрыторыі Берштаўскай гміны стала справа выкрыцця тут шпіёнскай арганізацыі. На пачатку студзеня 1930 г. былі арыштаваны паліцыяй жыхары гміны беларусы Мікалай Касцевіч (войт), Аляксандр і Юры Сінілы, Ян Траян, Лукаш Лебядзевіч (падазраваўся ў 1922-1923 гг. у прыналежнасці да беларуска-літоўскай партызанкі), Міхал Гардзей, Андрэй Наско, а таксама мясцовыя літоўскія актывісты Антон Траяновіч, Войцех Павайба і Антаніна Пашкоўская. Усіх іх абвінавацілі ў шпіянажы на карысць літоўскай дзяржавы. Падставай для арышту паслужыла тое, што ў канцы снежня 1929 г. паліцыя затрымала ў Гродне Юрыя Сінілу, малодшага брата Аляксандра і Васіля Сінілаў. У яго была знойдзена шыфраваная запіска, якая, паводле паліцыі, утрымлівала інфармацыю для літоўскіх спецслужбаў пра тое, колькі моладзі ў Берштаўскай гміне ўступіла ў шэрагі польскага Стралецкага звязу. Паліцыя сцвярджала, што ў Берштаўскай гміне дзейнічала шпіёнская арганізацыя на чале з Аляксандрам Сінілам, які падтрымліваў сувязь са сваім братам Уладзімірам, былым настаўнікам, які ў 1926 г. нібыта нелегальна перайшоў у СССР, а адтуль быў накіраваны ў Літву, дзе працаваў для літоўскай выведкі ў Мерачы[114]. Уладзімір Сініла сапраўды жыў у Мерачы, дзе працаваў у Беларускім культурна-асветным таварыстве, пра што пісаў у сваёй аўтабіяграфіі ў 1940 г., калі звярнуўся да новай савецкай улады ў Коўне прызначыць яго на працу настаўнікам у беларускую школу[115]. Уладзімір Сініла не знайшоў паразумення са старшынёй беларускага таварыства Сымонам Якавюком, адышоў ад грамадскай дзейнасці і жыў у Коўне. Пра ўдзел у якой-кольвек вывядоўчай працы ў сваёй аўтабіяграфіі ён не ўзгадваў.

На пачатку чэрвеня 1930 г. абвінавачаным у шпіянажы быў вынесены прысуд. Па 6 гадоў турмы атрымалі Аляксандр Сініла і Мікалай Касцевіч, Лукаш Лебядзевіч — 5 гадоў. Аляксандру Сінілу, апрача

[113] ДАГВ, ф. 38, воп. 1, спр. 23, арк. 1.
[114] APwB, Urząd Wojewody Białostockiego, sygn. 52, k. 32.
[115] LCVA, f. 1091, a. 1, b. 3, l. 19. Выказваю падзяку за гэты архіўны дакумент гродзенскаму гісторыку Алесю Горнаму.

таго, забаранілі вяртацца ў Берšты, і ён пасля вызвалення пасяліўся дзесьсці пад Беластокам. Малодшы з братоў Сінілаў, Юры, памёр падчас следства, як сцвярджаў яго брат Васіль — ад атрыманых падчас допытаў пабояў.

Як можна ацаніць вынікі беларуска-літоўскай партызанкі для мясцовага грамадства з перспектывы развіцця беларускага нацыянальнага руху? На нашу думку, з палітычнага і вайсковага пункту гледжання ўзброеная барацьба беларусаў супраць польскай дзяржавы на той момант з'яўлялася безнадзейнай авантурай. Яшчэ добра, што абышлося адносна невялікай колькасцю ахвяр. Існавалі альтэрнатыўныя мірныя магчымасці змагання за палітычныя і нацыянальныя правы беларускага насельніцтва, а найперш — удзел у выбарах цэнтральных і мясцовых улад, стварэнне легальных палітычных і грамадскіх арганізацый. Дыверсійныя акцыі давалі мясцовым уладам выдатныя магчымасці для дыскрэдытацыі ўсяго беларускага руху і падставы для больш жорсткага стаўлення да існуючых легальных арганізацый. Беларускія палітыкі ў дадзенай сітуацыі былі выкарыстаны літоўскім урадам у яго мэтах. Тая частка мясцовай беларускай інтэлігенцыі, якая падтрымала партызанку, у выніку яе ліквідацыі ў большасці сваёй вымушана была пакінуць свой край і эміграваць у Літву і СССР. Заложнікамі вялікай палітычнай гульні сталі простыя сялянскія хлопцы, якія ўступілі ў шэрагі партызанаў і ўзялі ў рукі зброю. На падзеях партызанкі не было створана прадуктыўнага для беларускага нацыянальнага руху гераічнага міфа. Нават у лакальнай памяці вясковых супольнасцей яна не пакінула глыбокага следу. І ўсё ж трэба адзначыць, што партызанскі рух засведчыў вялізны крок у развіцці нацыянальнай самасвядомасці беларускага сялянскага насельніцтва, які адбыўся ў неверагодна кароткі адрэзак часу. Да Першай сусветнай вайны гэтае насельніцтва практычна не было закранута беларускай агітацыяй і амаль нічога не ведала пра беларускую нацыянальную ідэю. А ўсяго праз некалькі гадоў сялянская моладзь гатова было ўзяцца за зброю пад лозунгамі стварэння незалежнай Беларусі.

Summary

Belarusian-Lithuanian partisanship in Grodno County of Białystok Voivodeship in 1922-1923

In 1922 structures of anti-Polish partisan movement, supported by the Lithuanian government from abroad, were formed in Polish counties neighbouring with Lithuania. The aim of the movement was to establish an independent Belarusian state. The Belarusian-Lithuanian partisans achieved the most support in Grodno County of Białystok Voivodeship. The majority of the partisans were young peasants, joined by part of the village intelligentsia. The partisans carried out several diversionary actions, forcing the Polish autho-

rities to direct a regular army against them. In the summer of 1922 the police uncovered a secret partisan network in Grodno County, arresting about 70 people. In 1923 Lithuania lost interest in supporting the Belarusian partisan movement. A great number of partisans immigrated to the USSR. From a political point of view, the actions undertaken by the partisans were a mere fracas that had no chance to succeed and contributed to discrediting the Belarusian national movement in the eyes of the liberal Polish community.
Keywords: Belarusians, Lithuanians, partisans, Grodno County

Streszczenie

Partyzantka białorusko-litewska w powiecie grodzieńskim województwa białostockiego w latach 1922-1923

W 1922 r. w graniczących z Litwą powiatach państwa polskiego powstały struktury antypolskiego ruchu partyzanckiego, wspieranego zza granicy przez rząd litewski. Celem ruchu obwieszczono utworzenie niepodległego państwa białoruskiego. Białorusko-litewska partyzantka największym poparciem cieszyła się w powiecie grodzieńskim województwa białostockiego. Większość partyzantów stanowiła młodzież chłopska, do której przyłączyła się część wiejskiej inteligencji. Partyzanci dokonali kilku akcji dywersyjnych, czym zmusili polskie władze do skierowania przeciwko nim regularnego wojska. Latem 1922 r. policja wykryła konspiracyjną siatkę partyzancką w powiecie grodzieńskim. Aresztowano około 70 osób. W 1923 r. Litwa przestała wspierać białoruski ruch partyzancki. Znaczna część partyzantów wyemigrowała do ZSRR. Z politycznego punktu widzenia partyzantka była awanturą, która nie miała szans na powodzenie i przyczyniła się do dyskredytacji białoruskiego ruchu narodowego w oczach liberalnej społeczności polskiej.
Słowa kluczowe: Białorusini, Litwini, partyzanci, Grodzieńszczyzna

Siarhiej Tokć — doktor habilitowany, profesor Białoruskiego Instytutu Prawoznawstwa (Filia w Grodnie), pracownik Studiów Białoruskich na Uniwersytecie Warszawskim.

Аляксандр Пагарэлы
(Варшава)

Да праблемы выбару эвалюцыйнай парадыгмы сацыяльных змен Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыяй міжваеннага перыяду.

Замест бруду і атруты мы хутчэй вырашылі
напоўніць нашыя вуллі воскам і мёдам,
такім чынам дорачы чалавецтву
дзве найшляхетнейшыя рэчы,
якімі з'яўляюцца слодыч і святло.

Джонатан Свіфт, „Бітва кніг”, прадмова, 1704 г.

Самым важным момантам
гэтай трансфармацыі
[*у кантэксце мадэрнізацыі*]
з'яўляецца тое, што
яно вядзе толькі ў адным кірунку:
жука ў чалавека,
але ніколі чалавека ў жука...

Эрнест Гелнер, „Думка і змена”, 1964 г.

Уводзіны

Перыяды бурлівых палітычных, сацыяльных і культурных змен адрозніваюцца дэзарыентацыяй, бо папярэднія катэгорыі, якія дазвалялі б успрымаць рэчаіснасць і сувязь паміж яе элементамі як упарадкаваную, перастаюць дзейнічаць. Сітуацыі, якія называюць „пераходным перыядам”, цяжка ўкладваюцца ў звыклыя тлумачальныя схемы і розныя сацыяльныя і палітычныя акцёры, што маюць інтарэс і шанцы прайграць або выйграць (з іх перспектывы), могуць палярна альбо нейтральна ацэньваць такія сітуацыі і мець свае погляды на канцовы вынік такіх перыядаў. Такі часовы адрэзак можна ўслед за Арнальдам ван Генепам назваць „часам цудаў”, калі могуць здарацца рэчы, якія супярэчаць папярэднім правілам і традыцыям. Гэта лімінальныя сітуацыі[1].

[1] А. ван Геннеп, *Обряды перехода*, Москва 2002; V. Turner, *Dramas, Fields and Metaphors. Symbolic Action in Human Society*, Ithaca and London 1974, p. 231-271.

Ваенна-рэвалюцыйную віхуру, што пранеслася па беларускіх землях у 1914-1921 гадах, можа быць аднесена якраз да такіх „пераходных перыядаў”, якія адкрываюць магчымасці і перспектывы з пункту гледжання адных акцёраў ці, наадварот, закрываюць, з пункту гледжання іншых. Для вызначэння такога становішча, калі ўсё грамадства ці пэўная яго частка папярэдне не гатовае прыняць новыя для сябе ролі і ідэнтычнасці, вымушана гэта рабіць пад ціскам знешніх акалічнасцей, перуанскі гісторык Нельсан Манрыке назваў „паскарэннем гістарычнага часу”[2].

Перад грамадствам могуць стаяць альтэрнатывы і раздарожжы, якія пры пэўных умовах могуць стаць шанцамі для пашырэння яго магчымасцей, павелічэння рэсурсаў, узмацнення пазіцый. Але тым не менш сітуацыя пераходу да новага становішча можа пакінуць след не меншы, чым увесь папярэдні вопыт дадзенага грамадства.

Менавіта з такімі выклікамі сутыкнулася палітычная арганізацыя, якая была адным з самых значных палітычных акцёраў, а ў пэўныя перыяды рэпрэзентавала інтарэсы беларускага грамадства ў Польшчы ў цэлым. Гаворка ідзе аб Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (з 1926 г., а пазней, з 1936 г. – Беларускае Народнае Аб'яднанне)[3]. Гэта ўвасобілася ў дыскурсе выданняў гэтай партыі, якая пачала разглядаць вектар развіцця заходнебеларускага грамадства (калі не ўсяго беларускага грамадства ў цэлым) як эвалюцыйны, скіраваны ў будучыню, звязаны з прагрэсам. Час атрымаў маральнае вымярэнне[4] і быў падпарадкаваны канцэпцыі эвалюцыі, на якую глядзелі як на шлях да сацыяльнай трансфармацыі. Але было б няправільна разглядаць прыняцце канцэпцыі эвалюцыі як сам сабой зразумелы факт. Існаваў шэраг дылем, якія стаялі перад хрысціянскімі дэмакратамі, якія нельга звесці да канфесійнай прыналежнасці (рыма-каталіцтва) заснавальнікаў і часткі прыхільнікаў гэтага руху.

Канцэпцыя сацыяльнай эвалюцыі паводле БХД адлюстравана не толькі ў яе палітычных праграмах. Праграмныя дакументы нельга цалкам ігнараваць, але яны ўяўляць толькі частку масіву матэрыялу неабходнага для разумення праблематыкі. Патрэбна паглядзець як такая канцэпцыя ўвасаблялася ў дыскурсе друку хрысціянскіх дэмакратаў. Паводле ж Фларэнсіі Малон, дыскурс з'яўляецца адкрытым

[2] F. E. Mallon, *Peasant and Nation. The Making of Postcolonial Mexico and Peru*, University of California Press, Berkeley — Los Angeles — London 1995, p. 2.

[3] M. Moroz, *„Krynica”: Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001.

[4] E. Gellner, *Thought and Change*, Chicago — London [1964] 1978, p. 3-4.

працэсам у рамках культурнага, палітычнага і ідэалагічнага ўзаемадзеяння[5].

Неабходна паглядзець на гэтую праблему ў яе больш шырокім інтэлектуальным кантэксце. Тым больш, што працы папярэдніх даследчыкаў рэлігійна-палітычнай, культурнай і асветніцкай дзейнасці беларускага каталіцкага духавенства агулам і БХД у прыватнасці падрыхтавалі для гэтага глебу[6]. Аднак нам спатрэбіцца засяродзіцца на выкліках, якія стаялі перад беларускімі інтэлектуаламі ў цэлым як прадстаўнікамі групы, якая знаходзілася на ніжніх прыступках сацыяльнай лесвіцы ў міжваеннай Польшчы і якая магла шукаць такіх альтэрнатыў, якія не былі даступныя зыходзячы з іх становішча і папярэдняга досведу грамадства. Таму інтэлектуальнае запазычанне магло быць зразумелым выбарам у такой сітуацыі[7]. Нам спатрэбіцца прасачыць некаторыя з гэтых запазычанняў.

Калі ў папярэднія дзесяцігоддзі тэза аб тым, што каталіцтва адкрывала для беларускага нацыянальнага руху заходнія інтэлектуальныя ўплывы[8] ўжо сігналізавала важны аспект развіцця беларускага грамадства ў палітычнай і культурнай сферах, то сёння наўрад ці гэтага дастаткова. Пачаць пошук і вызначыць, што гэта былі за ідэі і ўплывы ўжо магчыма. Уводзячы беларускую праблематыку ў больш шырокі кантэкст Усходне-Цэнтральнай Еўропы, глабальных дыскурсаў, культурнай антрапалогіі і інтэлектуальнай гісторыі можна істотна дапоўніць перспектывы парадыгмы памежжа і гісторыі палітычнай думкі[9].

Праблематычная самавідавочнасць выбару на карысць ідыёмы прагрэсу і эвалюцыі

Яшчэ пры канцы Першай сусветнай вайны ў рэдакцыйным матэрыяле „Крыніцы" ў студзені 1918 г. зазначалася: „Новая гісторыя [ча-

[5] F. E. Mallon, *Peasant and Nation*, p. 90.

[6] Э. Мазько, *Ідэалагічныя падставы дзейнасці Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (1917-1939 гг.)*, „Гістарычны Альманах", 2000, т. 3, с. 71-76; К. С. Разуванава, *Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926-1936 гг.)*, Мінск 2013.

[7] J. Żarnowski, *Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolitej 1918-1939*, Warszawa 1983; B. Moore Jr., *Injustice: The Social Bases of Obedience and Revolt*, London and New York 1978, p. 87-88, 497; J. Fabian, *Time and the Other. How Anthropology Makes its Object*, New York 1983.

[8] W. Pawluczuk, *Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu społeczności tradycyjnej*, Warszawa 1972, s. 35-36.

[9] П. В. Терешкович, *Этническая история Беларуси XIX — начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы*, Минск 2004; K. Verdery, *National*

лавецтва] пачынаецца ў 15 веку і становіць дзеля сваёй едноты тону або духа часу вялікую часьць ланцуга гісторыі... Часць гэтая яшчэ не закончана; дзе і як будзе яе канец трудна згадаць. Глаўны тон гэтае гісторыі, яе дух часу, каторым мы ўсе дыхаем, гэта ідэя эвалюцыі, прагрэсу, поступу" [захаваны правапіс арыгіналу – А. П.][10].

У матэрыяле даваліся два разуменні эвалюцыі, якія адлюстроўвалі погляды і прыярытэты інтэлектуальных і палітычных лідараў хрысціянскіх дэмакратаў. Першае падкрэслівала дадаванне навацый пры захаванні старога. Другое ж падкрэслівала стварэнне выключна новых форм пры знікненні ўсяго старога[11]. Прагрэс і эвалюцыя ж не могуць не абапірацца на нешта. Для беларусаў было спакусліва прыняць менавіта другі погляд на эвалюцыю, абраць рэвалюцыю як „дух часу". Відавочна, першае разуменне эвалюцыі было блізкае аўтарам рэдакцыйнага матэрыялу. Беларусы па змаўчанні павінны былі стаць часткай сусветнага працэсу эвалюцыі і прагрэсу. Яны мусілі дачакацца сваёй чаргі і нарэшце атрымаць статус незалежнай нацыянальнай дзяржавы. Важны таксама момант дэтэрмінізму і наканаванасці такога шляху[12].

Праз трынаццаць год пасля праграмнага артыкула ў „Крыніцы" ўжо ў іншых абставінах і іншы аўтар, якім быў Адольф Клімовіч, заяўляў:

Ideology Under Socialism. Identity and Cultural Politics in Ceauşescu Romania, Berkeley — Los Angeles — Oxford 1991; *Conversion to Modernities. The Globalization of Christianity*, ed. P. van der Veer, New York — London 1996; C. E. Schorske, *Thinking with History: Explorations in the Passage to Modernism*, Princeton 1998; E. Smułkowa, *Wokół pojęcia pogranicza*, [w:] *Pogranicza Białorusi w perspektywie interdyscyplinarnej*, red. E. Smułkowa i A. Engelking, Warszawa 2007, s. 5-14; *Беларуская думка XX ст. Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія)*, Варшава 1998.

10 A-č, *Duch času i biełarusy*, „Kryniсa", 1918, nr 2, s. 1. Параўн.: А. Луцкевіч, *Эканамічная эвалюцыя і беларускі рух: Рэферат чытаны ў Беларускім клюбе 28 X 1917*, [у:] А. Луцкевіч, *Да гісторыі беларускага руху. Выбраныя творы*, Мінск 2003, с. 66-74.

11 A-č, *Duch času i biełarusy*, s. 1.

12 Л. Хант, *Французская революция: нулевой градус времени*, [у:] *Изобретение века. Проблемы и модели времени в России и Европе XIX столетия*, ред. Е. Вишленкова, Д. Сдвижков, Москва 2013, с. 47-48; F. Hirsch, *Empire of Nations. Ethnographic Knowledge and the Making of the Soviet Union*, Ithaca — London 2005, p. 6; B. A. Porter, *The Social Nation and its Futures: English Liberalism and Polish Nationalism in Late Nineteenth-Century Warsaw*, „The American Historical Review", 1996, Vol. 101, No. 5, p. 1484. На пачатку 1920-х гг. наканаванасць і непазбежнасць у пытанні нацыянальнай інтэграцыі і фармавання беларускай нацыі ў будучыні артыкуляваліся ў „Крыніцы". Гл.: Tojsamy, *Pa Dzisienščynie*, „Kryniсa", 1923, nr 11, s. 2-4.

„Не трудна з гэтага зрабіць выснавак, што **адраджэнскі рух народаў** [вылучана ў тэксце – А. П.], маючых сваю мінуўшчыну, зьвязаныя інтарэсамі сучаснасьці і імнкучыхся да супольнай, ясна азначанай мэты ў будучыні, ня ёсьць нейкім іхным капрысам, а толькі **лёгічным завяршэннем гістарычна-эволюцыйнага працэсу, ёсць нямінучай канечнасцяй сусьветнай роўнавагі, сусьветнага міру**.

Гэтыя вывады, абаснаваныя на об'ектыўных навуковых досьледах, даюць паруку, што і Беларусы, маючы ўсе пералічаныя прыкметы ў мінуўшчыне і сучаснасьці, паміма ўсіх жудасцяў і заломаў могуць з значна большай пэўнасцяй спазіраць наперад... Трэба толькі ўнармаваць, уаднастайніць **супольную мэту на будучыню**"[13].

Як можна пераканацца, эвалюцыя бачылася як шлях у будучыню. Але трэба асцярожна падыходзіць да таго, што падрыхтавала да гэтага глебу.

Наступствы ваенных і рэвалюцыйных падзей 1914-1921 гг. і звязаных з гэтым матэрыяльных страт для гарадоў і вёсак на беларускіх землях былі вельмі істотнымі. Перамяшчэнні насельніцтва, звязаныя з эвакуацыяй і бежанствам, разбурэнне транспартнай інфраструктуры, экалагічныя праблемы, голад, эпідэміі значна падарвалі сацыяльна-эканамічны патэнцыял і без таго ў значнай ступені перыферыйнай тэрыторыі. Можна лічыць справядлівай ацэнку пераходу мясцовых пераважна натуральных вясковых гаспадарак да ўзроўню развіцця васямнаццатага стагоддзя[14].

Асабліва пацярпелі вёскі і мястэчкі, якія знаходзіліся непасрэдна ў зоне баявых дзеянняў у прыфрантавой паласе. Паводле артыкула польскамоўнай газеты „Наш Край" („Nasz Kraj") з пачатку верасня 1919 г. мястэчкі Крэва і Смаргонь практычна перасталі існаваць, мястэчка ж Вішнева згарэла напалову. Насельніцтва гэтых тэрыторый галадала на працягу некалькіх гадоў, жыло ў акопах у жахлівых умовах. Палі былі разбіты акопамі, цяжка было прыбіраць бетонныя нямецкія ўмацаванні. Эпідэміі без перашкод пашыраліся на тэрыторыі Віленшчыны. Цэлыя вёскі былі заражаны сіфілісам, што Чэслаў Янкоўскі, аўтар матэрыялу, лічыў спецыфічна расійскай спадчынай[15]. На пачатку 1921 г. карэспандэнт „Крыніцы" пісаў пра вёску Шутавічы Ашмянскага павета: „Сумна выглядаюць і Шутавічы і ваколіцы. Мне

[13] Ад. Клімовіч, *Шляхам Незалежнасці*, „Biełaruskaja Krynica", 1931, nr 14, с. 2.

[14] K. Brown, *A Biography of No Place. From Ethnic Borderland to Soviet Heartland*, Cambridge — London. 2004, p. 6.

[15] J. Januszewska-Jurkiewicz, *Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920-1939*, Katowice 2011, s. 108.

здарылася іх пазнаць праездам. Усюды равы, усюды ямы, зніштажэнні пасля вайны”[16]. Аўтар тэксту для календара „Наша Хата” 1920 г. адзначаў, што „ўсюды, куды ні кінеш вокам, могілкі, крыжы ды акопы – гэтыя жывыя сведкі нядаўняй крывавай мінуўшчыны”[17].

У 1923 г. 60 працэнтаў усіх дзяцей у Віленскім ваяводстве хварэла на сухоты. Памерлыя людзі ляжалі на вуліцах Берасця і Пінска. Дапамога бежанцам, што вярталіся з СССР, аказвала надта вялікі ціск на і так вельмі абмежаваныя рэсурсы[18]. Ва ўспамінах сучаснікаў адзначаецца, што стан здароўя вяскоўцаў быў падарваны выпрабаваннямі вайны, людзі вельмі часта паміралі, а сістэма аховы здароўя была вельмі дрэнна развіта[19]. Можна пагадзіцца, што такое становішча магло сапраўды спрыяць крайнім настроям вяскоўцаў на пацярпелых ад вайны тэрыторыях[20].

Але такія драматычныя, эмацыйныя, але ад гэтага не менш праўдзівыя пры ўсіх перабольшваннях апісанні, не павінны змушаць нас да высновы, што беларускі нацыянальны рух у цэлым і беларускія хрысціянскія дэмакраты ў прыватнасці прынялі на пачатку 1920-х гг. пасля завяршэння польска-бальшавіцкай вайны і заключэння Рыжскага міру парадыгмы эвалюцыі і прагрэсу. Зрэшты, для адбудовы інфраструктуры, кармлення галодных, лячэння хворых у мінулым не патрэбна была канцэпцыя сацыяльнай эвалюцыі, прагрэсу і парадыгма сацыяльных змен.

Самавідавочнасць у дадзенай сітуацыі з’яўляецца памылковай (як і ў іншых даследаваннях у гуманітарных і сацыяльных дысцыплінах)[21], а таму патрэбна тлумачэнне прычын. Таксама патрэбны кантэкст, азнаямленне з якім дапаможа нам лепш зразумець як стала магчымым тое, што Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя прыняла і распаўсюджвала праз свой друк не ідэі рэвалюцыйных змен, гвалтоўныя метады і хуткі надыход зямнога тысячагадовага валадрства сацыяльнай справядлівасці[22]. Таксама яны не заклікалі вярнуцца да

[16] Padarožny, *Wioska Šutawičy*, „Krynica”, 1921, nr 3, s. 3.

[17] А. Н-ка, *Сучасныя думкі*, [у:] *Беларускі календар на 1920 год. Наша Хата*, Вільня 1920, с. 53.

[18] P. A. Rudling, *The Battle over Belarus. The Rise and Fall of the Belarusian National Movement, 1906-1931*, Ph. D. Thesis, Edmonton, Alberta 2010, p. 197.

[19] *У новай айчыне. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд*, Беласток 2001, с. 89.

[20] J. Januszewska-Jurkiewicz, *Stosunki narodowościowe*, s. 108.

[21] M. Douglas, *Implicit Meanings: Essays in Anthropology*, Boston 1975, p. 276-318.

[22] I. Halfin, *From Darkness To Light: Class, Consciousness, & Salvation In Revolutionary Russia*, Pittsburgh 2000.

стану, які існаваў перад вайной. Гэта было немагчыма ажыццявіць, хоць такое імкненне і такія настроі на вёсцы існавалі[23]. Замест гэтага БХД і яе друк абапіраліся на зусім іншы погляд на развіццё беларусаў як грамадства.

Аднак бачыць толькі ў цёмных колерах наступствы вайны наўрад ці можна. „Паскарэнне гістарычнага часу” азначала таксама, што вайна, звязаныя з ёю разбурэнні і нечуваныя дагэтуль і беспрэцэдэнтныя перамяшчэнні насельніцтва (а гэта ўключала не толькі бежанства, але і досвед палону[24]) стварылі, як гэта не падалося б дзіўна, спрыяльную глебу для пранікнення новых ідэй і практык на вёску. Яшчэ перад вайной вяскоўцы з’язджалі працаваць у расійскія гарады. Нельга забываць, што беларуская вясковая моладзь у міжваенны перыяд уключалася ў дзейнасць польскіх сельскагаспадарчых школ і гурткоў, ездзіла ў азнаямляльныя паездкі ў іншыя рэгіёны Польшчы, што змушала яе прадстаўнікоў да рэфлексіі аб магчымасці пераймання новага вопыту на беларускай глебе[25]. Служба маладых сялян у польскім войску, навучанне спецыяльнасцям на курсах для унтэр-афіцэраў і паралельны ўдзел у польскіх вясковых арганізацыях для моладзі не азначалі адмовы ад беларускай ідэнтычнасці, удзелу ў беларускіх тэатральных пастаноўках ці беларускай культурнай дзейнасці ўвогуле[26].

Вяскоўцы ж, якія альбо засталіся пад акупацыяй, трапілі ў нямецкі ці аўстра-венгерскі палон, былі ў бежанстве сутыкаліся з зусім іншымі культурнымі рэаліямі, параўноўвалі культурныя, гаспадарчыя нормы, заўважалі розніцы ва ўзроўні асветы і дабрабыту. Праблематычна сказаць, на колькі ў беларускім кантэксце вяскоўцы ўгледзелі сувязь паміж матэрыяльным дабрабытам і ўзроўнем агульнай культуры, земляробчай культуры ў прыватнасці і ўменнямі чытаць

[23] J. Obrębski, *Studia etnosocjologiczne*, t. 1: *Polesie*, red. A. Engelking, Warszawa 2007, s. 463-471.

[24] *Robotnik niewykwalifikowany, syn wieśniaka z Wileńszczyzny, ur. w 1895 r. Pamiętnik nr 22*, [у:] *Pamiętniki emigrantów*, t. I: *Francja*, Warszawa 1939, s. 332-344; *Бежанства 1915 года*, рэд. В. Луба, Беласток 2000.

[25] J. Chałasiński, *Młode pokolenie chłopów. Procesy i zagadnienia kształtowania się warstwy chłopskiej w Polsce*, t. II: *Świat życia, pracy i dążeń kół młodzieży wiejskiej*, Warszawa 1938, s. 81-83; *Pamiętnik nr 38. Syn gospodarza pracujący w gospodarstwie domowem w pow. wilejskim*, [у:] *Pamiętniki chłopów*, t. I: *Nr 1-51*, Warszawa 1935, s. 530; І. Гєрасімов, *Rusticus natio?*, „Україна модерна”, 2010, ч. 17 (6), Безмежне село, с. 192-193. Як даводзіць Ілля Герасімаў, яшчэ перад Першай сусветнай вайной сяляне з Віцебшчыны адпраўляліся на стажыроўкі ў цэнтральна-еўрапейскія Багемію, Маравію, Харватыю і інш.

[26] *Syn gospodarza na 10 ha (z pow. mołodeckiego)*, [w:] *Wiejscy działacze społeczni*, t. I: *Życiorysy włościan*, Warszawa 1937, s. 343-352.

і пісаць, патрэбамі атрымліваць новую і карысную інфармацыю праз газеты, часопісы і кнігі[27], але як дазваляюць меркаваць некаторыя карэспандэнцыі[28], на вёсцы з’явілася пэўная колькасць людзей, якія такія сувязі заўважылі. Таму можна сцвердзіць, што выснова, якую ўплывовы польскі гісторык сялянскага руху Ян Маленда зрабіў для польскіх зямель пасля Першай сусветнай вайны аб тым, што вайна зламала ізаляцыю вёскі, а ў тым ліку і інфармацыйную ізаляцыю[29], можа быць прынамсі часткова справядлівай і для заходнебеларускай вёскі. Аднак перашкоды для распаўсюджання новых ідэй прагрэсу, эвалюцыі і патрэбы змен маглі быць не толькі сярод вяскоўцаў. Пэўныя абмежаванні існавалі ў светаўспрыманні ці сітуацыі прадстаўнікоў палітычных і інтэлектуальных элітаў.

Асаблівасці рэцэпцыі сацыяльнай эвалюцыі дзеячамі БХД

Перш, чым мы пачнем разглядаць пытанне эвалюцыі як праблемы для інтэлектуалаў і палітыкаў БХД і іх друку, нам патрэбна разабрацца ў тым, які быў кантэкст узнікнення яе ў рамках БХД, а таксама чыннікі і асаблівасці, якія суправаджалі гэты працэс. Таксама трэба падкрэсліць існаванне пэўнай логікі ў развіцці ідэалогій прагрэсу і эвалюцыі, якая праходзіць чырвонай лініяй праз іх. Не толькі энцыкліка *Rerum Novarum* 1891 г. вызначала інтэлектуальны змест дэбатаў і было рухавіком дыскусій унутры БХД[30]. Самыя розныя чыннікі як мясцовага лакальнага, так і глабальнага кантэксту ўплывалі на іх. Але спачатку пра кантэкст.

Па-першае, каталіцкае асяроддзе, з якога і нарадзілася Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць, якая пазней ператварылася ў БХД, мела падставы для аптымізму ў сувязі з рэвалюцыямі 1917 г. у Расійскай імперыі, якія змянілі становішча Рыма-каталіцкай царквы да лепшага (прынамсі, першапачаткова). Па-другое, дактрына *Rerum Novarum* 1891 г. адкрыла новыя перспектывы, у тым ліку ў сэнсе адноснай ад-

27 J. Molenda, *Chłopi, naród, niepodległość: kształtowanie się postaw narodowych i obywatelskich chłopów w Galicji i Królestwie Polskim w przededniu odrodzenia Polski*, Warszawa 1999, s. 65, 68.

28 J. Pituška, *Padymajma kulturu na wioscy! (Z Brasłaŭščyny)*, „Biełaruskaja Krynica”, 1936, nr 20, s. 4; Sumny, *Zadańni našaj moładzi*, „Krynica”, 1925, nr 20, s. 4.

29 J. Molenda, *Chłopi, naród, niepodległość*, s. 302, 356-357; С. М. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX — першая траціна XX ст.*, Менск 2007, с. 145, 279.

30 Э. Мазько, *Ідэалагічныя падставы дзейнасці Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (1917-1939 гг.).*

крытасці да новых інтэлектуальных плыняў. Еўрапейскія рэвалюцыі XVIII-XIX стст. вымусілі папства да большай адкрытасці ў гэтых адносінах. Калі, паводле слоў Карла Гінзбурга, яшчэ ў XVII ст. Каталіцкая царква была гатовая да адкрыцця таямніц прыроды, але не таямніц улады[31], то праз два стагоддзі сітуацыя змянілася і прыйшла чарга і за таямніцамі ўлады.

Па-трэцяе, публікацыя і пераклады на еўрапейскія мовы прац брытанскага сацыёлага Герберта Спенсера і аўстрыйскага сацыёлага польска-яўрэйскага паходжання Людвіка Гумплёвіча (1838-1909), прыродазнаўцы, біёлага Чарльза Дарвіна прывялі да большага замацавання ідэй лінеарнага прагрэсіўнага развіцця і эвалюцыі не толькі прыроды, але і грамадства ў публічнай сферы сярод адукаваных класаў. Гісторыя і біялогія былі тымі дысцыплінамі, якія, як падавалася, пацвярджалі такія чаканні. Паляпшэнне стала ўспрымацца ў еўрапейскай думцы яшчэ з XVIII ст. як нешта, што чакаюць, што патрабуецца па змаўчанні. На гэта сталі глядзець як на выражэнне відавочнай праўды[32]. Ідэі патрэбы індустрыяльнага развіцця, спаборніцтва нацый на прамысловай глебе, эканамічнага прагрэсу, але таксама і звязанага з гэтым сацыял-дарвінізму ў апошняй траціне XIX — пачатку XX стст. сталі ўспрымацца як самавідавочныя, неаспрэчныя, як *zeitgeist* („дух часу”)[33].

Па-чацвёртае (і гэта звязана з першым пунктам), шырокае распаўсюджанне марксізму як у Расійскай імперыі ў цэлым, так і на землях былога Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Па-пятае, развіццё нацыянальных рухаў у Еўропе ў XIX ст. перад Першай сусветнай вайной і ўзнікненне новых дзяржаў на руінах кантынентальных імперый пасля яе. Гэта ўзмацняла веру ў непазбежнасць і нават наканаванасць падобнага сцэнарыя і для беларусаў.

Менавіта такі кантэкст абумовіў прыняцце ідэй прагрэсу і эвалюцыі інтэлектуаламі і палітыкамі з кола БХД. Да прычын жа, якія тлумачаць прыняцце БХД эвалюцыйнай парадыгмы, можна аднесці, безумоўна, сам рэлігійны канфесійны чыннік, які нельга праігнараваць. Навука Каталіцкай царквы настойвала на паляпшэнні паводзін верніка, на споведзі, ачышчэнні ад граху і перамен у асабістых поглядах і паводзінах паводле хрысціянскай маральнай шкалы. Гэта было звя-

[31] O. Chadwick, *The Popes and European Revolution*, Oxford [1981] 2003; К. Гинзбург, *Верх и низ. Тема запретного знания в XVI-XVII веках,* [у:] той жа, *Мифы — эмблемы — приметы: морфология и история*, Москва 2004, с. 143-145.

[32] E. Gellner, *Thought and Change*, p. 3-4, 13.

[33] B. A. Porter, *The Social Nation and its Futures*, p. 1483-1484.

зана са зрываннем з грахоўным мінулым. Тым часам гэта можна было суаднесці са свецкімі ідыёмамі паляпшэння, прагрэсу і эвалюцыі. Само жыццё магло ўяўляцца як абмежаваны рэсурс, што падкрэслівала ў тым ліку пратэстанцкая тэалогія[34]. Гэта, з аднаго боку рабіла магчымым надаць адназначнае маральнае вымярэнне „добрай", „святлейшай" будучыні, а таксама заснаваць супольнасць на падставе руху да гэтай лепшай будучыні, выратавання асобных беларусаў пры ўмове далучэння да гэтай супольнасці, якая б мела як свецкае, так і рэлігійнае вымярэнне. Пры гэтым самі пратэстанцкія рухі ў міжваеннай заходнебеларускай вёсцы асуджаліся як „сектанцкія". Беларусы маглі быць альбо праваслаўнымі, альбо каталікамі ў разуменні хрысціянскіх дэмакратаў. Пратэстантамі яны быць не маглі[35].

Важны чыннік гэта сам факт утварэння Хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці як звянчанне поспехам арганізацыйных высілкаў і памкненняў духоўных і свецкіх беларускіх каталіцкіх актывістаў з часоў яшчэ перад Першай сусветнай вайной. Гэта быў значны крок наперад у развіцці і ідэалагічнай дыферэнцыяцыі беларускага нацыянальнага руху.

Таксама сюды можна аднесці такі важны чыннік як узрост і прыналежнасць да новага пакалення лідараў беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў. На момант стварэння партыі ў траўні 1917 г. у Петраградзе (як Хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці беларусаў) большасці яе заснавальнікаў было 25-35 гадоў. Айцу Фабіяну Абрантовічу (1884-1946) на тады было 33 гады, ксяндзу Вінцэнту Гадлеўскаму (1888-1942) 29 гадоў, Адаму Станкевічу (1891-1949) 25 гадоў, Люцыяну Хвецьку (1889-1944) 27 гадоў і г.д. Гэта той узрост, які можна было б параўнаць з класіфікацыяй гісторыі антраполагам Клодам Леві-Стросам на два тыпы: кумулятыўны і стацыянарны. У рамках першага жыццё праходзіць пад знакам назапашвання вопыту і ўражанняў[36].

Не ў апошнюю чаргу важны тут і чыннік таго, што ідэі прагрэсу і эвалюцыі былі характэрныя для сярэдняга класа заходнееўрапейскіх краін. А пераканаўчымі яны былі таму, што добра карэляваліся з кар'ерай, якую пры жыцці рабілі прадстаўнікі сярэдніх класаў

[34] J. Frykman, O. Löfgren, *Narodziny człowieka kulturalnego. Kształtowanie się klasy średniej w Szwecji XIX i XX wieku*, Kęty 2007, s. 38-39.

[35] Słuchoŭski, *Metadyskaja „sprawiadliwaść"*, „Biełaruskaja Krynica", 1927, nr 38, s. 4; *Metodyzm u Zachodniaj Biełarusi i prychilnaść da jaho Ŭłasawa, Łuckiewiča i Janki Stankiewiča*, „Biełaruskaja Krynica", 1929, nr 18, s. 2; M-st, *Sektanstwa — hrob narodu*, „Biełaruskaja Krynica", 1932, nr 37, s. 4; A. Pinčuk, *Relihijnaja sprawa ŭ biełaruskich masach*, „Biełaruskaja Krynica", 1936, nr 13, s. 2.

[36] К. Леви-Стросс, *Путь масок*, Москва 2000, с. 323-356.

або буржуазіі[37]. Дарэчы, апошняе ніяк не апраўдвае штампу савецкай камуністычнай прапаганды пра „буржуазны" характар БХД[38]. Варта хаця б сказаць аб паходжанні самога Маркса і тое, што марксізм і камунізм таксама ўзніклі сярод прадстаўнікоў буржуазіі, сярэдніх класаў[39]. Заснавальнікі і дзеячы БХД паходзілі пераважна з сялянскіх сямей, але былі сярод іх і мяшчане, як той жа Фабіян Абрантовіч[40], і на іх жыццё і кар'еру святароў беларускія вяскоўцы маглі глядзець цалкам прыхільна, бо гэта быў станоўчы прыклад сацыяльнай мабільнасці[41]. Не пазбаўленай аднак падстаў думкай здаецца тое, што мэтай хрысціянскіх дэмакратаў якраз было стварэнне сярэдняга класа сярод беларусаў.

Да асаблівасцей працэсу прыняцця і рэцэпцыі ідэй эвалюцыі і прагрэсу беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі трэба аднесці таксама тое, што, нягледзячы на катастрафічныя вынікі Першай сусветнай вайны, ідэі гістарычнага песімізму не вызначылі погляды хрысціянскіх дэмакратаў на беларускае грамадства. Асобныя беларусы, як і ў цэлым беларускае грамадства было здольным змяніцца да лепшага паводле іх меркавання. Яшчэ раз трэба вярнуцца да ідэйнай спадчыны XIX ст., якая адыгрывала значную ролю. Гэтае стагоддзе нарадзіла палітычныя ідэалогіі, навуковыя і філасофскія канцэпцыі, адной з якіх быў прагрэс ці, інакш, поступ. Яшчэ да Першай сусветнай вайны ў газеце „Беларус" падкрэслівалася важнасць „ісці з поступам навукі"[42]. Пры гэтым нельга недаацэньваць і важнасць спадчыны перыяду пазітывізму 1870-1880-х гг. у Варшаве і гістарычнай Літве[43].

[37] E. Gellner, *Thought and Change*, p. 13; J. Frykman, O. Löfgren, *Narodziny człowieka kulturalnego*, s. 39-40, 48.

[38] J. Tomaszewski, *Białoruska Chrześcijańska Demokracja. Uwagi o kryteriach ocen*, [w:] *Studia polsko-litewsko-białoruskie*, red. J. Tomaszewski, E. Smułkowa, H. Majewski, Warszawa 1988, s. 158.

[39] M. Berman, *All That Is Solid melts into Air. The Experience of Modernity*, New York 1988.

[40] *Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны*, рэд. Ю. Гарбінскі, Менск — Мюнхен 1999, с. 3; *Białoruski ruch chrześcijański w XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny*, red. J. Garbiński, J. Turonek, Warszawa 2003. З ліку 46 актыўных на культурнай, сацыяльнай і палітычнай глебе беларускіх рыма-каталіцкіх святароў, біяграфіі якіх былі апісаны ў гэтых даведніках і сярод якіх былі і занавальнікі БХД, 40 чалавек паходзілі з сялян.

[41] С. М. Токць, *Гарадзеншчына як абшар польска-беларускага этнаканфесійнага памежжа*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2003, nr 19, s. 152.

[42] Ha, *Naszaje narekańnie*, „Biełarus", 1913, nr 8, s. 1-2.

[43] B. A. Porter, *The Social Nation and its Futures*, p. 1485-1486.

Зрэшты, постаці адной з дзяячак эпохі пазітывізму, Элізе Ажэшцы, таксама надавалася ўвага[44]. Пазітывісты адмаўлялі гвалтоўны шлях барацьбы за нацыянальную незалежнасць, выбіралі шлях „арганічнай працы" (якую паводле назвы нагадвала „пазітыўная беларуская праца" у рыторыцы хрысціянскіх дэмакратаў)[45], актыўна перакладалі працы брытанскіх і іншых навукоўцаў, якія падкрэслівалі важнасць прагрэсу ў навуцы і мадэрнізацыі ў эканамічнай сферы з націскам на развіццё прамысловасці. Пры гэтым пазітывісты вельмі выбарачна перакладалі творчасць такога брытанскага сацыёлага, як Герберт Спенсер (1820-1903), бо некаторыя яго працы і ідэі, а асабліва пра „маленькія нацыі" і іх „шкоднасць" не падыходзілі польскаму грамадству, бо яно магло разглядацца ў такой якасці, а значыць і прайграць барацьбу за незалежнасць. Аднак ідэі эвалюцыі, „індустрыяльнай вайны" (рынкавай канкурэнцыі паміж прамысловымі нацыямі) і „выжывання мацнейшых" у ёй падыходзіла ім. У дыскурсе друку БХД таксама выбарачна падыходзілі да такіх ідэй, але іх важнасць прызнавалася. Станіслаў Грынкевіч у сваёй брашуры „Народ" прысвечанай у тым ліку і тэарэтычным аспектам праблематыкі нацый і нацыябудавання, адзначыў: „Калі йзноў гаворым – змаганьне дык адначасна ўяўляць нам трэба, што змагацца мы будзем **у нашых абставінах** [вылучана намі – А. П.], гэта знача, што трэба да гэтага азброіцца. Перамагае не той толькі, хто мае шмат жаўнераў, стрэльбаў і ваенных параходаў. Цяпер больш важная барацьба ў галіне жыцця эканамічнага, прамысловага"[46]. У 1920-1930-х гг. сацыял-дарвінісцкія матывы прысутнічалі ў выданнях БХД-БНА, але была пэўная мяжа ў іх выкарыстанні[47]. Тут зноў жа гаворка можа ісці пра пэўную, але не поўную, несумяшчальнасць такіх матываў з мэтамі хрысціянскіх дэмакратаў.

44 W. W., *Eliza Ožeško (1842-1910) (Wolnyja štrychi)*, „Biełaruskaja Krynica", 1929, nr 31, s. 1-2.

45 Archiwum Akt Nowych, sygn. 962, k. 13; Я. Ш., *Беларуская пазітыўная праца (З нагоды адведзінаў гурткоў Беларускага Інстытуту Г. і К.*, „Biełaruskaja Krynica", 1934, nr 13, s. 1; *Беларуская рэлігійная праца*, „Biełaruskaja Krynica", 1935, nr 11, s. 1; Дуброўскі, *Беларуская культурная праца і польскае „кулка"*, „Biełaruskaja Krynica", 1936, nr 1, s. 4; Н. Жальба, *Культурная праца сьведамай беларускай моладзі на вёсцы*, „Шлях Моладзі", 1939, № 15, с. 3. Параўн. таксама выраз ксяндза Адама Станкевіча ў дзённіку за май 1937 г.: „*на грунце агульнабеларускай пазітыўнай культурнай працы*". Гл.: А. Станкевіч, *Каляндарныя нататкі*, [у:], той жа, *З Богам да Беларусі. Збор твораў*, Вільня 2008, с. 837.

46 Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič, *Narod*, Wilnia 1927, s. 31. Яшчэ раней гэты нарыс з'явіўся ў трох частках у газеце „Беларуская Крыніца": St. Hrynkiewič, *Narod*, „Biełaruskaja Krynica", 1927, nr 38, s. 2-3; nr 39, s. 2-3; nr 41, s. 2-3.

47 j., *Prykład wialikanaŭ*, „Biełaruskaja Krynica", 1928, nr 5, s. 1; A. K., *Nia pożam,*

Прызнавалася выключная роля спадчыны XIX ст. у развіцці думкі і літаратуры. Гэты час называўся „сталеццем адраджэння народаў". У такім кантэксце беларусы разглядаліся як частка „славянскай сям'і" ўжо адроджаных і нацыянальна свядомых народаў. Пры гэтым для адраджэння патрэбна была перамога „духа над матэрыяй". Беларусаў чакала „шчаслівае завяршэнне", г.зн. ім было наканавана стаць такімі ж нацыянальна самастойнымі як народы Усходне-Цэнтральнай Еўропы: сербы, чэхі і іншыя[48].

Канечне, працы вядучых мысляроў XIX ст. такіх, як Эміль Дзюркгайм або Герберт Спенсер, тады на беларускую мову не перакладаліся, не згадваліся наўпрост, але ўплыў іх ідэй на стварэнне дыскурсу выданняў хрысціянскіх дэмакратаў хоць і праз запазычанне іх ідэй у тым ліку і праз польскіх пазітывістаў меў месца. Ідэі Эміля Дзюркгайма пра этапнасць *развіцця* грамадства[49] адпавядала хрысціянскім дэмакратам, хоць і не апісвала так дакладна пераход ад адной фазы да другой і іх унутраныя асаблівасці, як гэта рабіў марксізм са сваімі сацыяльна-эканамічнымі фармацыямі. У гэтым быў элемент прызнання неўсёахопнасці сацыяльных змен, якія не закранаюць усіх аспектаў жыцця грамадства[50].

Марксізм разам з тым увасабляў моцнага канкурэнта ідэалогіі БХД. Бальшавіцкая камуністычная версія марксізму распаўсюджвалася ў Заходняй Беларусі не толькі ў выглядзе перакладаў прац Маркса і Энгельса[51], але яшчэ часцей больш прымітыўнай агітацыйнай літаратуры ў сталінскім духу, якая аперыравала большай колькасцю штампаў і мела прыкметы рэлігійнай артадоксіі, нецярпімасці да альтэрнатыўных поглядаў і маніхейства ў светапоглядзе чорна-белай карціны грамадства, пра што будзе сказана крыху ніжэй. Але тое, што хрысціянскія дэмакраты ўвесь час вялі палеміку з прэсай КПЗБ і БСРГ мела ўплыў на іх рыторыку і дыскурс іх друку таксама. Нават

dyk čaranami, „Biełaruskaja Krynica", 1928, nr 43, s. 1; *На парозе Новага году*, „Biełaruskaja Krynica", 1930, nr 1, s. 1; *Nacyjanalizm, jaho hranicy i značeńnie*, „Biełaruskaja Krynica", 1933, nr 9, s. 1; *Kryzys i naša wioska*, „Biełaruskaja Krynica", 1933, nr 13, s. 1; ar, *Wynaradaŭleńnie słabiejšych narodaŭ*, „Biełaruskaja Krynica", 1934, nr 30, s. 2; Daloki, *Nawarot da dzikaści*, „Biełaruskaja Krynica", 1935, nr 32, s. 2; *Nacyjanalizm i katalicyzm*, „Chryścijanskaja Dumka", 1933, nr 4, s. 1-2.

48 Saładuch, *U čym sława i značeńnie XIX stalećcia?*, „Krynica", 1920, nr 10, s. 2; nr 11, s. 2-3.

49 R. E. Nisbet, *Émile Durkheim*, Englewood Cliffs, NJ 1965, p. 91-92.

50 E. Gellner, *Thought and Change*, p. 120-121.

51 Ф. Энгельс, *Разьвіцьцё соцыялізму ад ўтопіі да навукі*, Вільня 1929; І. С., *Марксызм і нацыянальнае пытаньне*, Вільня 1929.

праз адмаўленне ўцягваючыся ў дыскусіі з камуністамі і радыкаламі друк хрысціянскіх дэмакратаў вымушаны быў прызнаваць іх існаванне і лічыцца з іх ідэямі[52].

Пры вывучэнні праблем сацыяльнай трансфармацыі ў грамадствах Усходне-Цэнтральнай Еўропы (як увогуле незаходніх грамадстваў) трэба ўлічваць спецыфіку іх светапогляду, пункту гледжання на характар сацыяльных сувязей, пэўная ступень маніхейства і таго, што антраполаг і палітолаг Кенет Джоўіт акрэсліў як карпаратызм. Апошні разглядае інстытуты, з'явы з жыцця грамадства, у палітыцы, культуры як адназначна негатыўныя ці пазітыўныя, цэласныя і дакладна ізаляваныя ад іншых сацыяльных феноменаў. Рэчаіснасць апісваецца ў чорна-белых катэгорыях. Яна ўяўляецца разарванай[53]. Менавіта такое светаўспрыманне можа весці да патрэбы не столькі радыкальнай палітычнай рэвалюцыі ці лозунгаў, але дакарэннай маральнай і светапогляднай перабудовы грамадства і асобы ці вяртання да нейкага ідэалізаванага мінулага і яго каштоўнасцей. Таму эвалюцыя можа таксама мець і вымярэнне свайго роду духоўнай барацьбы, маральнага адраджэння[54].

Эвалюцыя без Дарвіна

Вышэй ужо абмяркоўвалася стаўленне Рыма-каталіцкага касцёла да таямніц прыроды і таямніц улады. Не ўсё было адназначна і ў адносінах да таямніц прыроды. Напрыклад, цікавая розніца назіралася паміж хрысціянскімі дэмакратамі і камуністычнымі і лева-радыкальнымі выданнямі ў тым, як яны глядзелі на эвалюцыйную канцэпцыю Дарвіна. У хрысціянска-дэмакратычным друку практычна не згадваецца яго постаць і не згадваюцца асноўныя працы Дарвіна. Пры гэтым прызнаецца эвалюцыя грамадства. Ідэі Дарвіна, яго разуменне „таямніц прыроды" было ў сваёй адкрытай дактрыне несумяшчальна з вучэннем Каталіцкай царквы. Пэўную ролю ў гэтым адыгрывала і прысяга супраць мадэрнізму, якую павінны былі даваць святары

[52] Era, *Dwa kirunki*, „Narodny Zwon", 1926, nr 3, s. 1; *Jak i što piša ab nas „Naša sprawa"*, „Biełaruskaja Krynica", 1926, nr 45, s. 3-4; Skarha, *Hramadaŭski „Zwon"*, „Biełaruskaja Krynica", 1927, nr 2, s. 4; nr 3, s. 4; Al. S., *Manapol na pracoŭnaść*, „Biełaruskaja Krynica", 1928, nr 29, s. 1.

[53] K. Jowitt, *The Sociocultural Bases of National Dependency in Peasant Countries*, [y:] *Social Change in Romania, 1860-1940. A Debate on Development in a European Nation*, ed. K. Jowitt, Berkeley, California 1978, p. 18-19.

[54] P. Siewruk, *O odrodzenie moralne ludu białoruskiego*, „Przegląd Wileński", 1926, nr 11, s. 6-7; F. Stern, *The Politics of Cultural Despair. A Study in the Rise of the Germanic Ideology*, Garden City, NY 1965, p. 78.

пры высвячэнні і паўтараць кожны год пачынаючы з 1910 г. (яе абавязковасць была скасавана ў 1967 г., але добраахвотна прымаюць яе і цяпер)[55]. Аднак яна не столькі абмяжоўвала дзеячаў хрысціянскай дэмакратыі, колькі садзейнічала большай інтэлектуальнай гнуткасці, вынаходлівасці і крэатыўнасці.

Замест таго, каб ужываць катэгорыі эвалюцыйнага дарвінізму, на старонках друку БХД выкарыстоўвалі біялагічныя, раслінныя, прыродныя метафары і параўнанні. Катэгорыі прыроднага свету дапамагалі наблізіць чытачам ідэі, якія распаўсюджваў друк БХД. Пачаткі гэтага мы можам шукаць яшчэ ў перыяд да Першай сусветнай вайны ў газеце „Беларус”[56]. Гэта таксама не ў апошнюю чаргу павінна было наблізіць сэнс матэрыялаў, якія публікаваліся на старонках беларускіх хрысціянска-дэмакратычных выданняў для шырокага кола чытачоў. Зрэшты, само перакананне, што сяляне былі яшчэ блізкія да свету прыроды, толькі спрыяла выкарыстанню такіх метафар. Гэта было ўяўленне, якое каранілася ў рамантычных ідэях XIX стагоддзя[57].

55 M. Löscher, *Eugenics and Catholicism in interwar Austria*, [у:] *Blood and Homeland. Eugenics and Racial Nationalism in Central and Southeast Europe, 1900-1940*, eds. M. Turda and P. J. Weindling, Budapest — New York 2007, p. 302.

56 B. P., *Ad czaho paczynać?*, „Biełarus”, 1913 , nr 21, s. 1-2. Аўтар артыкула параўнаў народ, выкарыстаўшы біблейскі матыў з садам, у якім дзікія і культурныя дрэвы растуць разам. Праект мадэрнасці ўвогуле параўноўвалі з уходам за садам, на што звярнуў увагу філосаф Зыгмунт Бауман. Гл.: *Landscaping the Human Garden. Twentieth-Century Population Management in a Comparative Framework*, ed. A. Weiner, Stanford 2003. Аўтар пад псеўданімам „Тойсамы” адзначыў, што тое, што беларусы кансалідуюцца ў адзіную этнічную групу пад ціскам палітыкі польскага ўрада з’яўляецца „найпрасцейшым правам прыроды, каторыя не знаюць адхілення”: Tojsamy, *Pa Dzisienščynie*, s. 3; S-ki, *Kultura i palityka*, „Krynica”, 1925, nr 16, s. 1. Ксёндз В. Гадлеўскі параўноўваў культуру з каменем, а палітыку – з травой; *U adzinaccatyja ŭhodki abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi*, „Biełaruskaja Krynica”, 1929, nr 12, s. 1. У дадзеным выпадку аўтар матэрыялу параўнаў беларускую справу з ракой; *Pramowa Ks. Dr. I. Rešecia, U dzień światkawańnia Abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi*, „Chryścijanskaja Dumka”, 1930, nr 7-8, s. 3. Ксёндз Язэп Рэшаць падкрэсліваў, што „народ гэта натуральны вынік жыцця людскага, ён не згіне пакуль чалавек жыве і развіваецца. Народ мае сваю ўнутраную біялагічную сілу (...) мае сваю ўласную душу ў аналагічным парадку да кожнага арганізму фізічнага”.

57 Аўтар тэксту да календара 1920 г. выказваецца пра беларусаў у адзіночным ліку трэцяй асобы як пра чалавека „з сялянскай псіхікай, сваім непадгатаваным простым, натуральным розумам”. Гл.: А. Н-ка, *Сучасныя думкі*, [у:] *Беларускі календар на 1920 год. Наша Хата*, с. 55. Больш на тэму ідэалізацыі вобраза сялян як блізкіх да прыроды і „натуральнасці” гл. у: C. A. Frierson, *Peasant Icons: Representations of Rural People in Late Nineteenth-Century Russia*, Oxford and New York 1993; J. Carey, *The Intellectuals and the Masses. Pride and Prejudice among the Literary Intelligentsia, 1880-1939*, New York 1993, p. 36-38.

Што ж датычыць камуністаў і левых радыкалаў, то для іх не было праблемай прыняцце ідэй эвалюцыі відаў Дарвіна, аднак сацыяльная эвалюцыя імі якраз адкідалася. Гэта мацней праяўлялася пасля згортвання ў БССР НЭПу, з пачаткам калектывізацыі, індустрыялізацыі і з тым, што даследчыца Франсін Хёрш назвала „паскарэннем эвалюцыі" асобных савецкіх нацый і ўсяго савецкага грамадства[58], што суправаджалася беспрэцэдэнтным ужываннем гвалтоўных і нават экстэрмінацыйных метадаў. Пры гэтым камуністы адкідалі ідэі барацьбы відаў і натуральны адбор і не лічылі іх самымі лепшымі ідэямі Дарвіна не адмаўляючыся пры гэтым ад класавай барацьбы. Яны спалучалі гэта са спадчынай Маркса. Пры гэтым і хрысціянскія дэмакраты і камуністы, левыя і лева-радыкальныя групы аднолькава бачылі ў дарвінізме элемент шкоднага для іх мэт будавання палітычных супольнасцей, палітычных праектаў мадэрнасці „эгаістычнага індывідуалізму". Гэта, зрэшты, таксама была спадчына рэцэпцыі дарвінісцкіх ідэй расійскай інтэлігенцыяй XIX ст.[59]. Гэты самы індывідуалізм меў, паводле перакананнія па-калектывісцку настроеных інтэлігентаў таго часу, брытанскае, англійскае паходжанне і не сумяшчаўся з уяўленымі імі сацыяльнымі рэаліямі расійскай (і беларускай) вёскі з яе грамадой-калектывам і прынцыпамі ўзаемадапамогі ўнутры яе[60].

Ідэі капіталістычнай пратэстанцкай этыкі таксама пранікалі ў дыскурс БХД-БНА нягледзячы на адмаўленне капіталізму ў тэксце праграмных дакументаў партыі[61]. Тут пэўная роля можа быць адведзена як уплыву пазітывізму, так і распаўсюджанню ў позняй Расійскай імперыі перакладаў з англійскай мовы літаратуры „дапамогі самім сабе" (зрэшты, адзін з часопісаў БХД так і называўся „Самапомач"), пра спосабы дасягнення поспеху ў бізнесе і жыцці агулам[62]. Ідэі ашчаднасці, эканоміі, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, цвяроза-

58 F. Hirsch, *Empire of Nations*, p. 6-9.

59 ЭЭМФРУДІТ, *Чарльз Дарвін і Карл Маркс*, „Вольная Думка", 1929, № 2, с. 3-10; A. Vucinich, *Darwin in Russian thought*, Berkeley 1988; M. Berman, *All That Is Solid melts into Air. The Experience of Modernity*, New York 1988, p. 124-125.

60 С. М. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў*, с. 97-98; D. P. Todes, *Darwin without Malthus. The Struggle for Existence in Russian Evolutionary Thought*, New York — Oxford 1989, p. 36-37.

61 А. Вашкевіч, *Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграм*, „Спадчына", 2006, № 1, с. 30, 32, 34.

62 S. Smiles, *Self-Help*, London [1859] 1897. У Расійскай імперыі кніга была распаўсюджана ў перакладзе: С. Смайлс, *Самодеятельность*, Санкт-Петербург 1866.

га і рэалістычнага вызначэння мэт[63] знаходзілі сваё адлюстраванне ў дыскурсе друку БХД.

Пэўны ўплыў мела і трансатлантычная ідэалогія прагрэсівізму 1910-1930-х гг., значэнне якой толькі ўзрасло ў перыяд глабальнага эканамічнага крызісу[64]. Яна таксама падкрэслівала мірны шлях рэформ, з дапамогай якіх можна было вырашыць існуючыя сацыяльна-эканамічныя праблемы. Прыхільны погляд на гэтую ідэалогію мог узмацняцца фактам дзейнай дапамогі, якую аказалі амерыканскія арганізацыі падчас голаду і эпідэмій у Заходняй Беларусі і ў Польшчы ў 1919-1922 гг., а асабліва АРА (Амерыканская адміністрацыя дапамогі)[65].

Сугучнымі для гэтай ідэалогіі мадэлямі былі скандынаўскія дзяржавы, якія асабліва ў 1930-я гг. сваім прыкладам дэманстравалі ўстойлівасць дэмакратычнай мірнай мадэлі развіцця ў Еўропе, дзе, як падавалася тады сучаснікамі, мог перамагчы або фашызм або камунізм[66]. У беларускім хрысціянска-дэмакратычным друку прыклады скандынаўскіх краін таксама траплялiся як мадэлі для развіцця сельскай гаспадаркі, так і ў палітычным сэнсе. Прыклад скандынаўскіх краін (у прыватнасці Даніі) фігураваў перад Першай сусветнай вайной у газеце „Беларус". А для „Крыніцы" была важнай пераемнасць з гэтым выданнем, што падкрэслівалася[67].

Ідэі і арыентацыя на сацыяльны прагрэс і эвалюцыю, паступовыя змены і паляпшэнне ў гаспадарцы і інфраструктуры ў міжваеннай Заходняй Беларусі падзяляліся далёка не толькі лідарамі і прыхільнікамі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Прадстаўнікі польскіх вясковых і моладзевых арганізацый, іх актывісты, беларускія выданні арыентаваныя на польскі ўрад таксама падтрымлівалі падобныя погляды[68]. Пры гэтым яны фундаментальна адрозніваліся ад БХД ад-

63 J. Frykman, O. Löfgren, *Narodziny człowieka kulturalnego*, s. 38.

64 D. T. Rodgers, *Atlantic Crossings. Social Politics in a progressive Age*, Cambridge and London 1998, p. 409-484.

65 А. Лукашук, *Прыгоды АРА ў Беларусі*, Прага 2005, с. 21, 39-56; P. Weindling, *Epidemics and Genocide in Eastern Europe 1890-1945*, Oxford — New York 2000, p. 140-148, 154-172.

66 S. Avineri, *The Strange Triumph of Liberal Democracy*, „Foreign Affairs", 2012, Vol. 91, nr 1, p. 68-74.

67 Klonowicz, Ryhor, *Pa naszych wioskach*, „Biełarus", 1913, nr 36, s. 1-2; Chłopčyk s pad Hrodny, *Darahija Braty Biełarusy!*, „Krynica", 1920, nr 13, s. 2; N., *Jak żywuć sialanie ŭ Danii*, „Krynica", 1923, nr 14, s. 3-4.

68 J. Chałasiński, *Młode pokolenie chłopów*; *Gospodarz na 14 ha. z pow. Wileńskiego*, [у:] *Wiejscy działacze społeczni*, s. 372. Віленскае беларускае выданне „Еднасць", якое прапагандавала ідэю аднаўлення сюза паміж беларусамі, палякамі і літоўцамі і падтрымлівала лаяльную да польскага ўрада пазіцыю пад-

носінамі да суб'екта такіх змен і поглядам на будучыню беларусаў у рамках Польшчы, бо не ўсе прадбачылі для іх статус незалежнай нацыі.

Разам з хрысціянскім гістарычным песімізмам[69] часткова не прымаліся БХД і ідэі цыклічнасці (прынамсі ў гісторыка-філасофскім сэнсе). Папулярныя ў міжваенны перыяд ідэі Освальда Шпенглера знайшлі толькі частковае ўвасабленне ў канцэптуалізацыі „крызісу" (неабавязкова ў яго вузкім эканамічным вымярэнні). Ідэі Шпенглера не ўключалі хрысціянства. Таксама паводле імя адкідалася і філасофія Фрыдрыха Ніцшэ („вечнага вяртання таго ж самага"), але па сутнасці блізкая да яго думак ідэя адмовы ад гнятучай спадчыны мінулага пастулявалася ў дыскурсе друку БХД[70].

Ідэя эвалюцыі ў беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў фактычна распаўсюджвалася не толькі на сучаснасць, але і на мінулае. Тут, папершае, нельга забываць, што падставай рэгістрацыі падзей мінулага з'яўляецца той прынцып, які выступае ў якасці падставы для іх рэгістрацыі ў сучаснасці. Эвалюцыя дазваляла аб'ядналь і надаць сэнс (асабліва тады, калі гаворка ішла пра яе марксісцкую версію) падзеям, якія інакш ніяк паміж сабой не былі звязаныя не толькі ў сучаснасці, але і ў мінулым[71].

крэслівала, што „рэалізм – гэта першы варунак прадуктыўнай палітычнай працы" (Гл.: *Naszy zadańni*, „Jednaść", 1921, nr 2, s. 1). У іншым нумары гаворка ідзе пра неабходнасць грамадскіх, культурна-асветных, гаспадарчых, крэдытных арганізацый, якія б стваралі фундамент для будучай незалежнай дзяржаўнасці. Гл.: Žmohus, *Suczasnaje lekarstwa*, „Jednaść", 1921, nr 11, s. 1. Тыднёвік „Беларускае Слова" ў сваім першым нумары абвяшчаў, што „наша праграма ёсць шлях эвалюцыйны". Гл.: *Наша праграма*, „Беларускае Слова", 1926, № 1, с. 1. Пазней ужо выданне „Родны Край" падкрэслівала важнасць культурнай, грамадскай працы, культурных, асветных і гаспадарчых арганізацый у станаўленні народаў. Матэрыял, які высоўваў іх важнасць у якасці прыкладу ўзяў кнігу брытанскага журналіста, які разважаў менавіта аб эвалюцыі народаў. Гл.: *Трэба рабіць!*, „Родны Край", 1933, № 2, с. 1-2.

[69] J. Jedlicki, *Świat zwyrodniały. Lęki i wyroki krytyków nowoczesności*, Warszawa 2000, s. 161.

[70] z., *Kryzys kapitalizmu*, „Biełaruskaja Krynica", 1931, nr 33, s. 1-2; K. Löwith, *Meaning in History*, Chicago and London 1949, p. 12; М. Корнат, *Початки польської совєтології (1917-1939)*, „Україна модерна", 2009, ч. 14 (3), Марксізм на сході Європи, с. 117-118; A. Koŭzan, *Matčyna światа*, „Biełaruskaja Krynica", 1929, nr 19, s. 2; Al. S., *Ślady niawolnictwa*, „Biełaruskaja Krynica", 1927, nr 23, s. 1.

[71] C. Miłosz, *Rodzinna Europa*, Paryż 1959, s. 97; F. E. Mallon, *Peasant and Nation*, p. 13; K. Hastrup, *Introduction*, *Other histories*, ed. K. Hastrup, London and New York 1992, p. 10; *500-лецьце сьмерці Вітаўта (1430-1930)*, „Biełaruskaja Krynica", 1930, nr 14, s. 1; *500-lećcie śmierci Witaŭta (27.X.1430 — 27.X.1930)*, „Chryścijanskaja Dumka", 1930, nr 19-20, s. 1.

Канстатацыя адсталасці і дыстанцыя ў часе

Адпраўной кропкай для разваг аб неабходнасці сацыяльных змен сапраўды былі не згадкі пра разбурэнні прынесеныя ваеннымі і рэвалюцыйнымі падзеямі, але прызнанне факту розніцы ва ўзроўні развіцця беларускага грамадства з іншымі еўрапейскімі народамі і дзяржавамі. Яшчэ ў XIX ст. была заўважана розніца ў эканамічным і сацыяльным развіцці беларускіх зямель з Еўропай. Індыкатарам выступалі палітычныя падзеі еўрапейскіх рэвалюцый, а асабліва „вясна народаў” 1848-1849 гг., што паэту Уладыславу Сыракомлі дало падставу пазней маляўніча апісаць стан беларускіх зямель праз крыху больш, чым дзесяцігоддзе як вясну, якую яшчэ трэба дачакацца. Беларускае грамадства жыло паводле зусім іншага рытму, чым еўрапейскія[72]. Для вяскоўцаў, якія існавалі ў свеце прыродных цыклаў, супраціў эканамічнай рацыяналізацыі буйных землеўласнікаў праз карнавальную практыку падаўжэння рэлігійных святаў шляхам сумяшчэння рыма-каталіцкага і праваслаўнага календара коштам часу працы быў звычайнай практыкай[73].

Аднак кантэкст падзей пачатку 1920-х гг., калі на беларускіх землях не ўдалося дамагчыся стварэння поўнасцю незалежнай дзяржавы, якая б уключала большасць этнічных тэрыторый, таксама быў важны. Супастаўленне вялося паводле шкалы, дзе пералічаліся дзяржавы і народы, якія ўзніклі на руінах кантынентальных імперый. Такі пералік краін змяшчаўся ў артыкуле „Наш чарод” у траўні 1920 г. Гэта былі Чэхаславакія, Югаславія, Літва, Латвія, Эстонія, Фінляндыя і іншыя[74]. Аднак важным было вызначыць таксама крыніцы поспеху суседніх і прыпадобненых у дыскурсе прэсы БХД да беларусаў іншых, больш далёкіх народаў Еўропы, якія стварылі суверэнныя дзяржавы.

У адрозненне ад народаў, што здабылі незалежнасць, лёсы беларусаў склаліся зусім інакш. Тое, што беларусам не ўдалося выкарыстаць шанц і стварыць незалежную дзяржаву, прыпісвалася тады „слабасці сваёй культуры і сваёй беднаты эканамічнай”[75]. Таксама беларусы, Беларусь супастаўляліся з еўрапейскім кантэкстам у цэлым. Заходняя Еўропа, ці, як яна магла фігураваць яшчэ (часамі разам з Паўночнай

72 В. Ракіцкі, *Беларуская Атлантыда*, б. м. 2006, с. 67-69.

73 O. Kolberg, *Białoruś — Polesie. Dzieła wszystkie*, t. 52, Wrocław — Poznań etc. 1968, s. 80.

74 Ihnat Paparać, *Naš čarod*, „Krynica”, 1920, nr 11, s. 1.

75 Ad. St-ič, *Z aposznich dzion*, „Krynica”, 1923, nr 3, s. 2.

Амерыкай), Захад уяўляўся як „больш цывілізаваны за нас, калі не [больш] культурны". Так пісаў у сваёй серыі нарысаў у „Беларускай Крыніцы" пазней апублікаваных асобнай брашурай пад назвай „Народ" у 1927 г. псіхіятр, палітык, тэатразнаўца і пісьменнік д-р Станіслаў Грынкевіч[76].

У такім поглядзе на іншыя краіны з боку беларускіх інтэлектуалаў і палітыкаў звязаных з БХД таксама можна ўгледзець след спадчыны расійскага марксізму XIX ст., з якім наўпрост ці ўскосна праз адмаўленне радыкальна-рэвалюцыйных ідэй дыскутавалі лідары і прыхільнікі хрысціянскіх дэмакратаў. Справа была ў тым, што расійскія марксісты сцвярджалі, што для менш развітай краіны больш развітая ўяўляе сабой вобраз яе будучыні[77].

На ўзроўні агульнага параўнання беларусы маглі быць прыпадобненыя да сваіх суседзяў літоўцаў, латышоў ці ўкраінцаў, але калі гаворка ішла пра агульныя характарыстыкі сацыяльных і культурных параметраў, то гаворка ішла пра адсталасць, якая выражалася паняццем „цемната"[78]. Прычыны адсталасці шукалі і ў спадчыне паншчыны, псіхалагічных эфектах прыгонніцтва. Прычынамі такімі маглі выступаць і недахопы школьнай адукацыі (асабліва ўлічваючы яе іншамоўны, небеларускі характар)[79]. Пры гэтым само слова „адсталасць"[80] не ўжывалася. Само ж пачуццё перыферыйнасці і маргінальнасці беларусаў у параўнанні з лёсамі іншых народаў магло прымаць і паэтычную вершаваную форму. Праўда, несправядлівасць прадстаўлена тут не як нешта звязанае з віной саміх беларусаў, а як характэрная рыса эпохі[81].

Рэцэпт бачыўся ў псіхалагічнай перабудове, пераацэнцы навакольнага свету ў новых катэгорыях. Друк прывучаў да таго, што навакольны свет жыве паводле прынцыпу змен. Задачай было не толькі прывыкнуць і змірыцца з гэтымі зменамі, але змяняцца самім беларускім вяскоўцам. Для гэтага патрэбна было інтэрналізаваць адсталасць, засвоіць яе. Яна станавілася не столькі таўром, якое апісвала беларусаў, колькі ўласнай усвядомленай траўмай і міжвольным грахом. Стыгматызацыя сябе тут павінна была адыгрываць ролю матыву да дзеян-

[76] Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič, *Narod*, s. 22.

[77] B. A. Porter, *Democracy and Discipline in Late Nineteenth-Century Poland*, „The Journal of Modern History", 1999, Vol. 71, No. 2, p. 370; T. Shanin, *Late Marx and Russian Road. Marx and „the peripheries of capitalism"*, New York 1983.

[78] M. S., *Ab pryčynach našaje ciemnaty*, „Biełaruskaja Krynica", 1926, nr 24, s. 2-7.

[79] Stal, *Najbalučejšaja sprawa*, „Biełaruskaja Krynica", 1928, nr 50, s. 1.

[80] K. Brown, *A Biography of No Place*, p. 5-17.

[81] Marcin Bizun, *XX-ty wiek*, „Krynica", 1925, nr 31, s. 6.

няў, да змен у паводзінах і прыярытэтах. Тое, што беларусы ў выніку падзей 1914-1921 гг., хоць як правіла не па ўласнай волі, пазнаёміліся з іншымі народамі і краінамі, у якіх знаходзіліся як ваеннапалонныя, бежанцы альбо як рабочыя ці салдаты, павінна было, паводле „Крыніцы", стымуляваць іх да пераасэнсавання свайго жыцця дзякуючы атрыманаму новаму досведу[82].

Менавіта ў еўрапейскім, заходнім кантэксце бачыў шлях развіцця беларускага грамадства малады аўтар часопіса „Студэнцкая Думка", які хоць і не быў звязаны з БХД непасрэдна, але такое меркаванне можна лічыць блізкім да поглядаў гэтага руху. Еўропа тут разумелася як асяродак навуковага прагрэсу і свету ідэй. Аднак аўтар артыкула зрабіў адну агаворку: „Нашаму нацыянальнаму развіцьцю няма іншае задачы, як зблiжэньне з Эўропаю, пераняцьце і ўсабечаньне ад яе, як спосабаў навукі, так і пануючых ідэяў у эўрапейскім грамадзяньстве, выкліканых яго рухам. Гэта не пустая імітацыя"[83]. Трэба ўспомніць, што імітацыяй магло быць тое, што на старонках хрысціянска-дэмакратычных выданняў высмейвалі аўтары карэспандэнцый як неадпаведныя паводзіны аднавяскоўцаў, якія выбіралі польскую ідэнтычнасць, паводзілі сябе неадпаведна сваёй „сапраўднай" сялянскай прыналежнасці як „шляхцічы" ці „палякі". Гэта было вядома як „малпаванне паноў"[84]. У аўтара гучала ў тэксце патрэба прыстасаваць атрыманы вопыт да мясцовых умоў. Ён не разважае далей як гэта зрабіць, што павінна быць перанята і як прыстасавана, але важна само сцвярджэнне дыстанцыі ў развіцці і агульны рэцэпт.

Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі таксама лічыў, што беларусам трэба вызначыцца ў вектары развіцця. Гадлеўскі глядзеў на сітуацыю беларусаў праз прызму менавіта міжнароднага кантэксту, супастаўляючы з еўрапейскімі і нееўрапейскімі афрыканскімі і азіяцкімі краінамі. Ён вылучаў працэсы нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення. Першы павінен быў адбывацца ў маштабах усяго народа. Толькі на другім этапе павінна адбывацца класавае ці сацыяльнае вызваленне. Гадлеўскі своеасабліва „арыенталізаваў" беларусаў, памяшчаючы іх яшчэ на этапе „усходняй", ці нацыянальнай рэвалюцыі. У Еўропе ж, на „За-

[82] Sumny, *Zadańni našaj moładzi*.

[83] Алекса-Полацак, *Нацыянальная сьведамасьць*, „Студэнцкая Думка", 1925, № 1, с. 5.

[84] R. E. Park and E. W. Burgess, *Introduction to the Science of Sociology*, Chicago — London [1921] 1972, p. 423-424; Teliechanawiec, *Jak kurnosy paliašuk panam staŭ*, „Biełaruskaja Krynica", 1926, nr 31, s. 3-4; Zbiantežany, *„Zachwareła na paniu"*, „Biełaruskaja Krynica", 1927, nr 44, s. 5; W. Pawluczuk, *Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu społeczności tradycyjnej*, s. 144.

хадзе", нацыянальныя рэвалюцыі ўжо адбыліся. Тут ён толькі харватаў разглядаў у якасці яшчэ „ўсходняга" народа. Дарэчы, у гэтым артыкуле Гадлеўскі сярод іншага агучыў думку аб тым, што эвалюцыя неабавязкова мае пазітыўнае значэнне і можа не прымаць кірунак і характар прымальны для беларусаў[85].

Часамі называліся нават тэрміны, якія наўпрост ці ўскосна вызначалі дыстанцыю ў развіцці, якую трэба было пераадолець беларусам. Такой дыстанцыяй у часе было 50 год. Гэты тэрмін быў падхоплены як негатыўная ў адносінах да беларусаў тэза пра наканаванасць іх знікненне праз 50 год[86]. Але калі беларускі досвед параўноўваўся з чэшскім з розніцай у 50 год, то кантэкст цалкам змяняўся. Тое ж можна было сказаць і пра выпадак фінаў і іх мовы, якая ў XIX ст. у параўнанні ў пачаткам 1920-х гг. лічылася не маючай перспектыў і будучыні (ці так прынамсі ўяўлялі сабе аўтары заходнебеларускіх выданняў). Такі тэрмін меў дваякае значэнне: ён вызначаў часавую „глыбіню" адсталасці і час патрэбны на яе пераадоленне. Гарызонт часу ў асобных выпадках мог і не быць такі працяглы. Называўся таксама тэрмін у 30-40 гадоў, як было ў сітуацыі параўнання са славакамі[87].

Яшчэ адну акалічнасць нельга не ўлічваць пры разглядзе праблематыкі эвалюцыі як дылемы для БХД і яе перыядычных выданняў. Хрысціянска-дэмакратычныя выданні пераважна не ставілі задачу бачыць беларусаў у будучыні прамысловымі працоўнымі ці занятымі ў сферы паслуг ці толькі ў вольных прафесіях. Такое магло ўяўляцца нават як пагроза[88]. Хаця, канечне, гаворка ішла не толькі пра сялянства і паляпшэнне культуры земляробства, што, зрэшты, падкрэслі-

85 S. K-i, *Na Uschodzie my ci na Zachadzie?*, „Biełaruskaja Krynica", 1925, nr 7, s. 1-3. Параўн. таксама: *Спосабы асыміляцыі*, „Беларускі Фронт", 1937, № 8, с. 4.

86 Žuk, *Kudy iści i za kim?*, „Narodny Zwon", 1926, nr 1, s. 3-4; *Крыху спозьненае прызнаньне*, „Грамадзкі Голас", 1924, № 17, с. 1; Al. S., *Ślady niawolnictwa*; М. Танк, *Лісткі календара*, [у:] той жа, *Збор твораў у чытырох тамах*, т. 4: *Вершы, дзённікі, пераклады*, Мінск 1967, с. 364-365. З'яўленне гэтага тэрміну хутчэй за ўсё звязана з фразай, якую сучаснікі, а ў тым ліку дэпутат Сейма Васіль Рагуля, прыпісвалі прэм'ер-міністру Польшчы Леапольду Скульскаму. Падчас выступлення на Заканадаўчым Сейме ён сказаў, што на працягу „50 год ніякіх беларусаў у Польшчы не будзе". Гл.: С. М. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў*, с. 148. Аднак пазней гэты тэрмін стаў жыць уласным жыццём у публічным дыскурсе і беларускіх выданнях.

87 S. Ł., *Ksiondz Andrej Hlinka*, „Biełaruskaja Krynica", 1929, nr 23, s. 1.

88 *Як і нашто хацелі-б паны ўпрамысловіць „Крэсы"?*, „Samapomač", 1938, nr 7, s. 77.

валі праграмы БХД розных гадоў, гаворачы пра „працоўныя масы”, „сялянства, работнікаў і інтэлігенцыю”[89]. Але пераважна сялянскімі ўяляліся нават тыя краіны ці народы, якіх хрысціянска-дэмакратычныя выданні прыпадабнялі да беларусаў[90]. Можна аднесці гэта таксама да пэўнага ўпадабання беларускімі хрысціянска-дэмакратычнымі інтэлектуаламі „пераваг адсталасці”[91].

Заканчэнне

Выбар беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі эвалюцыйнай парадыгмы як стратэгіі развіцця беларускага грамадства не быў самавідавочным. Складанасці і супярэчнасці гэтага выбару вынікалі не толькі з таго, што сама па сабе такая парадыгма ўзнікла і развівалася ў заходнееўрапейскіх і паўночнаамерыканскіх краінах, дзе сярэднія класы альбо дамінавалі, альбо аказвалі істотны ўплыў на эканоміку, культуру і палітыку і дрэнна сумяшчалася з тымі прынцыпамі, паводле якіх жылі сялянскія грамадствы Усходне-Цэнтральнай Еўропы. Яны вынікалі якраз з патрэбы прыстасаваць гэтую парадыгму да беларускіх умоў з аднаго боку, а з іншага – з асаблівасцей рэцэпцыі эвалюцыйных ідэй асяроддзем, у якім нарадзіўся беларускі хрысціянска-дэмакратычны рух. Гэта вызначыла тое, як эвалюцыя абмяркоўвалася на старонках выданняў БХД у міжваенны перыяд. Даследаванне ж гэтай праблематыкі патрабуе міждысцыплінарнага падыходу, які дазваляе больш усебакова абмеркаваць пытанні, якія звязаны з палітычнымі ідэалогіямі і сацыякультурнымі асаблівасцямі грамадстваў, дзе такія ідэалогіі ўзнікаюць ці распаўсюджваюцца.

Summary

The question of the Belarusian Christian Democracy choosing the evolutionary paradigm of social change in the interwar period

The article discusses the problem of choosing a paradigm for social change by the Belarusian Christian Democracy in the interwar period. Belarusian Christian democrats, who actually represented the interests of the Belarusian population in interwar Poland, openly rejected radical social revolution; however, some aspects of evolution also evoked ambiguous reactions on their part. The article also touches upon different dilemmas faced by Belarusian intellectuals and Christian democratic politicians. For instance, although Belarusian Christian democrats did not see any problem in evolutionary social transformation

[89] А. Вашкевіч, *Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграм*, „Спадчына”, 2006, № 1, с. 29, 31.

[90] *Андора — сялянская дзяржава*, „Biełaruskaja Krynica”, 1936, nr 42, s. 4.

[91] B. Jr. Moore, *The Social Origins of Dictatorship and Democracy. Lord and Peasant in the Making of the Modern World*, Harmondsworth [1966] 1991, p. 414.

as far as Belarusians were concerned, they implicitly rejected Darwinian ideas. They also supported the evolutionary view on history and past events. In contrast, communists and left-wing radicals rejected social evolution and unequivocally supported Darwinian ideas. The article aims to prove that in order to better understand intellectual problems and political dilemmas faced by societies undergoing social change one should adopt an interdisciplinary approach. It is not sufficient to rely on political history and the history of political thought: one should turn to the achievements of cultural anthropology, intellectual history and studies of global discourses in order to gain a more comprehensive understanding of such problems and their contexts.
Keywords: Belarusian Christian Democracy, party program, Polish governments

Streszczenie

Kwestia wyboru ewolucyjnego paradygmatu zmian społecznych przez Białoruską Chrześcijańską Demokrację w okresie międzywojennym

Artykuł traktuje o problemie wyboru paradygmatu zmian społecznych przez Białoruską Chrześcijańską Demokrację w okresie międzywojennym. Chadecja białoruska, która faktycznie reprezentowała interesy ludności białoruskiej w Polsce międzywojennej, otwarcie odrzucała radykalną rewolucję społeczną, ale niektóre aspekty ewolucji też budziły niejednoznaczną reakcję z jej strony. Artykuł porusza również poszczególne dylematy, z którymi zetknęli się białoruscy intelektualiści i politycy chadeccy. Na przykład, chociaż chadecy białoruscy nie widzieli żadnego problemu w ewolucyjnej transformacji społecznej w odniesieniu do Białorusinów, to domyślnie odrzucali idee darwinowskie. Popierali też ewolucyjne spojrzenie na historię i wydarzenia przeszłości. Natomiast komuniści i radykalna lewica odrzucali społeczną ewolucję i jednoznacznie popierali idee darwinowskie. Artykuł dowodzi, że do lepszego zrozumienia problemów intelektualnych i politycznych dylematów, z którymi spotykają się społeczeństwa w fazie zmian społecznych, trzeba wykorzystać podejście interdyscyplinarne. Historii politycznej i historii myśli politycznej nie wystarczy do badania takiej problematyki i trzeba sięgnąć po dorobek antropologii kulturowej, historii intelektualnej i badań dyskursów globalnych, żeby bardziej wszechstronnie zrozumieć takie problemy i ich konteksty.
Słowa kluczowe: Białoruska Chrześcijańska Demokracja, program partyjny, polskie rządy

Alaksandr Pahareły – absolwent Państwowego Uniwersytetu Białoruskiego, doktorant w Instytucie Slawistyki Polskiej Akademii Nauk. Zainteresowania badawcze: wymiar społeczno-kulturowy modernizacji i procesów narodotwórczych na Białorusi i w Europie Środkowo-Wschodniej w końcu XIX — pierwszej połowie XX w.

Мостыка Андрей
(Минск)

Студенты-белорусы Университета Стефана Батория в Вильно в свете статистических и персональных данных: состав, социальное происхождение, национальная идентичность

Открытие Университета Стефана Батория (УСБ) в Вильно в октябре 1919 г. происходило в ситуации политической неопределённости, на фоне военного противосияния Польши и большевистской России за восточные границы[1]. Несмотря на это Виленскому университету удалось стать даже в это непростое время местом притяжения студенческой молодежи из разных уголков «восточных кресов». В числе первых студентов вновь открывшегося университета были также и белорусы, так, одним из первых зачисленных в университет уже 22 октября 1919 г. стал Бронислав Туронок[2], чей студенческий билет был № 6, а зачётка носила № 00012[3]. Этот момент можно считать началом двадцатилетней истории белорусского студенческого сообщества в УСБ. И уже в скором времени, а именно в 1921 г., в стенах университета собралось достаточное количество белорусской студенческой

[1] Статус самого Вильно не был ещё определён и вопрос в чьих руках город останется, был далеко не ясен; летом 1920 г. город заняли советские войска; в связи с военными перипетиями новый 1920/21 учебный год начался лишь в январе 1921 г. Теперь только в 1922/23 учебном году, когда закончились боевые действия университет смог начать полноценную работу.

[2] Бронислав Туронок — один из «отцов-основателей» Белорусского студенческого союза. Кроме деятельности в управе БСС, Б. Туронок был ответственным редакторам студенческого печатного органа — месячника «Наш шлях». Еще во время университетского обучения и членства в БСС он активно включается в общественно-политическую деятельность. С ноября 1923 г. секретарь Белорусского товарищества помощи потерпевшим от войны. В 1923-1925 гг. редактор газеты «Криница». Один с создателей и деятелей Белорусского института хозяйства и культуры (БГІК). Являлся одним из активных деятелей белорусского движения 20-х гг., принадлежал к сторонникам Христианской демократии и Белорусского крестьянского союза. В начале 30-х отошел от активной общественной деятельности, однако оказывал денежную поддержку белорусскому движению, в том числе студенческому союзу. Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 81-110.

[3] Центральный государственный архив Литвы (далее: ЦГАЛ), ф. 175, оп. 3 (IXD), ед. хр. 10 (120).

молодёжи для того, чтобы организовать свое национальное объединение — Белорусский студенческий союз (БСС). Именно эта организация сплачивала вокруг себя белорусские студенческие силы на протяжении всего межвоенного периода.

Роль университета для развития социально-культурной жизни в межвоенном Вильно была огромной. Само существование высшей школы придавало столичное значение городу. В то же время примечательным является и значение университета для белорусского национального движения и развития самого белорусского сообщества в Западной Беларуси в целом в этот период. Ведь одной из наиболее желанных целей белорусского движения было создание национальной высшей школы, центра национального просвещения и образования. Однако крах попытки создания белорусской государственности в 1918 г. превратил ее в несбыточную мечту. А Виленский университет, несмотря на свой польский характер, создавал возможности получения образования и приобщения к научной деятельности для белорусской молодежи. В известной степени университет удовлетворял острую нужду белорусского движения в образованных деятелях.

Демократичный характер организации высшего образования (университеты в межвоенной Польше обладали правом академической автономии) позволял развивать в рамках университета активности студенческой молодёжи в культурном, национальном и даже общественном плане. Так, представители Белорусского студенческого союза — самой массовой и долговременной организации — не только уже с момента создания союза активно включаются в деятельность различных белорусских культурных организаций, но и на протяжении всего межвоенного периода без их участия не проходит ни одно серьезное общественно-политическое событие[4]. Выпускниками УСБ были такие известные белорусские деятели как Витовт Тумаш, Николай Шкелёнок, Николай Щорс, Станислав Станкевич, Борис Кит, Язеп Малетский, Вячеслав Найдюк, Ян Шутович, Адам Дасюкевич и многие др.

Уникальностью ситуации именно белорусских студентов в отличие от остальных представителей нацменьшинств в УСБ являлось то, что они были плотно связанны с белорусским национальным движением, центром которого являлось на тот момент Вильно. Поэтому

[4] Подробнее см: А. Мастыка, *Беларускі студэнцкі саюз ва ўніверсітэце Стэфана Баторыя ў Вільне (1921-1939)*, «Biuletyn Historii Pogranicza», Białystok 2009, nr 10, s. 5-21.

с открытием университета в городе белорусское студенчество превратилось в особую достаточно представительную группу внутри белорусского сообщества. Причем студенчество представляло срез той части национально ориентированной белорусской общественности, которая наиболее активно и динамично была приобщена к социальным и политическим процессам. Изучение этой общественности, по нашему мнению, способно дать интересные результаты, которые можно экстраполировать на социальную ситуацию в Западной Беларуси в целом.

Поэтому исследование такой социальной группы, как студенчество, может дополнить наше представление о состоянии тогдашнего белорусского общества, имеющихся проблемах и вызовах, которые стояли перед ним. Также это позволит нам узнать больше про социально-культурный контекст, в котором формировалась на тот момент наиболее образованная часть белорусской элиты. Особенно же важным, как нам кажется, является исследование идентичности белорусского студенчества и тех факторов, которые влияли на самосознание студентов. В первую очередь, это изучение национальной идентичности и особенностей ее формулирования и сохранения в условиях конкуренции разных национальных проектов, а также существовавшего притеснения и угнетения идентичностей меньшинств со стороны доминирующей национальной группы.

Для того чтобы определить количественный состав данной студенческой группы мы обратимся к статистическим материалам и архивным данным УСБ. На основе полученных из университетской статистики данных о национальной структуре студенческого состава университета нами была построена таблица № 1.

Таб. 1. Состав УСБ согласно национальности[5]

Учебный год	Общее кол-во	Национальность						
		поляки	евреи	литовцы	белорусы	немцы	русские	украинцы
1919/1920	547	472	53	6	5	2	6	-
1920/1921	788	647	103	4	19	3	7	-
1921/1922	1735	1349	297	7	49	7	17	-
1922/1923	2202	1777	317	16	48	4	24	-
1923/1924	2209	1778	350	12	36	3	21	1
1924/1925	2238	1802	356	14	30	3	27	1
1925/1926	2506	1995	417	15	26	3	47	-
1926/1927	2806	2121	556	22	21	2	69	9

		Родной язык						
		поль-ский	еврей-ский	литов-ский	бело-рус-ский	немец-кий	рус-ский	укра-инский
1927/1928	3046	2143	728	32	35	3	81	16
1928/1929	3177	2106	864	42	57	4	60	23
1929/1930	3416	2232	899	50	61	9	116	41
1930/1931	3618	2286	989	70	56	7	156	49
1931/1932	3881	2337	1118	97	85	7	172	54
1932/1933	3923	2283	1184	97	79	8	209	56
1933/1934	3872	2307	1067	101	94	13	238	52
1934/1935	3562	2297	789	110	79	11	152	41
1935/1936	3365	2176	608	105	92	71	170	39
1936/1937	3415	2295	636	105	99	12	224	36
1937/1938	3110	2258	417	85	94	13	212	28

